WWW.ZVIAZDA.BY — *на 12 гадзін раней*

Родная газета на роднай мове

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

5 лютага 2011 г.
СУБОТА
№ 23 (26887)

Кошт 650 рублёў

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА РАЗГЛЕДЗЕЎ КАДРАВЫЯ ПЫТАННІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 4 лютага разгледзеў кадравыя пытанні. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы назначыў:

КАЦЯРЫНІЧА Дзмітрыя Сцяпанавіча — міністрам прамысловасці;

КРУПЦА Леаніда Фёдаравіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Федэратыўнай Рэспубліцы Бразілія;

ЕЎДАЧЭНКУ Андрэя Аляксандравіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Каралеўстве Бельгія, Пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры Еўрапейскім саюзе і Еўрапейскім супольніцтве па атамнай энергіі, Пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры Арганізацыі Паўночнаатлантычнага дагавора па сумяшчальніцтве;

САДОХУ Валерыя Яўгенавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Сацыялістычнай Рэспубліцы В'етнам;

БАРСУКОВА Аляксандра Пятровіча — начальнікам Дэпартамента выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў;

КАЛЕЧЫЦА Сяргея Валер'евіча — членам Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь;

ЕРМАЛОВІЧА Алега Вячаслававіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Іарданскім Хашымiцкім Каралеўстве і Ліванскай Рэспубліцы па сумяшчальніцтве;

РЫБАКА Віктара Васільевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Ісламскай Рэспубліцы Пакістан па сумяшчальніцтве;

ШАСТАКОВА Яўгена Андрэевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Мальта па сумяшчальніцтве.

Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:

ЖЫЛІНА Ігара Фёдаравіча — старшынёй Беларускага дзяржаўнага канцэрна па нафце і хіміі;

ГУР'ЯНАВА Аляксандра Яўгенавіча — намеснікам міністра замежных спраў;

АВЯР'ЯНАВА Аляксандра Казіміравіча — дырэктарам Дэпартамента знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства замежных спраў;

ХУДЫКА Андрэя Паўлавіча — намеснікам старшыні Гродзенскага аблвыканкама;

АСТРОЎСКАГА Аляксандра Мікалаевіча — старшынёй Лідскага райвыканкама;

РОЗУМА Мікалая Аркадзьевіча — старшынёй Воранаўскага райвыканкама;

КРАХМАЛЬЧЫКА Івана Іосіфавіча — старшынёй Дзятлаўскага райвыканкама;

МАРКЕВІЧА Анатоля Мечыслававіча — старшынёй Навагрудскага райвыканкама;

ЗАМЖЫЦКАГА Аляксандра Вячаслававіча — першым намеснікам старшыні Мінскага аблвыканкама;

ПАЗНЯКА Аляксандра Рыгоравіча — старшынёй Полацкага гарвыканкама;

КАЗАКЕВІЧА Васіля Міхайлавіча — намеснікам міністра сельскай гаспадаркі і харчавання;

КУДАСАВА Антона Эдмундавіча — намеснікам міністра эканомікі;

СІЛЬВАНОВІЧА Алега Ігаравіча — дырэктарам Дэпартамента па кінематаграфіі Міністэрства культуры;

МАРЦІНОВІЧА Віктара Піліпавіча — намеснікам дырэктара Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю;

СІНЯКА Ягора Сцяпанавіча — намеснікам дырэктара Дэпартамента — начальнікам папярэдняга расследавання Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю;

БАРЫСЁНКА Сяргея Уладзіміравіча — генеральным дырэктарам дзяржаўнага знешнегандлёвага ўнітарнага прадпрыемства «Белспецзнештэхніка»;

САРАКАВОГА Руслана Анатольевіча — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Гомельскае ВА «Крышталь»;

ШАРАКА Аляксандра Віктаравіча — генеральным дырэктарам вытворча-гандлёвага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белмедтэхніка»;

АНКУДУ Сяргея Мікалаевіча — рэктарам установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны вышэйшы радыётэхнічны каледж»;

ГАЛЬПЯРОВІЧА Максіма Навумавіча — галоўным рэдактарам часопіса «Беларускі гістарычны часопіс» рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне»;

ЛУЗГІНА Мікалая Уладзіміравіча — першым намеснікам старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь;

МІХНЕВІЧА Валянціна Уладзіміравіча — членам Гродзенскага аблвыканкама;

ЗАЙЧАНКУ Мікалая Пятровіча — намеснікам генеральнага сакратара Еўразійскага эканамічнага супольніцтва;

САВЯНКА Міхаіла Іванавіча — намеснікам начальніка дэпартамента фінансаў і бюджэтнай палітыкі Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы;

БАМБІЗУ Івана Міхайлавіча — намеснікам дзяржаўнага сакратара — членам Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы;

ДЗЯЙКО Ганну Канстанцінаўну — намеснікам дзяржаўнага сакратара — членам Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы.

СТАР. 2

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

БАГАЦЦЕ БАБЫ РАІ

Раіса Міхайлаўна БЕЛАЯ з унукамі 26-гадовым Аляксеем, 5-гадовым Мікітам і 11-гадовай Вікторыяй, *в. Наваселле, Бярэзінскага раёна.*

АДЛІГА ПЛЮС ШТАРМАВОЕ ПАПЯРЭДЖАННЕ ПА МОЦНЫМ ВЕТРЫ

НАДВОР'Е ў выхадныя на тэрыторыі Беларусі будзе вызначацца атмасфернымі франтамі з боку Заходняй Еўропы, якія прынясуць цёплае і вільготнае паветра з Атлантыкі, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.

У суботу і нядзелю сіноптыкі аб'яўляюць штармавое папярэджанне па ветры. Чакаецца, што 5 лютага на працягу сутак і ўначы 6 лютага паўсюдна, а ўдзень у нядзелю па ўсходзе будзе моцны парывісты вецер 15—20 м/с, па паўднёвым захадзе — ажно да 23 м/с.

На выхадныя часам будуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Істотна пацяплее. Удзень у суботу 0—плюс 6, у нядзелю на працягу сутак ад 2 марозу да 4 цяпла. Адліга захаваецца і ў першыя дні наступнага тыдня. У панядзелак уначы ад мінус 4 да плюс 2, удзень — ад мінус 1 на поўначы да 6 цяпла на паўднёвым захадзе.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, бліжэй да сярэдзіны наступнага тыдня ў Беларусь зноў вернецца зіма. Ужо ў сераду на працягу сутак 0—7 марозу, а ў чацвер на працягу сутак мінус 6—13 градусаў, у паўночных раёнах пры праясненнях да 15 марозу. Месцамі невялікі снег.

Сяргей КУРКАЧ.

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

СООБЩАЕТ, ЧТО В СООТВЕТСТВИИ С РЕШЕНИЕМ НАБЛЮДАТЕЛЬНОГО СОВЕТА БАНКА СОЗЫВАЕТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ

Дата проведения Общего собрания акционеров: 14 февраля 2011 года.

Адрес проведения Общего собрания акционеров: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

Повестка дня

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

2. Об утверждении изменений и дополнений в Устав ОАО «Белагропромбанк».

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 3 февраля 2011 года.

Акционеры банка могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк»: г. Минск, проспект Жукова, 3.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров.

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 10 февраля 2011 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 23 февраля 2011 года.

Телефон для справок: 8(017) 229 64 54.

Телефон Контакт-Центра Банка – 136
8.00–20.00 – рабочие дни, 8.00–18.00 – выходные и праздничные дни. Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ ОАО «Центроэнергомонтаж»

Фамилия, имя, отчество покупателя (полное наименование для юридического лица)	**Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж»**
Место жительства (местонахождение для юридического лица)	**220033, г. Минск, Велосипедный переулок, 7**
Наименование и местонахождение эмитента	**Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж», 220033, г. Минск, Велосипедный переулок, 7**
Цель приобретения акций	**С целью последующего пропорционального распределения среди акционеров**
Количество приобретаемых простых (обыкновенных) акций (штук)	**20 000**
Цена приобретения (белорусские рубли)	**26 000**
Сроки, форма и порядок расчета	**Оплата производится в течение 30 банковских дней со дня заключения договора купли-продажи. Оплата производится денежными средствами в наличной (безналичной) форме, определенной договорами купли-продажи акций**
Адрес, по которому будут представляться предложения акционеров и заключаться договоры купли-продажи акций	**220033, г. Минск, Велосипедный переулок, 7**
Даты начала и окончания представления предложений акционеров на продажу акций	**с 3 февраля 2011 года по 18 марта 2011 года с пометкой «Совет директоров. Предложение о покупке акций».**
Даты начала и окончания покупки акций	**с 22 марта 2011 года по 31 марта 2011 года**

УНП 100092167

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.02.2011 г. (для б/н разлікаў)				*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*	
▲1 долар ЗША	3 011,00	1 чэшская крона	171,42	USD	29,4136
▼1 еўра	4 106,10	1 польскі злоты	1051,35	10 UAH	36,9820
1 латвійскі лат	5 853,42	▼1 расійскі рубель	102,37	1000 BYR	9,7817
1 літоўскі літ	1 189,20	1 украінская грыўня	378,43	EUR	40,0819

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА РАЗГЛЕДЗЕЎ КАДРАВЫЯ ПЫТАННІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Звяртаючыся да кіраўнікоў мясцовых выканаўчых органаў, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што яны павінны быць ініцыятыўнымі людзьмі, цвёрда адстойваць інтарэсы свайго раёна і насельніцтва.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў аб размове, якая адбылася напярэдадні і датычылася работы замежнага інвестара ў рэгіёнах. На думку Прэзідэнта, старшыні двух райвыканкамаў, дзе размешчаны прадпрыемствы інвестара, павінны былі больш актыўна адстойваць пазіцыю дзяржавы ў супрацоўніцтве з інвестарам і не самаўхіляцца ад гэтых пытанняў.

«Вы там, у гэтым раёне, не маўклівыя выканаўцы. Вы абавязаны абараняць свой участак работы, сваіх людзей, свой раён. Вы павінны дзейнічаць так, як гэта лепш для раёна і для краіны, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Без вас не павінна прымацца рашэнне. І калі людзі дзесьці абураныя, людзі перажываюць, скардзяцца Прэзідэнту, значыць, вы там павінны дняваць і начаваць, пакуль не вырашыцца пытанне, і ніхто не мае права памяняць ваш пункт гледжання. Так, губернатар можа аддаць вам каманду, прэм'ер-міністр — выконвайце, але давядзіце да Прэзідэнта сваю пазіцыю». Кіраўнік дзяржавы таксама дадаў, што створаная сістэма ўлады дазваляе на працягу сутак праінфармаваць Прэзідэнта па любой праблеме.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Але вы павінны даводзіць сваю пазіцыю, абараняючы свой раён, сваіх людзей, куды вы накіраваны працаваць. Вы там — мае прадстаўнікі, вы — людзі, якія твар у твар сутыкаюцца з насельніцтвам. Не зрабілі — не гаварыце, што вы губернатару гаварылі і што вы выконвалі яго даручэнні, ацэнка будзе дадзена адпаведная».

«Вы павінны дакладна займаць сваю пазіцыю, вы на дзяржаўнай службе. Так, вы выконваеце, але павінны мець свой пункт гледжання. Вы можаце яго мяняць, калі вас пераканалі, — гэта ваша права, калі не, змагайцеся за свой пункт гледжання», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў новай пяцігодцы наперадзе напружаная работа. «Вы едзеце на перадавую. Выбары закончыліся, але гэта не значыць, што сёння можна спачываць на лаўрах. Сёння трэба працаваць яшчэ больш, чым учора», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

У той жа час ён адзначыў, што ў гэты перыяд асаблівае значэнне набывае работа кіраўнікоў усіх рангаў. «Вы, пэўна, заўважылі, што я пастаянна ў гэтым годзе, у пачатку пяцігодкі пачынаю «падціскаць» кадры, мякка кажучы. Гэты ціск будзе працягвацца і надалей, у добрым сэнсе слова. Нам патрэбен вынік», — адзначыў Прэзідэнт.

У гэтай сувязі Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на сітуацыю ў сельскай гаспадарцы і падкрэсліў, што яе неабходна кардынальна палепшыць.

«Наперадзе ў нас адказны перыяд. Нам трэба ў гэтым годзе ў рэшце рэшт рэальна, бачна пераламаць сітуацыю ў сельскай гаспадарцы. Трэба кардынальна палепшыць сітуацыю і з зямлёй, і з калектывамі, і аб'ёмамі вытворчасці, але самае галоўнае — рэнтабельнасць. Трэба прадаваць як мага даражэй вонкі, абараняючы сваё насельніцтва, у тым ліку не дапускаючы разбою ў цэнавым фактары», — заявіў Прэзідэнт. Ён таксама дадаў, што ў раёнах жывуць небагатыя людзі, якіх трэба ўсяляк падтрымліваць.

Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў старшыняў райвыканкамаў аб недапушчэнні любых праяў карупцыі.

«Зрабіце ўсё, каб людзі сказалі, што Прэзідэнт накіраваў у раён вартых. Вы — «твар» Прэзідэнта, таму я так сур'ёзна падыходжу да гэтых пасад і асабліва не дарую, і тым больш дараваць не збіраюся карупцыйных праяў, змоў, падачак, хабараў і гэтак далей. Вось гэта выключыце цалкам. Даравання не будзе!» — адзначыў Прэзідэнт.

Звяртаючыся да прызначаных кіраўнікоў беларускіх дыпламатычных прадстаўніцтваў за мяжой, Прэзідэнт звярнуў увагу на неабходнасць нарошчвання экспарту беларускіх тавараў.

«Знешні гандаль слабы, практычная дзейнасць — вось што мяне вельмі насцярожвае», — сказаў Прэзідэнт, падкрэсліўшы, што мае на ўвазе не ў цэлым знешнеэканамічную дзейнасць, а менавіта гандаль.

«Палітыка і дыпламатыя — усё павінна быць накіравана на забеспячэнне гэтага кірунку», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

У гэтай сувязі Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на прызначэнне Паслом Беларусі ў Бразіліі Леаніда Крупца. На думку кіраўніка дзяржавы, ён менавіта той чалавек, які зоймецца канкрэтнай работай. Прэзідэнт падкрэсліў неабходнасць павелічэння паставак тэхнікі на вялізны бразільскі рынак, а ў далейшым шырокага выхаду і на рынкі іншых дзяржаў рэгіёна, у прыватнасці Чылі, Аргенціны.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра іншы, ужо вядомы беларусам рынак Лацінскай Амерыкі — Венесуэлу, і парэкамендаваў Леаніду Крупцу працаваць у поўным узаемадзеянні з Паслом Беларусі ў Венесуэле. «Венесуэла — гэта наш плацдарм», — адзначыў Прэзідэнт.

«Тут павінны быць вялікія, бачныя, адчувальныя перамены. І часу няма», — падкрэсліў Прэзідэнт.

У сваю чаргу міністр замежных спраў Сяргей Мартынаў адзначыў, што частка прызначэнняў звязана з новымі і важнымі для Беларусі рынкамі і кірункамі работы па так званай далёкай дузе — гэта перш за ўсё Бразілія з каласальным рынкам і В'етнам.

Што датычыцца новага намесніка міністра замежных спраў, то Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта павінен быць прадпрымальны і ініцыятыўны кіраўнік. «Намеснік — гэта чалавек, які будзе «бегчы наперадзе» міністра. Я шчыра скажу, мяне не задавальняе той стан спраў, які склаўся ў Міністэрстве замежных спраў на першай лініі, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Я неяк не бачу ўпартай і настойлівай работы намесніка міністра. Прыйшоў час даваць вынік».

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся ў Сяргея Мартынава, ці такі чалавек прызначаецца на гэтую пасаду, на што міністр пацвердзіў поўную перакананасць у правільнасці прызначэння. Паводле яго слоў, Аляксандр Гур'янаў добра праявіў сябе на папярэднім месцы працы менавіта з такой пазіцыі.

Прызначаючы новага міністра прамысловасці, кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Мяне падкупляе больш за ўсё тое, што вы прайшлі ўсе прыступкі працы на вытворчасці. Чалавек, які пачынаў майстрам у цэху, добра ведае, чым дыхае рабочы».

Прэзідэнт таксама падкрэсліў, што сёння як ніколі патрэбныя новыя людзі знізу, якія добра ведаюць вытворчасць, «тыя, хто сваімі рукамі памацаў, хто менш балбоча на рыначныя тэмы, а больш робіць».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу новага міністра на шэраг прынцыповых патрабаванняў: гатоўнасць кіраўніка ключавога міністэрства краіны аргументавана адстойваць свой пункт гледжання, жорсткая дысцыпліна на вытворчасці, высокая якасць прадукцыі беларускай прамысловасці.

Узгадняючы прызначэнне новага старшыні канцэрна «Белнафтахім», кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу Ігара Жыліна на неабходнасць рэфармавання работы гэтай найважнейшай галіны, яе «асучаснівання» з пункту гледжання метадаў і формаў кіравання.

Прэзідэнт таксама зрабіў асаблівы акцэнт на патрабаванні да новага кіраўніка прынцыпова адстойваць сваю пазіцыю па пытаннях дзейнасці канцэрна.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ТРЫ ДЗЯСЯТКІ МАРШРУТАЎ БУДУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ ІНАКШ

На перыяд правядзення рэканструкцыі сталічнай вуліцы Ціміразева з закрыццём руху ўсіх відаў транспарту па гэтай вуліцы на ўчастках ад Радужнай да Арлоўскай і ад Арлоўскай да вуліцы Сапёраў змяняюцца амаль тры дзясяткі маршрутаў пасажырскага транспарту.

Паводле інфармацыі дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», напрыклад, тралейбусны маршрут №21 і аўтобусны №60 зачыняюцца. Рух тралейбусных маршрутаў №№14, 58 арганізуецца па праспекце Пушкіна, вуліцы Арлоўскай, праспекце Пераможцаў, вуліцах Сапёраў і Ціміразева ў абодвух напрамках. Рух аўтобусных маршрутаў №№219, 219А, 225, 227, 414, 419, 419Д, 420, 432 арганізуецца па праспекце Пушкіна, вуліцы Арлоўскай, праспекце Пераможцаў, вуліцах Нарачанскай і Ціміразева ў абодвух накірунках з выкананнем прыпыначных пунктаў «2-е кальцо» па вуліцы Арлоўскай і «Вул. Радужная» па праспекце Пераможцаў. Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць на сайце транспартнага прадпрыемства (minsktrans.by).

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДЗІЦЯЧЫ ХАКЕЙНЫ ТУРНІР «ЗАЛАТАЯ ШАЙБА» ПРАХОДЗІЦЬ У МІНСКУ

Фота БЕЛТА.

Абзац

◢ Іншаземцы летась набылі 178 тыс. пуцёвак у беларускія санаторыі, паведаміў намеснік дырэктара Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва пры Савеце Міністраў Генадзь Балбатоўскі. Для параўнання: у 2009 годзе паслугамі санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацый скарысталіся 129,9 тыс. гасцей з замежжа. Большасць з іх — грамадзяне дзяржаў СНД, пераважна Расійскай Федэрацыі.

◢ **Піваварныя прадпрыемствы Беларусі ў 2010 годзе вырабілі 39,8 млн дал піва, што на 18,4% больш, чым у 2009 годзе, паведамілі ў канцэрне «Белдзяржхарчпрам».**

◢ Матэрыяльны ўрон, прычынены пажарамі ў Мінску ў 2010 годзе, склаў Br4105,2 млн, што на 44,7 больш, чым у 2009 годзе. Паменшылася колькасць пажараў у жыллёвым фондзе і асабістым аўтатранспарце грамадзян, а ўзрасла ў арганізацыях і на прадпрыемствах горада. З прычыны пажараў загінулі 35 чалавек, атрымалі траўмы 66 чалавек, год таму — адпаведна 40 і 63 чалавекі.

◢ **Беларускія турфірмы спынілі продаж тураў у Егіпет. Аб гэтым паведаміў прэс-сакратар Міністэрства спорту і турызму Віталь Сямашка. Па яго словах, цяпер беларускія турфірмы не прадаюць пуцёўкі ў Егіпет у сувязі з хваляваннямі, якія ахапілі краіну. У той жа час беларусы тэарэтычна могуць скарыстацца паслугамі замежных тураператараў.**

◢ Учора ў Мінску і Барысаве пачаўся продаж білетаў на першы матч 1/16 фіналу Лігі Еўропы паміж БАТЭ і «Пары Сэн-Жермен». На гульню, якая адбудзецца на мінскім стадыёне «Дынама» 17 лютага ў 20.00, балельшчыкі змогуць патрапіць, заплаціўшы ад Br10 тыс. да Br30 тыс. (у залежнасці ад сектара стадыёна). Білеты прадаюцца ў касах дынамаўскай арэны, барысаўскага гарадскога стадыёна і офіса «АБФФ-Падарожжа» (Мінск, пр-т. Пераможцаў, 20/3).

◢ **Колькасць абанентаў byfly ў Беларусі дасягнула 800 тыс. Аб гэтым паведаміў начальнік групы па інфармацыі і камунікацыі РУП «Белтэлекам» Аляксей Фядорынчык. «Стратэгічная задача, якую мы паставілі перад сабой, — да 2015 года давесці абаненцкую базу шырокапалоснага доступу ў інтэрнэт да 2,2 млн», — расказаў ён.**

◢ У Скідалі аўтамабіль «Хундай» сутыкнуўся з «Рэно», які спыніўся напярэдзе для павароту налева. Ад удару «Рэно» адкінула на паласу сустрэчнага руху, дзе машына ўдарылася ў прыпаркаваны «Форд». «Хундай» жа адкінула на паласу сустрэчнага руху, дзе адбылося сутыкненне з «Фальксвагенам» і аўтобусам «ПАЗ». За рулём «Рэно»была 23-гадовая цяжарная дзяўчына. Яна з траўмамі дастаўленая ў бальніцу.

◢ **Эстонскаму скарбашукальніку выплацілі ўзнагароду ў памеры ста тысяч еўра за сярэднявечныя скарбы, якія ён знайшоў на сваім бульбяным полі. Скарб складаўся з 1329 срэбных манет і дзевяці срэбных упрыгажэнняў. Жыхар Эстоніі знайшоў скарб улетку мінулага года на тэрыторыі воласці Раазіку. Знойдзеныя эстонцам манеты былі закапаныя ў зямлю вікінгамі ў пачатку 1060-х гадоў.**

◢ Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры» і праект «Беларускія песняры» ўрэгулявалі рознагалоссі, якія былі паміж калектывамі на працягу апошніх васьмі гадоў. «Беларускія песняры» ў рамках новай дамоўленасці атрымалі магчымасць выступаць на тэрыторыі Расіі без якіх-небудзь юрыдычных наступстваў.

◢ **На працягу апошніх 30 гадоў узровень атлусцення сярод дарослых жыхароў Зямлі вырас амаль у два разы. Усяго, па падліках даследнікаў, ад атлусцення зараз пакутуюць прыкладна 205 мільёнаў мужчын і 300 мільёнаў жанчын на планеце.**

◢ Мона Ліза з карціны славутага Леанарда да Вінчы апынулася юным чаляднікам мастака. Ён звяўся Джан Джакома Капроці. Такім чынам, развеяны чарговы міф аб знакамітым палатне. Адзін з галоўных спецыялістаў, які на працягу многіх гадоў займаецца вывучэннем карціны, і кіраўнік Нацыянальнага італьянскага камітэта па ахове культурнай спадчыны Сільвана Вінчэці сцвярджае, што шэдэўр Леанарда — партрэт не жанчыны, а юнага прыгажуна Джан Джакома Капроці. З 1490 па 1510 год хлопчык працаваў у жывапісца ў майстэрні і за свае незлічоныя выхадкі заслужыў мянушку «Чарцяня». Капроці стаў героем некалькіх эратычных накідаў майстра, з чаго Вінчэці зрабіў выснову, што паміж жывапісцам і чаляднікам магла быць любоўная сувязь.

Поўны абзац

◢ **Урад Руанды выказаў намер кантраляваць нараджальнасць у краіне шляхам прыцягнення мужчын да добраахвотнай стэрылізацыі. На думку экспертаў, зніжэнне тэмпаў росту руандзійскага насельніцтва дапаможа павысіць якасць і стандарты жыцця ў невялікай афрыканскай краіне. Зараз у ёй пражывае каля 10,2 мільёна чалавек, і гэты паказчык хутка павялічваецца. Цяпер планаванне сям'і залежыць ад жанчын, магчымасці якіх абмежаваныя. Мужчыны ж не гатовыя прымяняць прэзерватывы пры кожным палавым кантакце. У сувязі з гэтым стэрылізацыю шляхам вазэктаміі будуць прапаноўваць усім руандзійцам, якія праходзяць абразанне ў рамках праграмы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя па прафілактыцы ВІЧ-інфекцыі. На працягу бліжэйшых трох гадоў плануецца абрэзаць 700 тысяч мужчын. Частка з іх, магчыма, пагодзіцца на вазэктамію.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Пусціла кватарантку...

Жыхарка Баранавіч здала ў найм пакой у сваёй кватэры дзяўчыне з в. Нач Ганцавіцкага раёна. Тая пражыла там паўтара месяца і паспела ўкрасці ў гаспадыні два залатыя вырабы, тры наборы кухонныя, сокавыціскалку, электрадрыль...

На кватарантку завялі крымінальную справу.

Украла дарагі гадзіннік

У 80-гадовага пенсіянера са Століна нехта ўкраў залаты гадзіннік коштам 3 млн рублёў. Здарылася гэта на працягу сутак — з раніцы да раніцы.

Следства высветліла, што ў гэты час дзеда наведала 42-гадовая мясцовая жыхарка, якая і ўкрала той гадзіннік.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Анатоль ЗАГОРСКІ:

«НІЯКАЙ САКРЭТНАЙ ІНФАРМАЦЫІ Ў НАШАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НЯМА»

КОЛЬКІ чалавек з дыягназам «прамянёвая хвароба» жыве ў Беларусі? Наколькі бяспечна набываць прадукты харчавання, вырашчаныя ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях? На гэтыя і іншыя пытанні спецыяльнага карэспандэнта «Звязды» адказвае першы намеснік начальніка Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Анатоль ЗАГОРСКІ.

— Анатоль Васільевіч, наколькі я ведаю, вы непасрэдна прымалі ўдзел у эвакуацыі жыхароў з пацярпелых рэгіёнаў Магілёўшчыны. Ці лёгка была пераканаць людзей у неабходнасці пераезду?

— Прымусова эвакуіраваліся толькі жыхары з 30-кіламетровай зоны. За межамі гэтай зоны дзяржава кіравалася прынцыпам добраахвотнага перасялення. Мы заходзілі ў кожны дом, гаварылі з людзьмі, тлумачылі ім, якой рызыцы яны падвергнуць сваё здароўе, калі застануцца. У большасці сваёй людзі да нас прыслухоўваліся і выязджалі. Але, што ўтойваць, усякае было. Адчай, азлобленасць, слёзы тых, хто разумеў, што з'язджаць трэба, але так шкада было пакідаць нажытае гадамі. Той, хто цвёрда вырашыў застацца, безумоўна, заставаўся. Сёння на тэрыторыі, дзе шчыльнасць радыеактыўнага забруджвання перавышае 15 Кюры\кв.км, пражывае крыху больш як 130 чалавек. Гэтыя людзі не застаюцца без увагі медыцынскіх і гандлёвых арганізацый. У Дзяржпраграме па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС ёсць раздзел, які прадугледжвае пагашэнне выдаткаў гандлёвых арганізацый на дастаўку прадуктаў харчавання ў такія населеныя пункты.

— Ці могуць зараз перасяленцы вярнуцца на сваю радзіму?

— Закон дазваляе гэта толькі ў адным выпадку: калі ёсць заключэнне медустановы аб тым, што прэтэндэнт па стане здароўя можа пражываць на тэрыторыі з высокай шчыльнасцю забруджвання. Акрамя таго, патрэбна станоўчае рашэнне мясцовага выканкама. Але такіх ахвотнікаў практычна няма. Насуперак чуткам аб масавым вяртанні людзей у зону адсялення, колькасць грамадзян, якія там пражываюць, пастаянна скарачаецца. У параўнанні з 2001 годам іх стала ў 6 разоў менш.

— Чула, што раней дзяржава за пражыванне і працу ў зоне радыеактыўнага забруджвання нават даплачвала.

— Не, зараз такога няма. Гэта было ў першыя гады пасля аварыі. У сярэдзіне 90-х сродкі, якія выдзяляліся на даплаты, па рашэнні дзяржавы пайшлі на ўдасканаленне медыцынскай базы і камунальнай гаспадаркі на забруджаных тэрыторыях.

— А што можаце сказаць пра тых людзей, якія па тых ці іншых прычынах нелегальна пранікаюць у зону?

— Нягледзячы на павелічэнне штрафных санкцый, тэрыторыя зон адчуджэння і адсялення застаецца прыцягальнай для парушальнікаў. Яны пранікаюць туды па розных прычынах. Некаму цікава паглядзець на пацярпелыя ад Чарнобыльскай катастрофы рэгіёны, другія прыходзяць туды пабраканьернічаць, трэція збіраюць там каляровы метал. Апошнім часам, каб папярэдзіць падобныя парушэнні, павялічылі колькасць міжведамасных рэйдавых мерапрыемстваў. Толькі за 2010 год сума штрафаў па адміністрацыйных пратаколах склала звыш 200 млн рублёў.

— Аднак інтарэс да зоны па-ранейшаму ёсць, і не толькі ў нашай краіне. Прынамсі, ва Украіне турфірмы ладзяць экскурсіі ў зону адсялення.

— У Беларусі гэтага няма. І я думаю, што гэта правільна. Нельга падвяргаць рызыцы здароўе людзей, якія не заўсёды ўсведамляюць усю небяспеку такога экстрыму.

— Колькі зараз людзей пакутуюць на прамянёвую хваробу? І якія яшчэ захворванні можна аднесці да тых, прычынай якіх стала катастрофа?

— У Беларусі зараз пражывае, па апошніх звестках, чалавек 8 з дыягназам «прамянёвая хвароба». Праўда, большасць з іх звязана з аварыямі на іншых ядзерных аб'ектах, атамных станцыях, падводных лодках. З наступствамі ж чарнобыльскай катастрофы, у першую чаргу, звязана анкалагічнае захворванне шчытападобнай залозы. Гэта прызнала сусветная арганізацыя аховы здароўя. Рост гэтых захворванняў быў зафіксаваны менавіта пасля катастрофы. Але зараз, паводле інфармацыі Міністэрства аховы здароўя, сітуацыя з захваральнасцю пацярпелага насельніцтва знаходзіцца ў межах сярэдніх рэспубліканскіх значэнняў. Што тычыцца іншых захворванняў, то вызначыць, якія з іх звязаны з катастрофай, а якія з іншымі неспрыяльнымі фактарамі, дакладна практычна немагчыма.

— Наколькі сёння моцна забруджаны сельгасугоддзі сёння? І ці ёсць верагоднасць таго, што ў 30-кіламетровай зоне будзе цалкам адноўлена сельгасвытворчасць?

— Зараз да зоны радыеактыўнага забруджвання аднесена больш за 1 млн гектараў сельгасугоддзяў і каля 1,5 млн гектараў лясных угоддзяў. Кожны ўчастак мае сваю ступень забруджанасці. Як вядома, найбольш пацярпелі ад катастрофы Гомельская, Магілёўская і Брэсцкая вобласці. Але і ў іншых абласцях нашай рэспублікі ёсць тэрыторыі са шчыльнасцю радыеактыўнага забруджвання вышэй 1 Кюры/кв. км. За той час, які прайшоў пасля катастрофы, дзякуючы распаду радыенуклідаў, забруджаная тэрыторыя скарацілася з 23 да 17 працэнтаў. Што тычыцца ўтрымання цэзію і стронцыю, якія ў нас вызначаюць радыяцыйнае становішча, то іх утрыманне ў глебе зменшылася недзе на 40 працэнтаў.

Што тычыцца 30-кіламетровай зоны, то нават у аддаленай перспектыве там не плануецца аднаўленне сельгасвытворчасці. У гэтай зоне радыяцыйнае становішча вызначае, акрамя радыенуклідаў цэзію і стронцыю, плутоній. А перыяд паўраспаду плутонію-239 складае 24 тысячы гадоў. Вось і лічыце, калі гэтая тэрыторыя будзе мець дааварыйны ўзровень па ўтрыманні радыенуклідаў чарнобыльскага паходжання.

— Анатоль Васільевіч, якім чынам на «бруднай» зямлі можна вырошчваць «чыстыя» прадукты харчавання?

— Сельскагаспадарчая вытворчасць актыўна і паспяхова вядзецца ў раёнах з забруджваннем тэрыторыі да 15 Кюры\1 кв.км. І ўсё дзякуючы ахоўным мерам, на якія выдзяляецца дастаткова шмат сродкаў з дзяржбюджэту. Яны накіроўваюцца, у асноўным, на закупку мінеральных угнаенняў, вапнаванне глебы.

Асабістым падсобным гаспадаркам дзяржава выдзяляе сродкі на стварэнне культурных кармавых угоддзяў. Гэта робіцца для таго, каб людзі не пасвілі сваю жывёлу на тых дзялянках, дзе гэта рабілі іх бацькі і дзяды. Такія меры прывялі да зніжэння ў 3 разы за апошнія 5 гадоў колькасці населеных пунктаў, у якіх рэгістравалася мінімум адна проба малака ў год з перавышэннем дапушчальных узроўняў. Гэтая работа будзе працягвацца і далей.

— На Камароўскім рынку не раз бачыла пакупнікоў з прыборамі вымярэння ўзроўню радыяцыі. Скажыце, наколькі бяспечна набываць прадукты харчавання, вырашчаныя ў Гомельскай, Магілёўскай абласцях?

— Магу сказаць з поўнай упэўненасцю, што «брудныя» прадукты харчавання на прылаўкі нашых крамаў з грамадскага сектара ніколі не трапяць. Бо ўся прадукцыя, выраблена на забруджанай тэрыторыі, праходзіць надзвычай жорсткі кантроль. Сітуацыю па ўтрыманні радыенуклідаў у прадукцыі, прычым не толькі сельскагаспадарчай, у рэспубліцы адсочваюць каля 900 лабараторый.

Што тычыцца рынкаў, то туды прадукцыя трапляе, у асноўным, з прыватнага сектара. Калі вы сумняваецеся ў тым, што яна адпавядае нарматыўным патрабаванням, то маеце поўнае права праверыць яе ў службе радыяцыйнага кантролю, якая ёсць на кожным рынку. Альбо папрасіць у прадаўца сертыфікат, які сведчыць аб утрыманні радыенуклідаў і іншых шкодных рэчываў. Што тычыцца прыборчыка, з якім людзі прыходзяць на рынак, то ён не дае інфармацыю аб утрыманні радыенуклідаў у прадукцыі, а паказвае фон, які існуе ў цяперашні час. Апошні ж можа залежаць ад многіх фактараў.

— А што тычыцца людзей, якія прадаюць грыбы ды ягады ля дарогі?

— Сумненні могуць быць, калі вы набываеце грыбы ў Магілёўскай альбо Гомельскай вобласці. Але ж ніхто вам не забараняе, перад тым як ужываць набытае, заехаць у лабараторыю па месцы жыхарства і развеяць свае сумненні.

— А ці прымаў Дэпартамент па ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС удзел у выбары пляцоўкі пад будаўніцтва новай беларускай атамнай электрастанцыі?

— Не, нас да гэтага не прыцягвалі. Перад намі стаіць іншая задача. Мы займаліся і будзем працягваць займацца ліквідацыяй наступстваў чарнобыльскай катастрофы.

— Ужо зацверджана Дзяржаўная праграма па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на 2011-2015 гады. Раскажыце, калі ласка, аб задачах, якія стаяць на бліжэйшыя пяць гадоў? Чым новая праграма адрозніваецца ад ранейшай?

— Некаторыя спрабуюць разнесці чуткі, у тым ліку і пры дапамозе замежных СМІ, аб тым, што ў Беларусі ліквідацыі наступстваў аварыі з кожным годам дзяржава надзяляе ўсё менш увагі. Хачу абвергнуць гэтую інфармацыю. Аб'ём сродкаў, выдзеленых з рэспубліканскага бюджэту на рэалізацыю Дзяржаўнай праграмы на 2011-2015 гады, складае 6,8 трлн рублёў. Гэта ў два разы больш, чым выдзялялася на мінулую пяцігодку. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы недзе 50 працэнтаў сродкаў будуць накіраваны на сацыяльна-эканамічнае развіццё пацярпелых рэгіёнаў.

А задач (калі будзе жаданне, можаце азнаёміцца з праграмай на сайце Дэпартамента) стаіць вельмі шмат. Назаву толькі асобныя з іх. Гэта сацыяльная абарона грамадзян, ахоўныя меры ў сельскай гаспадарцы, стварэнне новых вытворчасцяў у пацярпелых рэгіёнах, дзе б выпускалася рэнтабельная прадукцыя.

— Анатоль Васільевіч, дзякуй за цікавую размову.

— І яшчэ. Карыстаючыся магчымасцю, я хачу абвергнуць міф, аб тым, што мы нешта недагаворваем. Паверце, ніякай сакрэтнай інфармацыі ў дзейнасці Дэпартамента няма. Той, хто цікавіцца, можа зайсці на наш сайт (http://www.chernobyl.gov.by), там усё ёсць. Мы нічога не ўтойваем.

Надзея ДРЫЛА. Фота аўтара.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ДАТЭРМІНОВЫЯ ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА КАЗАХСТАНА ПРОЙДУЦЬ У КРАСАВІКУ

Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў прызначыў дату правядзення пазачарговых прэзідэнцкіх выбараў. Галасаванне адбудзецца 3 красавіка.

Паводле апублікаванага ўказа пра правядзенне выбараў, ураду і Цэнтравыбаркаму Казахстана даручана прыняць неабходныя меры па арганізацыйным, матэрыяльна-тэхнічным і фінансавым забеспячэнні пазачарговых прэзідэнцкіх выбараў. Напярэдадні Н. Назарбаеў падпісаў раней прыняты парламентам канстытуцыйны Закон «Пра ўнясенне дапаўненняў і змяненняў у некаторыя канстытуцыйныя законы Рэспублікі Казахстан», які ўстанаўлівае магчымасць правядзення ў Казахстане пазачарговых прэзідэнцкіх выбараў.

КРАХ ПАЛІТЫКІ «ЎМЯШАЛЬНІЦТВА»

Актыўнасць польскай дыпламатыі на апошніх беларускіх выбарах скончылася катастрофай. Пра гэта напісаў у артыкуле польскай газеце Rzeczpospolita кіраўнік партыі «Права і справядлівасць» Яраслаў Качыньскі. «Польская дыпламатыя сумесна з нямецкай адкрыта падтрымлівала палітычна слабага кандыдата, які да таго ж лічыўся прарасійскім. Няўжо польскі МЗС разлічваў, што на выбарах адбудзецца нейкі цуд?», — задаецца пытаннем польскі палітык, якога цяжка западозрыць у пяшчотных пачуццях да нашай краіны.

Адзначым, гэта першае публічнае прызнанне замежных палітыкаў ва ўмяшальніцтве ва ўнутраныя справы суверэннай Беларусі. Факты і дакументы пра спробу ўплываць на ход прэзідэнцкіх выбараў з-за мяжы раней прыводзіла ў тым ліку і «Звязда».

Качыньскі прызнаў, што кандыдатаў ад апазіцыі вызначалі не ў Мінску, а ў Варшаве і Берліне. Там жа выбудоўваліся і іх стратэгіі прыходу да ўлады.

Таксама з артыкула вынікае, што спроба наладжвання дыялогу паміж Беларуссю і заходнімі краінамі была шырмай. Насамрэч нашу краіну не збіраліся па-сапраўднаму ўключаць у еўрапейскія працэсы.

«Фінансавая прапанова ў рамках праграмы «Усходняе партнёрства» не можа вырашыць нават малой часткі фінансавых праблем Беларусі, у нейкай ступені зрабіць яе менш залежнай ад Расіі ці адчувальна мадэрнізаваць інфраструктуру краіны», — піша Качыньскі.

Нягледзячы на тое, што аўтар заклікае суайчыннікаў да санкцый супраць нашай краіны, яго падтрымліваюць далёка не ўсе палякі. У форуме пад артыкулам можна знайсці наступныя цытаты: «Лапы прэч ад Беларусі!», «Беларускі народ бачыць у Лукашэнку больш клопату аб дзяржаўных інтарэсах, чым палякі ў членаў «Грамадзянскай платформы», і таму галасуюць за «бацьку». Ён не знішчае злачынна спадчыну пакаленняў і народнае багацце, як партыйныя лідары ў суседняй дзяржаве». Таксама ў каментарыях адзначаецца, што само з'яўленне артыкула больш звязана не з падзеямі ў Беларусі, а з барацьбой саміх польскіх палітыкаў, палітычных кланаў за месца пад сонцам.

WIKILEAKS: ЗША І КІТАЙ ТАЙНА ВЯДУЦЬ ГОНКУ КАСМІЧНЫХ УЗБРАЕННЯЎ

ЗША і Кітай у апошнія гады вядуць гонку касмічных узбраенняў, і амерыканцы настолькі занепакоены прагрэсам суперніка, што нават прыстрашылі ваенным адказам Пекіну, калі ён не спыніцца. Гэта вынікае з тэлеграм Дзярждэпартамента, чарговая порцыя якіх рассакрэчана WikiLeaks. Іх утрыманне перадае брытанская The Daily Telegraph.

Дзве ядзерныя супердзяржавы перыядычна дэманструюць адна адной сілу, выкарыстоўваючы найбольш складаную і сучасную зброю, і напружанасць паміж імі нарастае, пагражаючы з'яўленнем новага ваеннага фронту. Усё пачалося ў студзені 2007 года, калі Кітай знішчыў ракетай свой стары метэаралагічны спадарожнік, які знаходзіўся на арбіце ў 800 км ад Зямлі.

У Белым доме былі шакіраваны, піша газета. Ракетны ўдар раскрышыў кітайскі спадарожнік на тысячы аскепкаў, якія стварылі на арбіце хаос і пагрозу шматлікім дзейным амерыканскім спадарожнікам, як грамадзянскага, так і ваеннага прызначэння. Каб пазбегнуць іх страты, ЗША яшчэ доўга змянялі курс сваіх апаратаў, адводзячы іх ад сутыкнення з абломкамі.

У лютым 2008 года рушыў услед «адказ» амерыканцаў: ракетай, запушчанай з борта крэйсера ў Ціхім акіяне, яны паразілі ўласны аварыйны спадарожнік-шпіён. Тым самым Вашынгтон даказаў Пекіну, што таксама здольны наносіць дакладныя ўдары па аб'ектах у космасе.

Самая свежая з рассакрэчаных дэпеш была адпраўлена з Дзярждэпартамента ў пасольства ЗША ў Пекіне ў студзені 2010 года, піша газета. У тэлеграме гаварылася, што разведка засякла чарговае «процісподарожнікавае выпрабаванне» Кітая: адна ракета паспяхова збіла іншую, якая знаходзілася ў 240 км над Зямлёй.

СНЕЖНАЯ БУРА ЗАКРАНУЛА ДЗВЕ ТРАЦІНЫ ТЭРЫТОРЫІ ЗША

Не меней дзвюх трацін тэрыторыі ЗША пацярпелі ад снежнай буры, піша The Los Angeles Times. Гаворка ідзе пра штаты, размешчаныя на Сярэднім Захадзе і ў раёне Вялікіх раўнін. Паводле звестак The New York Times, увогуле непагадзь закранула каля 30 рэгіёнаў. Ад анамальных маразоў, снегападаў і моцных вятроў у той ці іншай ступені пацярпелі каля 100 мільёнаў чалавек, піша The Wall Street Journal.

Без святла па ўсёй краіне засталіся сотні тысяч жыхароў. У адным толькі Тэхасе ад сетак адключыліся больш за 50 падстанцый. Усяго па краіне была парушана праца 18 буйных электрастанцый, агульная магутнасць якіх складае 9,4 гігавата. Мяркуецца, што халоднае надвор'е будзе захоўвацца яшчэ каля двух тыдняў.

У сталіцы канстатуюць: вострыя вірусныя інфекцыі пайшлі ў наступ...

У сувязі з пад'ёмам захваральнасці жыхароў сталіцы вострымі рэспіраторнымі інфекцыямі, які набыў выражаны характар, галоўны дзяржаўны санітарны ўрач горада Мінска Фёдар Германовіч падпісаў 4 лютага Пастанову «Аб узмацненні проціэпідэмічных мерапрыемстваў у арганізацыях аховы здароўя горада Мінска».

Кіраўнікам арганізацый аховы здароўя прадпісваецца ў выпадку ўзнікнення такой неабходнасці, перапрафіляваць саматычныя аддзяленні ў стацыянарах для лячэння хворых з вострымі рэспіраторнымі інфекцыямі. Кіраўнікі амбулаторна-паліклінічных арганізацый павінны арганізаваць абслугоўванне і лячэнне хворых з сімптомамі вострых рэспіраторных інфекцый пераважна на даму і максімальна абмежаваць правядзенне ў паліклініках прыёму здаровых людзей і прафілактычных медыцынскіх аглядаў. Кіраўнікам установаў аховы здароўя дазваляецца прыцягваць да работы з пацыентамі з сімптомамі ВРІ ўрачоў іншых спецыяльнасцяў, аспірантаў, клінічных ардынатараў, урачоў-інтэрнаў, студэнтаў 6-га курса лячэбнага і педыятрычнага факультэтаў медыцынскага ўніверсітэта.

Раённыя санэпідслужбы павінны аператыўна інфармаваць Мінскі гарадскі цэнтр гігіены і эпідэміялогіі аб выпадках узнікнення на іх тэрыторыі групавых захворванняў ВРІ ў арганізаваных калектывах і ўвядзенні проціэпідэмічных мерапрыемстваў ва ўстановах для дзяцей і падлеткаў усіх тыпаў. Паводле апошняй інфармацыі Міністэрства аховы здароўя, па стане на 2 лютага вучэбны працэс быў спынены ў 45 установах адукацыі па краіне: самая вялікая колькасць зачыненых школ (35) знаходзіцца на Віцебшчыне.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«МІНІМАЛКА» — ТРАЦІНА СЯРЭДНЯЙ ЗАРПЛАТЫ?

За мінулы год колькасць суб'ектаў гаспадарання з сярэдняй зарплатай менш за 200 долараў у эквіваленце зменшылася адразу ў 92 разы — па стане на 1 студзеня ў Беларусі налічваліся ўсяго 24 падобныя арганізацыі. Што ж да планаў на заўтра, то сярод іх — вызначэнне пэўных гарантый асобным работнікам. У прыватнасці, як паведаміла міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна, бліжэйшым часам памер мінімальнай зарплаты павінен адпавядаць мінімальнаму спажывецкаму бюджэту. А, як чакаецца, надалей тая ж «мінімалка» будзе складаць трэць ад сярэдняй зарплаты па краіне.

Верхняя «планка» — магчымасць, ніжняя «планка» — закон

Паводле статыстыкі, на працягу мінулага года сярэдняя налічаныя заробкі ў Беларусі павялічыліся на 23,9, а сярэдняя рэальная, з улікам змянення цэн на тавары і паслугі, зарплата — на 14,9 працэнта. Агульны ўзровень аплаты працы ў снежні выйшаў на адзнаку ў 527 долараў. У лідарах тут традыцыйна аказаліся нафтаперапрацоўка (1031), паліўная прамысловасць (923), чорная металургія (823), а таксама будаўніцтва (655 долараў у эквіваленце). Аднак пры гэтым палепшыўся малюнак і ў галінах-«аўтсайдарах» — напрыклад, сярэдняя снежаньская зарплата ў сельскай гаспадаркі складала 328 «умоўных адзінак». Дзякуючы апошнім павышэнням тарыфнай стаўкі I разраду, «падцягнуліся» і бюджэтнікі: агульны паказчык аплаты працы ў снежні па ахове здароўя склаў амаль 482, па адукацыі — 423,5, фізічнай культуры і спорце — 581, культуры і мастацтве — 397, сацыяльным забеспячэнні — 378, навуцы і навуковым абслугоўванні — 845 долараў у перапразліку.

Як зазначыла міністр, практыка павышэння тарыфнай стаўкі I разраду бюджэтнікам працягнецца і надалей. Што ж да рэальнага сектару эканомікі, то тут абмежаванні паступова здымаюцца — узровень аплаты працы сваіх супрацоўнікаў павінны вызначаць непасрэдна арганізацыі. Дзяржава будзе кантраляваць толькі некалькі напрамкаў, скажам, выплату заробкаў на ўзроўні не ніжэй за «мінімалку». Дарэчы, з новага года яе памер вызначаны ў 460 тысяч рублёў — гэта ўпершыню перавысіла адзнаку мінімальнага спажывецкага бюджэту. Прычым «мінімалка» павінна адпавядаць МСБ і цягам наступных гадоў. У перспектыве ж найменшую «планку» аплаты плануецца прывязаць да сярэдніх па краіне заробкаў.

Плюс да таго становіцца актуальнай яшчэ адна тэма — своечасовасці выплат работнікам. За апошні час асаблівых праблем тут не было, у даўжнікі траплялі лічаныя суб'екты гаспадарання, а сама сума запазычанасці не перавышала 0,03 — 0,05 працэнта ад агульнага па краіне фонду зарплаты. Тым не менш у міністэрстве падкрэсліваюць: у сувязі з большай свабодай наймальнікаў у вызначэнні заробкаў тут могуць узнікаць пытанні. Адпаведна, тэрміны разлікаў з работнікамі павінны кантралявацца.

Прадпрымальнік з выбарам?

Цікавае назіранне: адной з найбольш вострых праблем апошняга часу становіцца незадаволенасць невялікімі адрозненнямі ў памерах пенсій. Аднак скаргаў непасрэдна на гэтыя памеры становіцца менш. Як заўважыла Марыяна Шчоткіна, за 2005-2010 гады сітуацыя насамрэч палепшылася: рэальны, з улікам інфляцыі, узровень тых жа пенсій па ўзросце павялічыўся ў 1,61 раза.

Тым не менш пенсійныя пытанні застаюцца актуальнымі ўжо па адной прычыне: насельніцтва краіны паступова старэе. Вынікам становіцца рост колькасці пенсіянераў. Калі ў 2008 годзе іх стала больш на 13 тыс., то пазамінулы і мінулы гады забяспечылі «прыбаўку» па 20 тысяч. Падобная тэндэнцыя захаваецца, а адсюль — і тэма стабільнасці пенсійнай сістэмы ў перспектыве.

Спроба «разгрузіць» агульную пенсійную сістэму фактычна зроблена — у краіне ўведзена прафесійнае страхаванне работнікаў, якія занятыя ў неспрыяльных і асаблівых умовах. А ў будучыні пакінуць тую ж агульную пенсійную сістэму можа і частка індывідуальных прадпрымальнікаў. У прыватнасці, плануецца разгледзець варыянт, паводле якога тыя ж ІП атрымаюць магчымасць выбару: рабіць пенсійныя адлічэнні ў дзяржаўную пенсійную сістэму або ўдзельнічаць у камерцыйных праграмах пенсійнага страхавання страхавых арганізацый.

Ці стане гэта прапанова законам — пакуль невядома. Аднак у міністэрстве падкрэсліваюць: у любым выпадку неабходнасць рабіць пенсійныя адлічэнні ў індывідуальных прадпрымальнікаў не знікне. Пры адмове ад удзелу ў дзяржаўнай схеме камерцыйны варыянт пенсійнага страхавання павінен стаць абавязковым.

І, дарэчы, яшчэ адзін момант. Не сакрэт, што міграцыя пенсіянераў — з'ява даволі распаўсюджаная. А пытанні выплат пры пераездзе з краіны ў краіну застаюцца даволі вострымі. На сёння яны адрэгуляваныя пагадненнямі з большасцю (за выключэннем Азербайджана, Грузіі і Эстоніі) краін былога Савецкага Саюза. А вось з іншымі краінамі падобных дагавораў няма. Таму, паведаміла Марыяна Шчоткіна, чакаецца, што сёлета на гэты конт пройдуць папярэднія экспертныя кансультацыі з Чэхіяй і Польшчай.

Што штучна, то нядобра

Стварэнне новых працоўных месцаў, прафесійнае навучанне і перанавучанне, падтрымка прадпрымальніцтва працягваюць даваць плён. У пачатку гэтага года ў краіне налічвалася 48,8 тыс. вакансій — на 41 працэнт больш, чым у пачатку года мінулага. Прычым Беларусь працягвае захоўваць адзін з самых нізкіх у свеце ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя — 0,7 працэнта ад агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Па сутнасці за рысу ў 1 працэнт не выходзяць 107 рэгіёнаў. Узровень беспрацоўя ў межах 1,1-1,5 працэнта маюць 22 рэгіёны, а большы паказчык (1,6 працэнта) толькі Ганцавіцкі раён.

Да таго ж паступова адыходзіць у мінулае такая тыпова «крызісная» з'ява, як вымушаная няпоўная занятасць. Летась у параўнанні з 2009 годам яе аб'ём зменшыўся на 56,7 працэнта — да 154,5 тыс. чалавек.

Праўда, сцвярджаць, што праблема беспрацоўя вырашана да канца, нельга. Планы па мадэрнізацыі айчыннай эканомікі натуральна адаб'юцца на рынку працы, адпаведна, неабходнасць у актыўнай дзяржаўнай палітыцы не знікне. Прычым, лічыць міністр, настаў час адмаўляцца ад штучнага стрымлівання колькасці працоўных месцаў. Стаўка будзе рабіцца на падтрымку эфектыўнай занятасці — у высокатэхналагічных галінах з высокім узроўнем заробкаў.

І кар'ера, і дзіця

Між тым ці не самай балючай праблемай, і ў тым ліку для таго ж рынку працы, становіцца скарачэнне насельніцтва Беларусі. За 10 гадоў нас стала менш на 540 тыс. чалавек. Сапраўды, «бэбібум» першай паловы 1980-х, падтрымка сем'яў пры будаўніцтве жылля, рост дзіцячых дапамог, адрасная сацыяльная дапамога і іншая сацыяльная падтрымка адыгралі пэўную ролю — некалькі гадоў запар нараджальнасць павялічвалася. Аднак летась малюнак змяніўся — у краіне з'явілася на 1690 немаўлят менш, чым у пазамінулым годзе.

Зразумела, што не ў апошнюю чаргу нараджальнасць — пытанні псіхалогіі, традыцый і менталітэту. Аднак не выпадае скідваць з рахункаў і эканамічныя стымулы. Таму, зазначаюць у міністэрстве, працягнецца практыка павелічэння памераў дапамог — з іх большай дыферэнцыяцыяй у залежнасці ад колькасці дзяцей. А плюс да таго, лічыць Марыяна Шчоткіна, трэба звярнуць увагу на іншае: стварэнне ўмоў для сумяшчэння выхавання дзяцей з прафесійнай кар'ерай. Менавіта гэта павінна стаць адным з асноўных момантаў у новай праграме дэмаграфічнай бяспекі да 2015 года.

Сяргей ГРЫБ.

Адкрытыя кнігі

Мяккі навобмацак тканінны карашок, прыемнае на выгляд афармленне, пяшчотнае на слых шапаценне лісткоў і ні з чым не параўнальны водар... Кніга стварае асаблівую атмасферу і асобную рэальнасць. Хціва смакуючы і першую, і другую, я ўсё ж разумею: галоўнае не форма, а змест. Як любому кнігаману, мне прыемна адчуваць у руках мацунак пераплёту і перагортваць старонкі, рабіць пазнакі на палях і пакідаць закладкі. Але не бачу аніякай супярэчнасці ў тым, каб карыстацца электроннай кніжкай — суперплоскай і мініяцюрнай. Як любому рацыяналізатару, мне дастаўляе асалоду думка, што ўсю сваю хатнюю бібліятэку я штодня нашу ў сумачцы. Да таго ж, электроннае чарніла забяспечвае поўны эфект падабенства з друкаваным на паперы — няма такой кантраснасці, як на маніторы камп'ютара, і вока не стамляецца. Таму мне цяжка зразумець праціўнікаў сучасных тэхналогій, якія ўвязваюць новую ступень камфорту з выцясненнем духоўных каштоўнасцяў. Справа не ў тым, у якой форме чытаць, справа ў тым, ШТО чытаць. Але ж тэма дыскусійная. І чарговую нагоду задумацца дае XVIII Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш.

Наведнікі (а іх, паводле разліку арганізатараў, будзе больш за 50 тысяч) адкрыюць для сябе кнігі 22 краін свету. Натуральна, не абмяжуецца тут толькі блізкім суседствам і нават кантынентам: будуць прадстаўленыя і Венесуэла, і Кітай, і ЗША. Такая шырокая геаграфія пераконвае ў тым, што наш край, паводле выразу **першага намесніка міністра інфармацыі Ліліі АНАНІЧ**, «без перабольшвання з'яўляецца кніжнай сталіцай не толькі Еўропы, але і свету». Падчас сустрэчы з журналістамі яна звярнула асаблівую ўвагу на тое, што цяпер, у час укаранення новых тэхналогій, мы ўсе павінны клапаціцца пра тое, каб кніга, чытанне не страціла свайго адвечнага сэнсу. У кніг з'явіўся канкурэнт, заўважае першы намеснік міністра інфармацыі. Таму неабходна «ўсімі сродкамі супольна вяртаць кнігу да моладзі, дзяцей, у наша грамадства». Міністэрства інфармацыі са свайго боку абвясціла шырокую акцыю ў падтрымку чытання. І кніжны форум зробіць свой унёсак у гэту справу.

Ды і для гасцей гэта выстава — цудоўная магчымасць прачытаць нашу краіну, як кнігу. Пабачыць на свае вочы, зірнуць па-новаму. Кніга межаў не мае. І якія б плыні не віравалі ў свеце, кніга, на думку спадарыні Ананіч, заўжды будзе аб'яднальнай сілай.

УСІМ КНІГАЛЮБАМ АДКРЫТЫЯ ДЗВЕРЫ
ў сталічны НВЦ «БелЭкспа» (Янкі Купалы, 27)
на XVIII Мінскую міжнародную кніжную выставу-кірмаш
9 — 13 лютага
(рэжым работы: у першы дзень з 14.00, у апошні — да 15.00, 10 — 12 лютага з 10.00 да 19.00).
Уваход вольны!

Германія, несумненна, будзе ў цэнтры ўвагі на сёлетняй выставе. Экспазіцыя Пачэснага госця ўразіць не толькі маштабамі (стэнд у 255 кв. м — у беларускай практыцы рэкорд), але і тэматыкай. Будзе прадстаўлена больш як 700 найменняў.

— Спадзяёмся, кнігі, якія мы будзем дэманстраваць на сваіх стэндах, задаволяць густы ўсіх наведнікаў. І кожны зможа знайсці нешта для сябе, — адзначае **намеснік старшыні місіі Пасольства ФРГ у Беларусі Петэр ДЭТМАР**. — Адбудуцца літаратурныя чытанні, аўтограф-сесіі, прафесійныя дыскусіі. Спадзяёмся, выстава прынясе плён і ў галіне перакладчыцкай дзейнасці, актывізуе пераклады з беларускай мовы на нямецкую, з нямецкай — на беларускую.

Такі статус Германіі на сёлетняй выставе ў Беларусі дыпламат расцэньвае як «пацверджанне нашага плённага супрацоўніцтва, якое адбывалася на працягу многіх гадоў». Асаблівы акцэнт у экспазіцыі экалагічна зарыентаваныя немцы робяць на выданнях пра «зялёную» архітэктуру — энергаэфектыўныя, лаяльныя да навакольнага асяроддзя будыніны. Прыемны бонус — усе кнігі з экспазіцыі Пачэснага госця пяройдуць у дар беларускім бібліятэкам.

Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман МАТУЛЬСКІ, які паявіўся на прэс-канферэнцыі з нэтбукам (міні-камп'ютарам, прызначаным найперш для работы ў інтэрнэце), робіць уражанне чалавека прагрэсіўнага, успрыімлівага да новых тэхналогій. Такія ж, паводле яго аповеду, і наведнікі Нацыянальнай бібліятэкі. За апошнія тры гады колькасць зваротаў да электронных рэсурсаў галоўнай кніжнай скарбніцы краіны павялічылася ў 33 (!) разы. «Амаль 68 адсоткаў нашых наведнікаў — віртуальныя», — канстатуе дырэктар бібліятэкі. Аднак паводле яго цвёрдага перакананння, гэта сведчыць выключна аб тэмпах развіцця, а не аб заняпадзе кнігі.

— Ні ў якім разе нельга супастаўляць традыцыйную і электронную кнігу, — пераконвае кіраўнік Нацыянальнай бібліятэкі, — у кожнай з іх свая місія і свой чытач.

Цяжка не пагадзіцца. Галоўнае, каб мы адкрывалі для сябе самі кнігі. Ці то папяровыя, ці то электронныя. Галоўнае, каб нам станавіўся зразумелым іх змест. Каб у нечым ён замяняў нам жыццёвы вопыт, спрашчаў нашы стасункі з людзьмі. Каб мы лепш разумелі адзін аднаго. Каб навакольныя былі для нас адкрытымі кнігамі.

Ала МАЧАЛАВА.

МВФ задаволены ходам стварэння ў Беларусі Банка развіцця

«Нас абнадзейвае прагрэс, дасягнуты ўладамі ў галіне стварэння Банка развіцця. Ён прыме на сябе некаторыя з функцый камерцыйных банкаў па фінансаванні дзяржаўных праграм. Мы спадзяёмся, што Банк развіцця будзе прымаць няпростыя рашэнні, якія неабходны для адбору праграм, і будзе накіроўваць рэсурсы на рэалізацыю найбольш эфектыўных праграм, што садзейнічаюць эканамічнаму росту, павелічэнню экспарту і занятасці», — гаворыцца ў паведамленні фонду са спасылкай на Крыстафера Джарвіса, кіраўніка Місіі МВФ, якая працавала ў Беларусі з 25 студзеня па 2 лютага з мэтай прадаўжэння кансультацый па Артыкуле IV з уладамі краіны і іншымі зацікаўленымі бакамі.

У ходзе работы місіі адбыліся сустрэчы з прэм'ер-міністрам Міхаілам Мясніковічам, намеснікам прэм'ер-міністра Сяргеем Румасам, міністрам фінансаў Андрэем Харкаўцом, міністрам эканомікі Мікалаем Снапковым, старшынёй праўлення Нацыянальнага банка Пятром Пракаповічам, прадстаўнікамі банкаў і дыпламатычнай супольнасці. Місія ўдзячна ўладам за шчырае абмеркаванне пытанняў.

Крыстафер Джарвіс таксама адзначыў: «Мы вітаем падпісанне Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Дырэктывы № 4. Выкананне Дырэктывы ў кароткія тэрміны створыць спрыяльнае асяроддзе для вядзення бізнэсу, будзе садзейнічаць развіццю прыватнага сектара і павысіць прывабнасць Беларусі для інвестараў. У мэтах узмацнення празрыстасці і эфектыўнасці працэсу прыватызацыі мы таксама настойліва рэкамендуем ураду неадкладна прыняць меры для таго, каб пачало працаваць Нацыянальнае агенцтва па інвестыцыях і прыватызацыі».

Разам з тым у МВФ лічаць, што дэфіцыт рахунку бягучых аперацый вельмі высокі. У сувязі з гэтым ураду і Нацбанку трэба неадкладна прыняць меры па яго скарачэнні. «Па нашай ацэнцы, дэфіцыт рахунку бягучых аперацый у 2010 годзе склаў каля 16 працэнтаў ВУП, а пры ўмове адсутнасці змяненняў у макраэканамічнай палітыцы мы прагназуем толькі невялікае зніжэнне дэфіцыту рахунку бягучых аперацый у 2011 годзе з прычыны паляпшэння ўмоў паставак нафты з Расіі ў адпаведнасці з дамоўленасцямі, дасягнутымі ў снежні 2010 года», — адзначыў прадстаўнік МВФ.

Асноўнымі прычынамі высокага дэфіцыту рахунку бягучых аперацый у 2010 і 2011 гадах сталі хуткі рост крэдытавання і значнае павелічэнне заработнай платы ў бюджэтнай сферы ў канцы 2010 года. «Улады лічаць, што скарачэнне дэфіцыту рахунку бягучых аперацый і нарошчванне афіцыйных рэзерваў павінны стаць прыярытэтнымі задачамі ў 2011 годзе. Шэраг крокаў з мэтай зніжэння дэфіцыту рахунку бягучых аперацый ужо зроблены, у тым ліку і за кошт узмацнення грашова-крэдытнай палітыкі, выкарыстання гібкасці, якая магчыма ў рамках каліфора абменнага курсу, і ўстанаўлення мэтавага паказчыка сукупнага росту крэдыту ў 2011 годзе, які значна ніжэйшы за яго рост у 2010 годзе», — гаворыцца ў паведамленні.

У МВФ лічаць, што ўладам трэба пайсці далей. Рэкамендацыі фонду па скарачэнні дэфіцыту рахунку бягучых аперацый вельмі падобныя на тыя, якія былі прапанаваны ў лістападзе 2010 года: спалучэнне больш строгай падаткова-бюджэтнай палітыкі, скарачэння чыстага крэдытавання ў рамках дзяржаўных праграм, захавання дадатных у рэальным выражэнні працэнтных ставак і павышэння гібкасці абменнага курсу.

«Мы занепакоены рэзкім павелічэннем пазык Нацбанка ў замежнай валюце ў беларускіх камерцыйных банкаў у канцы 2010 года. Мы настойліва рэкамендуем Нацбанку спыніць практыку такіх пазык і вітаем рашэнне Нацбанка далей не павышаць узровень такой пазыкі на працягу 2011 года. Мы рэкамендуем праводзіць строгую макраэканамічную палітыку ў якасці найбольш эфектыўнага спосабу захавання і павышэння ўзроўню валютных рэзерваў», — адзначыў Крыстафер Джарвіс.

БЕЛТА.

ЛЮБАЯ КОЛЬКАСЦЬ АЛКАГОЛЮ НАНОСІЦЬ ШКОДУ ЗДАРОЎЮ

ДЗЯРЖАВА прызнала, што здароўе і бяспека насельніцтва важней за інтарэсы вытворцаў алкаголю. Пацвярджэннем таму — Дзяржаўная праграма нацыянальных дзеянняў па папярэджванні і пераадольванні п'янства і алкагалізму на 2011—2015 гады.

Перш за ўсё, згаданая праграма дае азначэнне тэрміну «алкаголь». Так што цяпер вытворцам слабаалкагольнага піва не выпадае залічваць апошняе ў шэрагі проста напояў, тым больш карысных. Напой, які ў любой дазіроўцы ўтрымлівае этылавы спірт і, адпаведна, выклікаеап'яненне, а пры злоўжыванні выклікае алкагалізм, з'яўляецца алкаголем (дакладней, арганічным растваральнікам), а значыць, ні ў якім разе не з'яўляецца прадуктам харчавання! Алкаголь абавязкова пакідае разбуральны след у арганізме. Размова толькі аб тым, наколькі разбуральны. А вось гэта сапраўды залежыць ад дозы.

Паводле слоў галоўнага нарколага Міністэрства аховы здароўя Беларусі Аляксея АЛЯКСАНДРАВА, існуе цэлы пералік захворванняў, пры якіх алкаголь нельга ўжываць у прынцыпе. Узяць хоць бы хваробы сэрца, сардэчна-сасудзістай сістэмы. Ужыванне такімі пацыентамі алкаголю адназначна павышае іх шанцы заўчасна памерці ад, скажам, раптоўнага спынення сэрца, інфаркту ці інсульту. Рэкамендацыя ў дачыненні да алкаголю, як адзначаюць нашы нарколагі, можа быць адна: чым менш, тым лепш.

Наогул лічыцца, што ў любым грамадстве каля 25 працэнтаў людзей ігнаруюць алкаголь цалкам, гэта значыць, вядуць цвярозы лад жыцця. З астатніх 75-ці — 20 працэнтаў выпіваюць каля 80 працэнтаў выраблянага алкаголю. Зразумела, што далёка не ўсе гэтыя 20 працэнтаў дажывуць непасрэдна да алкагалізму — найбольш рэальнай для іх уяўляецца заўчасная гібель ад іншых захворванняў, справакаваных празмерным ужываннем алкаголю.

Мэта дзяржаўнай праграмы — вельмі простая. Знізіць ужыванне алкаголю і зменшыць негатыўныя наступствы ад гэтага ўжывання. Вось толькі як гэтага дабіцца? Што характэрна, Беларусі не трэба тут нічога вынаходзіць.

— Сусветны вопыт барацьбы з алкагалізмам даказаў эфектыўнасць прафілактычных антыалкагольных праграм, — кажа намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Людміла НАРОЙЧЫК. — Такія праграмы дазваляюць знізіць распаўсюджанасць алкагалізму на 15 працэнтаў, страту непрацаздольнасці і інваліднасці — на 5, захваральнасць на саматычныя хваробы — на 25, рызыку траўматызму — на 10—15. Сусветны вопыт таксама паказаў, што эфектыўнасць розных мерапрыемстваў неаднолькавая. Найбольш эфектыўнымі з'яўляюцца высокае падаткаабкладанне алкагольнай прадукцыі, павышэнне ўзроставага цэнзу пры продажы алкагольнай прадукцыі да 21 года, абмежаванне доступу да спіртных напояў (часу і месца продажу), мерапрыемствы, скіраваныя на папярэджванне кіравання транспартным сродкам у нецвярозым стане, забарона продажу алкагольных напояў чалавеку, які знаходзіцца ў алкагольным ап'яненні, кантроль за рэкламай алкаголю і ранняе медыцынскае ўмяшанне, калі наркалагічная дапамога будзе эфектыўнай. Толькі растлумачальныя, інфармацыйныя мерапрыемствы па гэтай праблеме — пры адсутнасці забаронных мер — не даюць станоўчага эфекту...

Паступова, крок за крокам, Беларусь павінна прыйсці да змяншэння колькасці людзей, якія хварэюць на алкагалізм; злачынстваў, якія ўчыняюцца ў стане алкагольнага ап'янення; нешчаслівых выпадкаў на вытворчасці, звязаных з ужываннем алкаголю. Аднак ужо зараз маладыя людзі і іх бацькі павінны ўсвядоміць, што продаж алкаголю пасля 18 гадоў не азначае, што ў 20 ці 21 «можна і трэба». Злоўжыванне алкаголем ва ўзросце ад 18 да 21 года здольнае прывесці і прыводзіць да развіцця цяжкіх формаў алкагольнай залежнасці.

Дзяржава плануе заняцца ўкараненнем такой непапулярнай меры, як скарачэнне прапановы — змяншэнне колькасці гандлёвых кропак, дзе рэалізуецца алкаголь, а таксама павышэнне кошту на алкагольную прадукцыю нават пры тым жа аб'ёме алкаголю, які выпускаецца. Відавочна, неабходна яшчэ больш жорстка абмяжоўваць і тэлевізійны час для рэкламы такой прадукцыі.

«Сёння да 30 працэнтаў прадукцыі ў харчовых магазінах могуць складаць алкагольныя напоі, — адзначае кіраўнік Цэнтра маніторынгу наркалагічнай сітуацыі РНПЦ псіхічнага здароўя Сяргей ОСІПЧЫК. — Гэта недапушчальна. У Швецыі, скажам, існуе дзяржаўная манаполія на продаж алкаголю. У шведскім харчовым магазіне можна знайсці толькі слабаалкагольнае піва. На астатнія алкагольныя напоі існуе дзяржаўная манаполія, і таму яны прадаюцца ў асобных магазінах, у пэўны час, пэўным людзям. Мы пакуль толькі ідзём да гэтага...».

Паводле замежных звестак, 38 працэнтаў агульнабальнічных затрат звязаны з п'янствам і алкагалізмам. Створаны летась Цэнтр маніторынгу наркалагічнай сітуацыі будзе займацца падобнымі падлікамі, у тым ліку рэнтабельнасцю мерапрыемстваў, скіраваных на зніжэнне ўжывання алкаголю і змяншэнне звязаных з гэтым негатыўных наступстваў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ЦУКРОВАЯ ПУДРА Ў АЙЧЫННЫМ ФАРМАЦЕ

Сёлета ў Беларусі плануецца наладзіць вытворчасць уласнай цукровай пудры — аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміла прэс-сакратар канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Юлія Бальшакова.

Цікавымі навінкамі беларускіх прадпрыемстваў ужо сталі прасаваны цукар у форме кубікаў, у форме «брыдж», цукар з карыцай, а таксама прасаваны цукар з вітамінам С. Адначасова, адзначылі ў канцэрне, апошнім часам выраблены партыі буйнакрышталёвага цукру, а таксама цукру, узбагачанага ёдам, селенам, вітамінам Е, фоліевай кіслатой. Апроч таго, у планах і вытворчасць карычневага цукру.

Дарэчы, у параўнанні з мінулым годам сёлета айчынныя прадпрыемствы плануюць павялічыць аб'ём вытворчасці цукру на 9,2 працэнта — да 892 тыс. тон. Пры гэтым чакаецца, што большая частка «салодкай» прадукцыі пойдзе на экспарт.

Сяргей ГРЫБ.

Факт

ЗАГАРЭЎСЯ СТАРЭНЬКІ «РЭКОРД»

Пра пажар у кватэры па вуліцы Зялёнай у Слоніме выратавальнікам паведаміў мінак: ён заўважыў дым, што ішоў з вокнаў.

Па прыбыцці на месца падчас разведкі пажарныя-выратавальнікі ў адным з пакояў знайшлі пажылую гаспадыню. З дыягназам «атручэнне прадуктамі гарэння» яна была шпіталізаваная. Як потым высветлілася, жанчына амаль увесь час бавіла перад тэлевізарам. Старэнькі трыццацігадовы «Рэкорд» у нейкі момант не вытрымаў нагрузкі і загарэўся.

Гаспадыня сама спрабавала яго тушыць, аднак агонь пачаў распаўсюджвацца па кватэры. Імкнучыся выратаваць сваё небагатае дабро, пенсіянерка засталася ў задымленым памяшканні да прыезду выратавальнікаў. Выходзіць, каб не той мінак, яшчэ невядома, чым бы магло скончыцца гэтае здарэнне.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БРАЎ УСЁ...

У в. Крывошын (Ляхавіцкі раён) невядомы ноччу адключыў сігналізацыю ў мясцовай краме, затым выламаў дзверы і браў усё, што пад руку трапіла: абутак, бялізну, цыгарэты, прадукты...

Злодзея, які вынес тавару на 4 млн рублёў, шукаюць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Информация о проведении аукциона без условий по продаже имущества, обращенного в доход государства

ЛОТ № 1	
Адрес объекта и его наименование	Одноэтажное кирпичное здание (комплекс состоит из столярного цеха, лесопильного цеха, бытового помещения, кран-балки). Общая площадь 851,1 м², год постройки – 1976. Объект расположен по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Промышленная, 4. **Начальная цена: 207 846 000 белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5 % от предыдущей цены.
ЛОТ № 2	
Адрес объекта и его наименование	Корпус № 16 (заготовительный участок) производственное кирпичное одноэтажное здание. Общая площадь 406,9 м², год постройки 1958. Объект расположен по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67. **Начальная цена: 286 300 000 белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5 % от предыдущей цены.
ЛОТ № 3	
Адрес объекта и его наименование	Пристройка отдела № 980 к корпусу № 16. Кирпичное здание Г-образной формы, состоящее из одно- и двухэтажной частей. Общая площадь 397,1 м², год постройки – 1990. Объект расположен по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67. **Начальная цена: 326 400 000 белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5 % от предыдущей цены.
Порядок оплаты	Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 2 месяцев и 25 дней на р/с СИКУП «УКС-Сервис»
Сумма задатка	10 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-Сервис»
Продавец	Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Молодечненском райисполкоме
Организатор аукциона	СИКУП «УКС-Сервис»
Документы, представляемые для участия в аукционе	Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, индивидуальным предпринимателям – нотариально заверенное свидетельство о государственной регистрации, физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Конечный срок и адрес приема заявок	**07.03.2011 г. до 16.00**, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел. (8 0176) 73 00 13, (факс) 75 19 20, 8 044 710 74 60
Дата, время и место проведения аукциона	**09.03.2011 г. в 15.00**, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1. СИКУП «УКС-Сервис»

Нефармат

«А ДЗЕД МАРОЗ — ЦВЯРОЗЫ?!»

Зусім не навагоднія нататкі

ЛІТАРАЛЬНА сёння ў абедзены перапынак у бліжэйшай кнігарні жанчына купіла цэлы стос — як толькі панесла — плакатаў, прысвечаных Дню абаронцаў Айчыны. Міжволі падумалася: хіба яна ў арміі палітработнікам служыць? Але няўжо ў часці не знайшлося салдата, прапаршчыка, афіцэра, каб паднёс нялёгкую паклажу? Ды і не ў вайсковай форме была пакупніца, а ў звычайным адзенні. Няўжо нястомны прафорг якой-небудзь вялікай арганізацыі ці прадпрыемства рыхтуецца да свята 23 лютага? Магчыма. І гэта толькі пачатак вялікай падрыхтоўкі.

Нездарма ж таварыш Троцкі падпісаў загад Рэўваенсавета аб неабходнасці стварэння ўзброеных сіл 23 лютага 1918 года. Пазней, калі таварыш Троцкі быў не ў пашане, таварыш Варашылаў спрабаваў аспрэчыць мэтазгоднасць вышэйназванай даты, нават выступіў з гэтай нагоды ў газеце «Правда». Ды было позна, працэс пайшоў. І ў значна змененым выглядзе дайшоў да нашых дзён. Спачатку гэта быў найбольш дзень агледзін баявой і палітычнай падрыхтоўкі, дзень маршаў ды ўзнагарод людзей мужнай і патрэбнай кожнай краіне прафесіі. Але з паступовым ростам дабрабыту насельніцтва ён ператварыўся ў мужчынскі дзень з усімі яго атрыбутамі: шкарпэткамі, дэзадарантамі, крэмамі для галення, каньякамі ды піўнымі кубкамі. Ужо і анекдот склалі: «23 лютага — Дзень мужчынскага дэзадаранту, 8 Сакавіка — Дзень помсты за гэты дэзадарант». Пасля навагодніх свят гэта першы ўсеагульны ператрус сямейных бюджэтаў. Зноў надыходзіць крыху забыты пасля Новага года вясёлы тлум, апаноўваюць клопаты, робяцца пакупкі. А ў выйгрышы, вядома, гандляры і вытворцы. І найперш, вытворцы гарэлкі.

І калі пазначаную дату як у сем'ях, так і ў калектывах адзначаюць больш сціпла, то ўсенароднаму вясновому святу аддаецца належнае з усім размахам. Тонамі закупляецца парфума і мімоза, шампанскае і цукеркі, ладзяцца карпаратывы. І ўжо хто там успомніць прамаці гэтага свята Клару Цэткін, яе паслядоўніц, якія змагаліся за жаночыя правы. А дарэмна. Каб помнілі палымяных рэвалюцыянерак ды іх прамовы на жаночых канферэнцыях, можа, хутчэй вынайшлі б пральныя ды посудамыйныя машыны. А то апошнія гадоў пяцьдзясят толькі ведалі, што славілі жанчыну-працаўніцу ў адпаведны дзень, а самі будавалі касмічныя караблі, атамныя станцыі. На банальную машыну з барабанам, што памые бялізну, не лічылі патрэбным нават траціць канструктарскія мазгі. Лічылі, што жанчына-працаўніца і рукамі памые як мае быць. А калі гэты цуд тэхнікі прывезлі з далёкага замежжа і пасарамацілі айчынных вытворцаў, тады і свае ўзяліся за выраб. Затое святкавалі жаночы дзень заўсёды шчыра і з размахам. У выйгрышы, вядома, заставаліся гандляры і вытворцы сувеніраў, парфумы, кветак. І, найперш, вытворцы гарэлкі.

А яшчэ ў нас ёсць розныя спецыяльныя дні: Дні дэсантніка і памежніка, Дні медыка і настаўніка, Дні будаўніка і працаўніка сельскай гаспадаркі. Увосень ад душы святкуюць аграрыі. Пасля напружанага сельскагаспадарчага года, пасля гарачай бітвы за ўраджай не грэх бывае і разняволіцца. Не адстаюць і будаўнікі. Пасля здачы чарговых аб'ектаў, якія ўзводзяцца, як правіла, раней за ўсе нарматыўныя тэрміны, чаму б не ўшанаваць перадавікоў, а за імі ўсіх астатніх? У выйгрышы, як вы разумееце, застаюцца вытворцы гарэлкі. Як сказаў адзін кіраўнік прадпрыемства, юбілей якога прыйшоўся якраз на вербную нядзелю: «Гарэлка ж посная».

Юбілеі агульныя і ўласныя, сямейныя святы — асобная тэма. Тут у выйгрышы, акрамя вышэйадзначаных суб'ектаў гаспадарання, застаюцца яшчэ і рэстаратары. Яны добра зарабляюць на лічбах: круглыя даты прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый і асобных грамадзян святкуюцца, як правіла, у кавярнях і рэстаранах. Адна мая сяброўка, дама пры салідным пасадзе, бядуе, як неўзабаве пражыць уласнае 50-годдзе. На працы намякаюць, што трэба збіраць шматлюдную вечарынку. Каб не адстаць ад іншых калег, давядзецца здымаць залу ў лепшым рэстаране. А жыццёвая сітуацыя апошнім часам склалася так, што тэрмінова давялося браць некалькі крэдытаў. Ды і праблемы, што зваліліся як снег на галаву, не прыбавілі пазітыўнага настрою. Ды праблемы мусіш вырашаць. А тут яшчэ і гэта... Кажу ёй: «Узваж усё. Калі гэта ўрачыстасць зробіць цябе шчаслівай хоць на нейкі час, варта ўзяць хоць бы яшчэ адзін крэдыт, замовіць залу з белым раялем». «Што ты, — адказвае, — якое шчасце — слухаць няшчырыя прамовы, штучна ўсміхацца ў адказ? Я вельмі хацела б паехаць на той час на чарнаморскае ўзбярэжжа Балгарыі да сваіх старых знаёмых, пасядзець у цішы, паслухаць шум мора і адпачыць ад усяго тлуму апошняга года». Дык што ж перашкаджае гэта зрабіць? Ну як жа, а што людзі скажуць? Іншымі словамі, як можна падвесці рэстаратараў і вытворцаў гарэлкі?

Пра траты да навагодніх свят нават гаварыць не даводзіцца. Гэта для нашага чалавека ўспрымаецца як нешта звычайнае, нібы хадзіць на працу альбо адпраўляць дзяцей у школу. Прадавачка крамы-павільёна каля дома казала, што калі ў звычайныя дні яны рэалізуюць да трох скрыняў гарэлкі, то ў навагоднія і пераднавагоднія — каля дваццаці штодзень. І ўжо нават дзеці ўспрымаюць са здзіўленнем тое, што не ўпісваецца ў гэты сцэнарый.

Якраз перад Новым годам пушчанскі Дзед Мароз расказваў нядаўні выпадак. Пад'ехалі турысты, расійская група, у асноўным, бацькі з дзецьмі. Дзед, як заўсёды, стаў вітаць гасцей, гаварыць аб прыгажосці пушчы і свайго памесця. А хлапчанё гадоў пяці-шасці раптам як закрычыць: «Тата, а Дзед Мароз — цвярозы?!» Бацька, вядома, сумеўся, потым стаў выбачацца, тлумачыць: «Ведаеце, мы заўсёды замаўляем для сына Дзеда Мароза дадому. І, звычайна, калі ён прыходзіць пазнавата, то яго бывае хоць ты падтрымлівай альбо калком падпірай. Вось малы і прывык...»

Традыцыя адзначаць кожны новы год пайшла, як вядома, з часоў Пятра І. Потым да старых звычаяў дадаваліся новыя — такія, як паліць з рознай піратэхнікі, дарыць сімвалы года па ўсходніх календарах з выгадай, няцяжка здагадацца, для каго. І вось апошнімі часамі нам нават спрабавалі падкінуць усялякія хэлоўіны да ўсталяваць Дзень закаханых. І калі маскарады з д'ябальскімі атрыбутамі не вельмі прыжыліся ў нашых мясцінах, то паштоўкі-сардэчкі паспяхова прадаюцца, асабліва ў асяродку школьнікаў. Бо кожнае свята — гэта перш за ўсё свята гандляроў і вытворцаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Аляксандр ЖУК:

«ЗА СПІСВАННЕ НА СЕСІІ БУДЗЕМ ЖОРСТКА КАРАЦЬ СТУДЭНТАЎ...»

САМЫМ рашучым чынам збіраюцца змагацца ў галоўным адукацыйным ведамстве нашай краіны са спісваннем студэнтаў на экзаменах. А завочнай форме навучання ў Міністэрстве адукацыі плануюць вярнуць першапачатковы сэнс. Плюс ёсць намер істотна скараціць колькасць студэнтаў, якія атрымліваюць вышэйшую адукацыю завочна.

Як паведаміў на калегіі свайго ведамства першы **намеснік міністра адукацыі нашай краіны Аляксандр ЖУК**, неабходна прымаць дадатковыя меры па павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у ВНУ, якая не заўсёды задавальняе працадаўцаў.

— Патрабуе ўдасканалення арганізацыя экзаменацыйнага ацэньвання ведаў і навыкаў студэнтаў. Асобнае пытанне — спісванне студэнтаў на экзаменах. З гэтым трэба рашучым чынам змагацца — так, як гэта робіцца ва ўсім свеце, — падкрэсліў Аляксандр Жук. — Спісванне падчас атэстацыйных экзаменацыйных мерапрыемстваў трэба разглядаць як грубае парушэнне правілаў унутранага распарадку ці як дысцыплінарны праступак, а парушальніка, у адпаведнасці з Кодэксам аб адукацыі, трэба прыцягваць да дысцыплінарнага пакарання — аж да адлічэння.

На думку Аляксандра Жука, у апошнія гады завочная форма навучання набыла гіпертрафіраваныя маштабы, асабліва ў прыватных ВНУ. Адсутнасць добра арганізаванага вучэбнага працэсу і кантролю, у тым ліку і бягучага, аўтаматычна робіць завочную форму атрымання адукацыі менш эфектыўнай, чым дзённая. Гэта пацвярджае і апошняя інфармацыя Дэпартамента кантролю якасці адукацыі, які займаўся вывучэннем узроўню падрыхтоўкі спецыялістаў на завочнай форме навучання. Былі, у прыватнасці, праведзеныя кантрольныя зрэзы рэшткавых ведаў у студэнтаў 5-6 курсаў найбольш папулярных сярод моладзі спецыяльнасцяў — «Эканоміка» і «Правазнаўства».

Комплексныя тэставыя заданні ўключалі 20 пытанняў і былі разлічаны на ацэньванне мінімальнага ўзроўню ведаў па асноўных прадметах. Крытэрый выканання тэста быў на ўзроўні 60 працэнтаў (12 і больш правільных адказаў). Па выніках тэстаў высветлілася, што станоўчыя адзнакі змаглі атрымаць толькі 43 працэнты тэстуемых (яны далі 12 і больш правільных адказаў), а на «Правазнаўстве» і ўвогуле толькі 20 працэнтаў. Лепшыя вынікі былі атрыманы ў тых выпадках, калі студэнты-завочнікі мелі профільную сярэднюю спецыяльную адукацыю. Напрыклад, па спецыяльнасці «Бухулік, аналіз і аўдыт» 75 працэнтаў тэстуемых студэнтаў мелі профільную сярэднюю спецыяльную адукацыю. Напэўна, таму і станоўчы вынік на тэсціраванні прадэманстравалі да 85 працэнтаў удзельнікаў (у сярэднім — 70 працэнтаў). А самыя горшыя вынікі былі ў студэнтаў-завочнікаў, якія на момант свайго паступлення былі выпускнікамі школ.

«У якасці заахвочвальнай меры можа выступаць вызваленне ад службы ў арміі маладых педагогаў пры ўмове адпрацоўкі імі па прафесіі да заканчэння тэрміну прызыўнога ўзросту»

— Мяркую, што гэтыя вынікі гавораць самі за сябе, — дадаў Аляксандр Жук. — Лічу, што трэба вярнуць першапачатковы сэнс завочнай форме навучання, як навучанню без адрыву ад вытворчасці з мэтай павышэння кваліфікацыі ці атрымання новай спецыяльнасці. Як правіла, на завочную форму павінны паступаць асобы, занятыя працоўнай дзейнасцю. Па-другое, павінны захоўвацца разумныя прапорцыі — колькасць завочнікаў не павінна перавышаць 30-40 працэнтаў ад агульнай колькасці студэнтаў канкрэтнай ВНУ.

Мы будзем уважліва адсочваць і карэктаваць лічбы прыёму ў ВНУ, у тым ліку і ў разрэзе спецыяльнасцяў. Сёння нам неабходна даць грамадству, абітурыентам і іх бацькам дадатковыя сігналы аб найбольш запатрабаваных і перспектыўных спецыяльнасцях, звязаных з прыярытэтнымі напрамкамі развіцця эканомікі (інжынерна-тэхнічных, тэхналагічных, прыродазнаўча-навуковых спецыяльнасцях і спецыяльнасцях для ІТ-галіны). Трэба больш актыўна ўдзельнічаць у фарміраванні адукацыйных запытаў нашых грамадзян, акуратна змяншаючы платную падрыхтоўку па незапатрабаваных у цяперашніх аб'ёмах падрыхтоўкі спецыяльнасцях.

За пяцігодку колькасць выпускнікоў агульнаадукацыйных школ зменшыцца амаль удвая (са 100 тысяч у 2008 годзе да 54 тысяч у 2015 годзе). А,значыць, узрасце рэальная канкурэнцыя паміж ВНУ, ССНУ і прафесійна-тэхнічнымі навучальнымі ўстановамі.

ЗА ХАБАР ВЫКЛАДЧЫКУ — АДЛІЧЭННЕ СА СТУДЭНТАЎ

Яшчэ адна балючая праблема, на якой засяродзіў увагу Аляксандр Жук, гэта выкананне антыкарупцыйнага заканадаўства. Станоўчым момантам першы намеснік міністра адукацыі лічыць адсутнасць сур'ёзных правапарушэнняў падчас уступнай кампаніі, што звязана, безумоўна, з укараненнем сістэмы цэнтралізаванага тэсціравання. У той жа час летась у сістэме адукацыі былі выяўлены 399 злачынстваў, што на 200 фактаў больш, чым годам раней. Асноўную ўдзельную вагу ў структуры карупцыйных злачынстваў займаюць хабарніцтва (308 фактаў) і крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі (49).

«У Гомельскім дзяржаўным дарожна-будаўнічым каледжы дзейнічала цэлая сістэма збору грашовых сродкаў за станоўчае рашэнне пытанняў здачы экзаменаў — установлена 230 (!) выпадкаў».

Непасрэдна ва ўстановах, падпарадкаваных Міністэрству адукацыі, зарэгістравана 289 злачынстваў, здзейсненых 61 работнікам (у 2009 годзе — на 48 работнікаў 120 злачынстваў). Ва ўстановах, падпарадкаваных мясцовым органам кіравання адукацыяй, зарэгістравана 46 карупцыйных злачынстваў — на 13 больш.

— На жаль, па-ранейшаму маюць месца факты пабораў з боку кіраўнікоў дашкольных устаноў пад рознымі надуманымі прычынамі, — паведаміў Аляксандр Жук. — Так, было заведзена 5 крымінальных спраў у дачыненні да загадчыцы ясляў-сада № 7 Мінска, якая атрымлівала незаконныя грашовыя ўзнагароджанні ад бацькоў за залічэнне іх дзяцей у дашкольную ўстанову. З 289 злачынстваў, здзейсненых у падпарадкаваных нам установах, 276 выпадкаў — гэта выпадкі хабару.

Аляксандр Жук расказаў, як на працягу некалькіх гадоў у Гомельскім дзяржаўным дарожна-будаўнічым каледжы дзейнічала наладжаная адным з выкладчыкаў сістэма збору грашовых сродкаў з навучэнцаў за станоўчае рашэнне пытанняў здачы экзаменаў (установлена 230 (!) выпадкаў). У Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны было заведзена 20 крымінальных спраў у адносінах да асістэнта кафедры эканамічнай кібернетыкі, які атрымліваў ад студэнтаў хабар за здачу залікаў. Аналагічныя выпадкі мелі месца і ў БНТУ. Фактычна галоўнай «зонай рызыкі» сталі экзаменацыйныя сесіі...

— Я хацеў бы нагадаць, што кожны кіраўнік нясе персанальную адказнасць за выкананне антыкарупцыйнага заканадаўства, — дадаў Аляксандр Жук. — Лічым неабходным ужо падчас будучай летняй сесіі перагледзець арганізацыю і правядзенне экзаменаў, больш актыўна звяртацца да стварэння камісій для прыняцця ў студэнтаў экзаменаў, а таксама праводзіць экзамены пераважна ў пісьмовай форме. Трэба ўнесці таксама ва ўстаноўленым парадку прапановы для перагляду заканадаўства ў плане ўзмацнення адказнасці тых, хто дае хабар. Справа ў тым, што ў шэрагу выпадкаў у адпаведнасці з дзейным заканадаўствам мы не можам прымяніць меры дысцыплінарнай адказнасці да навучэнцаў, якія даюць выкладчыкам хабар, і выключыць іх з кола студэнтаў.

ЛЕПШ РАБОТА Ў ШКОЛЕ, ЧЫМ СЛУЖБА Ў АРМІІ

Асобна першы намеснік міністра адукацыі спыніўся ў сваім выступленні на сацыяльным статусе педагагічных работнікаў. Прынятыя апошнім часам меры па ўдасканаленні аплаты працы работнікаў галіны з'яўляюцца, на думку Аляксандра Жука, недастатковымі. Гэта тычыцца катэгорый педагагічных работнікаў, якія не маюць вучонай ступені і вучонага звання: старшых выкладчыкаў, асістэнтаў, выкладчыкаў, выкладчыкаў-стажораў. Між іншым, колькасць такіх работнікаў складае 53 працэнты ад прафесарска-выкладчыцкага саставу — больш як 12 тысяч чалавек. Нізкімі застаюцца таксама заробкі ў педагагічных работнікаў дашкольных і пазашкольных устаноў адукацыі.

— Мы лічым, што трэба распрацаваць і ўнесці на разгляд ва ўрад комплекс мер па павышэнні сацыяльнага статусу педагогаў і прэстыжу педагагічнай прафесіі. У якасці заахвочвальнай меры можа выступаць, напрыклад, вызваленне ад службы ў арміі маладых педагогаў пры ўмове адпрацоўкі імі па прафесіі да заканчэння тэрміну прызыўнога ўзросту, — дадаў Аляксандр Жук. — Сёння 85 працэнтаў педагогаў у школах складаюць жанчыны. Гэта можа быць ільготная чарга на атрыманне жылля, ільготнае крэдытаванне яго будаўніцтва і іншыя меры сацыяльнай падтрымкі педагогаў. Для педагогаў, якія працуюць у дашкольных установах, гэта таксама зніжэнне працягласці рабочага часу выхавальніка да 25 гадзін у тыдзень і павелічэнне працягласці іх адпачынкаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Шык-шок

СПАДНІЦА МАКСІ ПЛЮС СВІТЭР

Здаецца, у гэтым сезоне дызайнеры задумаліся пра жыхароў паўночных краін, інакш чым растлумачыць іх захапленне вязанымі рэчамі? Доўгія спадніцы, якія развіваюцца, і шчыльныя світэры дапамогуць вам стварыць чуллівы і адначасова наіўны вобраз. Лепш за ўсё спалучаць максі-спадніцы са світэрамі буйной вязкі, аднак падыдуць і лёгкія джэмперы, і вадалазкі.

СВАБОДНЫ СТЫЛЬ

Побач з модай на зацягнутыя таліі і пышныя спадніцы ў гэтым сезоне ў трэндзе свабоднае адзенне, якое хавае выгібы вашага цела. Задаючы такі трэнд, дызайнеры быццам бы ведалі, што многім знакамітасцям прыйдзецца хаваць свае формы, якія прыкметна акругліліся. Ён яўна прыйдзецца даспадобы і тым, хто за зіму набраў пару лішніх кілаграмаў. Так што апранаем понча, сукенкі-распашонкі, «світэры бойфрэнда», свабодныя камбінезоны і больш не баімся быць не стыльнай.

НАМІНАЛЬНАЕ АДЗЕННЕ

Каб крыху агаліцца гэтай зімой, зусім не абавязкова распранацца. Звярніце ўвагу на топы і блузы з празрыстага шоўку, якія ў гэтым сезоне настойліва рэкамендуюць дызайнеры. Трэнд не згубіць сваёй актуальнасці і вясной. Паўпразрыстае адзенне з прынтам не такое адкрытае, а самым смелым трэба выбраць аднатонныя рэчы, а яшчэ лепш — чорныя. Наўрад ці хтосьці здолее ўстаяць.

УНІФОРМА

Дызайнеры ў гэтым сезоне прапаведуюць форменны стыль у адзенні. Мілітары — не адзіная ўніформа, якую вы можаце выкарыстаць. Вобразы школьніцы і пакаёўкі становяцца ўсё больш папулярнымі. Шматслойны накладны каўнерык, расклёшаныя і плісіраваныя спадніцы, бабачкі і свабодна завязаныя гальштукі любой формы зробяць ваш вобраз афіцыйным, але ў той жа час вытанчаным і элегантным. Пад строгія сукенкі можна апрануць кашулю ці спалучаць іх з накладнымі манжэтамі і каўняром. Імідж лепш за ўсё дапоўніць лоўферамі, рукзаком і мінімалістычнымі ўпрыгажэннямі.

ТОНКІЯ ЛІНІІ

З вяртаннем рэтра-стыля, як адной з галоўных тэндэнцый цяперашняга сезону, у моду ўвайшлі тонкія раменьчыкі, якія робяць акцэнты на таліі. Свабодны світэр з тонкім вузкім рэменем — адно з ключавых спалучэнняў у гэтым сезоне. Хоць нікалькі не горш ён выглядае з кардыганамі, сукенкамі, штанамі з высокай пасадкай і касцюмамі, у строгасць якіх тонкі рэмень уносіць адценне жаноцкасці і элегантнасці. Вузкі рэмень выдатны і тым, што яго можна не толькі элегантна зашпіліць, але і нядбайна завязаць на вузел.

ПРОСТА АБ СКЛАДАНЫМ

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі ў пытаннях і адказах

Навошта патрэбен нашай краіне Кодэкс аб адукацыі і што ўяўляе сабой гэты дакумент?

Кодэкс — гэта істотна дапоўнены звод дакументаў аб адукацыі, якія былі прынятыя ў нашай рэспубліцы раней. Яго распрацоўка дазволіла завяршыць працэс фарміравання заканадаўства аб адукацыі як поўнай і лагічна паслядоўнай сістэмы. Бо, як гэта ні дзіўна, але ж у нас да гэтага часу не было законаў, па якіх працавалі б узроўні дашкольнай, сярэдняй спецыяльнай адукацыі, дадатковая адукацыя дзяцей і дарослых. Зараз у Кодэксе іх дзейнасць падрабязна апісваецца. Змест Кодэкса не прадугледжвае нейкіх рэвалюцыйных змен у дзейным заканадаўстве. Тым больш што рэформ у апошнія часы ў адукацыйнай сферы было шмат, і людзі іх ужо не хочуць. Таму адна з асноўных задач, якія вырашаюцца з дапамогай Кодэкса, — забяспечыць стабільнасць нацыянальнай сістэмы адукацыі.

Разам з тым, Кодэкс арыентаваны ў будучыню. Яго прававыя нормы накіраваныя на павышэнне якасці адукацыі, далейшае ўмацаванне прэстыжу беларускай адукацыі на сусветным узроўні. І што вельмі значна — Кодэкс арганічна ўпісваецца ў сярэднетэрміновыя і доўгатэрміновыя планы сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай дзяржавы.

Дакумент структурна складаецца з Агульнай і Асаблівай частак і ўключае 17 раздзелаў, 63 главы і 295 артыкулаў. Яго аб'ём — 352 старонкі.

У Агульную частку ўключаны артыкулы, у якіх тлумачацца агульныя для ўсіх узроўняў адукацыі пытанні. У прыватнасці: раскрываюцца правы і абавязкі вучняў і студэнтаў, іх бацькоў, настаўнікаў; дадзены поўны пералік дагавораў у сістэме адукацыі; прыведзены патрабаванні да адукацыйнага працэсу пры ўмове забеспячэння яго якасці; уводзіцца дысцыплінарная адказнасць навучэнцаў; паказаны спосабы фінансавання і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння сістэмы адукацыі.

Змест Асаблівай часткі ўключае раздзелы, якія забяспечваюць прававое рэгуляванне сістэм дашкольнай, агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, адукацыі пасля ВНУ, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, дадатковай адукацыі дарослых, спецыяльнай адукацыі, падтрымкі асобных катэгорый дзяцей.

Як можна будзе атрымаць адукацыю ў нашай краіне?

Згодна з Кодэксам, дзяржаўная палітыка ў галіне адукацыі грунтуецца на прынцыпах прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцяў, правоў чалавека, гуманістычнага характару адукацыі; забеспячэння роўнай даступнасці да атрымання адукацыі; падтрымкі і развіцця адукацыі з улікам задач сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы; дзяржаўна-грамадскага характару кіравання; свецкага характару адукацыі.

У Рэспубліцы Беларусь кожны (і беларус, і замежнік) будзе мець права на адукацыю. Для рэалізацыі гэтага права забяспечваецца развіццё сеткі ўстаноў адукацыі, захаванне бюджэтнага фінансавання, удасканаленне сістэмы крэдытавання грамадзян, якія ўпершыню атрымліваюць адукацыю.

З улікам новага прынцыпу ў адукацыі, а менавіта: «Адукацыя праз усё жыццё», мы павінны пастаянна вучыцца, не толькі маладымі, але і дарослымі. Таму, згодна з Кодэксам, у нашай краіне будуць ажыццяўляцца праграмы падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі, у тым ліку ў саміх арганізацыях; будуць праводзіцца вучэбныя курсы (лекторыі, тэматычныя семінары, трэнінгі, практыкумы і іншае), адукацыйныя праграмы ўдасканалення магчымасцяў і здольнасцяў асобы. Прычым вучыцца можна будзе як ва ўстановах, так і не выходзячы з дому.

Адукацыя ў нашай краіне ўжо даступная кожнаму. Прыклад таму — стварэнне сістэмы спецыяльнай адукацыі. Асобы з асаблівасцямі ў фізічным і псіхічным развіцці прызнаюцца здольнымі да вучобы, а сістэма спецыяльнай адукацыі будзе спрыяць іх падрыхтоўцы да працоўнай дзейнасці, сямейнага жыцця, сацыялізацыі і інтэграцыі ў грамадства. Таму ў Кодэкс практычна без змен перайшлі нормы дзейнага Закона «Аб адукацыі асоб з асаблівасцямі ў псіхафізічным развіцці», у свой час прызнанага замежнымі экспертамі адным з лепшых на еўрапейскай прасторы.

Як і асаблівым дзецям, падтрымка з боку дзяржавы будзе аказвацца дзецям, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай працы; тым, хто мае патрэбу ў аздараўленні; дзецям, якія знаходзяцца ў сацыяльна-небяспечным становішчы; тым, хто мае патрэбу ў спецыяльных умовах выхавання. Яны таксама па-свойму ўнікальныя і патрабуюць асаблівага клопату з боку дзяржавы. Таму цэлы раздзел Кодэкса прысвечаны вырашэнню гэтых праблем.

Такім чынам, Кодэкс ахоплівае прававымі нормамі ўсю сістэму адукацыі (ад дашкольнай да адукацыі дарослых) і дае магчымасць атрымаць адукацыю любога ўзроўню кожнаму жыхару, незалежна ад яго ўзросту, жыццёвай сітуацыі, сацыяльнага статусу, здароўя, заробку, месца жыхарства. Умовы створаны ўсім: вясковым і гарадскім, маладым і ў гадах, здаровым і з асаблівасцямі. У гэтым дакументе захаваны лепшыя здабыткі беларускай адукацыі (нацыянальныя рысы, дзяржаўная падтрымка, даступнасць, бясплатнасць, справядлівасць пры паступленні на вучобу, стабільнасць функцыянавання, улік сацыяльна-эканамічных умоў).

На якой мове можна будзе атрымаць адукацыю?

З улікам таго, што ў нашай рэспубліцы дзяржаўнымі мовамі з'яўляюцца беларуская і руская мовы, у Кодэксе дэкларуецца іх роўнасць у адукацыі. Дзяржава гарантуе грамадзянам права выбару навучання і выхавання на адной з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь і стварае ўмовы для рэалізацыі гэтага права. Мова навучання і выхавання вызначаецца заснавальнікам з улікам пажаданняў навучэнцаў або іх бацькоў.

Пры атрыманні прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі вывучэнне беларускай мовы з'яўляецца абавязковым.

Па жаданні навучэнцаў або іх бацькоў могуць стварацца групы, класы, дзіцячыя садкі, школы, у якіх навучанне і выхаванне ажыццяўляюцца на мове нацыянальнай меншасці або вывучаецца мова нацыянальнай меншасці.

Абавязковая для вывучэння замежная мова вызначаецца заснавальнікам з улікам патрэб дзяржавы і магчымасцяў установы адукацыі.

Больш за тое, пры наяўнасці ўмоў (перш за ўсё наяўнасці выкладчыкаў, здольных свабодна тлумачыць матэрыял на замежнай мове) вучыцца можна будзе не толькі на беларускай ці рускай, але і на любой іншай мове. Напрыклад, засвоіць спецыяльнасць на англійскай, іспанскай ці кітайскай. Гэта дазволіць нашым выпускнікам стаць больш запатрабаванымі не толькі на ўнутраным, але і на міжнародным рынку працы. Акрамя таго, пры такой арганізацыі навучання магчыма павышэнне інтарэсу да беларускіх ВНУ сярод замежных абітурыентаў.

Ці атрымаюць магчымасць ВНУ замежных краін працаваць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь?

Заснавальнікамі не толькі ВНУ, але любых устаноў адукацыі могуць стаць замежныя дзяржавы, арганізацыі замежных дзяржаў, міжнародныя арганізацыі, замежныя грамадзяне, асобы без грамадзянства, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

Адукацыя ўключае ў сябе навучанне і выхаванне. Аднак да гэтага часу выхаваўчы бок адукацыі заставаўся як бы другасным. Ці вырашыў Кодэкс гэтую праблему?

У Кодэксе ўводзіцца паняцце выхавання, пералічаны яго асноўныя складнікі і іх накіраванасць. Сярод іх: фарміраванне духоўна-маральных каштоўнасцяў, грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці, адказнасці, працавітасці, здаровага ладу жыцця. Выхаванне будзе грунтавацца на агульначалавечых, гуманістычных каштоўнасцях, культурных і духоўных традыцыях беларускага народа, адлюстроўваючы інтарэсы асобы, грамадства і дзяржавы.

Дзяржаўная сістэма адукацыі Рэспублікі Беларусь не павінна праследаваць мэты фарміравання ў навучэнцаў тых ці іншых адносін да рэлігіі. У школе недапушчальна рэлігійнае ці атэістычнае выхаванне ў любых формах. Школе не дадзены правы на прымус вучняў заяўляць аб сваёй прыналежнасці да той ці іншай рэлігіі — гэта асабістая справа кожнага. Аднак рэлігія, з'яўляючыся светапоглядам, — а гэта значыць, сістэмай прынцыпаў, поглядаў, ідэалаў і перакананняў — тлумачыць чалавеку будову сусвету, вызначае яго месца ў гэтым свеце, паказвае яму, у чым сэнс жыцця. Яна дае людзям суцяшэнне, надзею, духоўнае задавальненне, апору. Рэлігія таксама кіруе паводзінамі чалавека праз сваю сістэму каштоўнасцяў, маральных установак і забарон.

У межах узаемадзеяння з Беларускаю праваслаўнаю царквой установамі адукацыі ажыццяўляюцца мерапрыемствы па духоўна-маральным выхаванні, фарміраванні грамадзянскасці, патрыятызму, міласэрднасці, спачування, праводзяцца навуковыя даследаванні, канферэнцыі, семінары, прысвечаныя пытанням вывучэння гісторыі рэлігіі, рэлігійных традыцый. Ажыццяўляецца праца па ўкараненні ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах факультатыўнага курса па пераадоленні ўплыву дэструктыўных сект.

Таму, нягледзячы на тое, што адукацыя ў нашай краіне застаецца свецкай, але згодна з Кодэксам у пытаннях выхавання на аснове пісьмовых заяў навучэнцаў (бацькоў непаўналетніх навучэнцаў) у пазаўрочны час дазваляецца ўзаемадзеянне ўстаноў адукацыі з зарэгістраванымі рэлігійнымі арганізацыямі з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа.

Рэформаў Кодэкс не прадугледжвае, але з яго прыняццем нейкія змены ўсё ж адбудуцца ў нашых школах?

З'явяцца новыя віды школ: кадэцкія вучылішчы, сярэднія школы-вучылішчы алімпійскага рэзерву, гімназіі-інтэрнаты. У кадэцкіх вучылішчах, якія будуць ажыццяўляць падрыхтоўку падлеткаў да службы ў арміі, органах МУС і МНС, навучанне пачнецца з 8 класа, у гімназіях-інтэрнатах для таленавітых дзяцей, якія апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі, — з 5 класа, у сярэдніх школах-вучылішчах алімпійскага рэзерву — з 1 класа. Будуць захаваныя базавыя школы-каледжы мастацтваў, сярэднія школы-каледжы мастацтваў і гімназіі-каледжы мастацтваў, міжшкольныя вучэбна-вытворчыя камбінаты працоўнага навучання і прафарыентацыі, а таксама міжшкольныя цэнтры дапрызыўнай падрыхтоўкі. Ва ўсіх гімназіях будуць працаваць пачатковыя класы.

Афіцыйна замацаваны 11-гадовы перыяд школьнага навучання, пяцідзёнка, 10-бальная шкала ацэньвання ведаў. Прычым дрэнная адзнака ў школе будзе толькі адна — 0, усе астатнія, нават 1 і 2, — станоўчыя.

Вучыць школьнікаў будуць на ўроках, факультатывах, стымулюючых і падтрымліваючых занятках, з дапамогай кансультацый і грамадска-карыснай працы. На павышаным узроўні прадметы будуць вывучацца толькі ў гімназіях, ліцэях, Мінскім суворaўскім вучылішчы. У звычайных школах павышаны ўзровень навучання будзе забяспечвацца з дапамогай факультатываў.

Вучэбныя заняткі па фізкультуры будуць праводзіцца, як правіла, асобна для хлопчыкаў (юнакоў) і дзяўчынак (дзяўчат).

Максімальная напаўняльнасць класаў у звычайных школах і кадэцкіх вучылішчах — да 25, ва ўсіх астатніх — да 20 вучняў. Навучальны год пачынаецца 1 верасня і заканчваецца 31 мая. Летнія канікулы ўстаноўлены не менш за 12 тыдняў, а канікулы на працягу года — не менш за 30 каляндарных дзён.

У 1 клас будуць прымаць тых дзяцей, якім да 1 верасня споўнілася 6 гадоў і больш. Але па жаданні бацькоў дапускаецца прыём дзяцей, якім 6 гадоў споўніцца ў перыяд з 1 верасня па 30 верасня ўключна.

Для захавання невялікіх вясковых школ рашэнне аб іх закрыцці будзе прымацца мясцовымі органамі ўлады на аснове ацэнкі наступстваў такога закрыцця і толькі пасля ўзгаднення з Міністэрствам адукацыі.

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

(Працяг будзе.)

ЧЫМ ЛЕПШ РАЗВІВАЕЦЦА САЦЫЯЛЬНАЯ СФЕРА, ТЫМ МАЦНЕЙШАЙ ВЫГЛЯДАЕ ІДЭАЛОГІЯ

Да выніковай калегіі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Брэсцкага аблвыканкама была арганізавана выстава. Брэсцкія і сталічныя прадпрыемствы паказалі шмат сувенірнай прадукцыі з адпаведнай сімволікай. А яшчэ была добра прадстаўлена айчынная кніга. Літаратура па краязнаўстве, творы пра вядомых людзей, славутасці, прыроду, адметныя мясціны рэгіёна, яшчэ проза, паэзія, дакументалістыка мясцовых аўтараў і шмат іншых духоўных каштоўнасцяў, заключаных у старую добрую форму — кнігу. Удзельнікі выставы сваімі прапановамі нібы падштурхоўвалі ідэалагічных работнікаў: бярыце, прапагандуйце, выхоўвайце.

І ў самым пачатку свайго выступлення **начальнік названага ўпраўлення Аляксандр ЦЫРАЛЬЧУК** выказаў падзяку прадпрыемствам, што ўзялі ўдзел у выставе. Што было ўспрынята, вядома, як заклік да ўсіх ідэолагаў шырэй выкарыстоўваць у паўсядзённай працы такія вось нагляднасці. Яшчэ ідэолагі дамовіліся ў гэтым годзе шмат увагі ўдзяляць працэсу дэмакратызацыі грамадства, усебаковаму развіццю прадпрымальніцкай ініцыятывы. На гэта іх накіраваў у сваім слове **намеснік старшыні аблвыканкама Леанід ЦУПРЫК**.

Не засталося па-за ўвагай вялікага сходу прафесійных ідэолагаў выкарыстанне найноўшых метадаў работы, і найперш, інфармацыйных тэхналогій. Хоць, вядома, традыцыйных спосабаў інфармавання (напрыклад, такіх, як інфармацыйна-прапагандысцкія групы) ніхто не адмяняў. На гэта зрабіла акцэнт у выступленні **першы намеснік начальніка ўпраўлення Таццяна ГАГАКАВА**. Паводле меркавання выступоўцы, такая форма інфармавання насельніцтва мае добры эфект. Ды і наогул жывую гутарку, жывыя стасункі вельмі цяжка нечым замяніць. Тым больш, што, як паказала жыццё, ёсць практычнае значэнне такіх сустрэч ва ўстановах, на заводах, у калгасах. Называліся лічбы, якія выглядаюць унушальна. Колькасць вырашэнняў пытанняў, якія ўзнімаюць людзі на сустрэчы з кіраўнікамі, спецыялістамі розных галін падчас выступлення інфармацыйных груп, набліжаецца ў вобласці да 90%. Гэта ўжо не проста інфармаванне, маніторынг грамадскай думкі, — гэта найлепшы прыклад зваротнай сувязі.

У розных раёнах ёсць прыклады сваіх падыходаў да работы інфармацыйных груп. Некаторыя прывязваюць іх нават да свята вёскі. Галоўнае, каб не ператвараліся такія мерапрыемствы ў банальную палітінфармацыю і быў ад іх толк. А формаў — чым больш, тым лепш.

Але адна справа працаваць з вясковым насельніцтвам, працоўнымі калектывамі, і зусім іншая — уплываць на свядомасць моладзі. Тут сам час патрабуе, каб вялікая частка работы была перанесена ў інтэрнэт. Без сферы інфармацыйных тэхналогій сёння, відаць, не варта нават спрабаваць дастукацца да душ самых юных грамадзян. Цікавае меркаванне нядаўна давялося сустрэць на старонках адной з маскоўскіх газет. Карэспандэнт падзяліўся ўласным назіраннем, што на платах амаль перасталі пісаць славутае слова з трох літар. А гэта адбываецца таму, лічыць аўтар, што спробу самавыражэння гэтыя юнцы перанеслі ў інтэрнэт. Мабыць, і так. А вось накіраваць іх самавыражэнне, часта даволі экстравагантнае, хоць у колькі-небудзь пазітыўнае рэчышча — адна з галоўных сённяшніх задач для ідэолагаў.

Таму нельга не пагадзіцца з Таццянай Гагакавай, на працу ў адпаведныя аддзелы і ўпраўленні павінны прыходзіць людзі таленавітыя, крэатыўныя, добра адукаваныя. Аб праблемах падбору, падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі ідэалагічных кадраў вялася даволі працяглая гаворка. Аказалася, далёка не на кожным прадпрыемстве асобе намесніка кіраўніка па ідэалогіі надаецца належная ўвага. За год набралася прыкладаў, калі раённыя альбо гарадскія выканкамы ўмешваліся і папраўлялі кіраўнікоў, якія на гэтую пасаду бралі людзей, што не падыходзяць ні па адукацыі, ні па арганізатарскіх якасцях. Некаторыя з іх нават маюць хібы ў асабістых паводзінах.

А вось як заахвочваць добрага, ініцыятыўнага работніка, трэба павучыцца ў аддзела ідэалогіі Баранавіцкага гарвыканкама. Менавіта яго **начальнік Таццяна ЖЫТКОВА** ўмее пераконваць сваё кіраўніцтва, калі патрэбна не пашкадаваць нейкую надбаўку да зарплаты за адпаведную работу. Таццяна Мікалаеўна падзялілася досведам работы свайго аддзела, у тым ліку з выкарыстаннем мультымедыйных тэхналогій. І думаецца, калегам было цікава яе паслухаць.

І зноў варта вярнуцца да даклада, які зрабіла Таццяна Гагакава, бо ў ім была закранута адна з важнейшых тэм зместу ідэалагічнай работы. На чым можна пераконваць людзей, як весці за сабой? Перш за ўсё, на рэальных, даступных прыкладах. Паказаць на лічбах і фактах, колькі пабудавана і мадэрнізавана аб'ектаў аховы здароўя, як развіваецца спартыўная база ў любой асобна ўзятай мясцовасці, якія ёсць магчымасці для адукацыі дзяцей, для будаўніцтва жылля, для рэалізацыі ўласнай прадпрымальніцкай ініцыятывы, як расквітнелі аграгарадкі, — найлепшая прапаганда і агітацыя. Такім чынам, чым лепш развіваецца сацыяльная сфера, тым больш моцна і ўпэўнена выглядае ідэалогія краіны. Таксама вядома, павінны быць прафесіяналы, якія сумеюць данесці гэта да свядомасці і душы.

А дастукацца да душы беларуса лепш за ўсё, безумоўна, на яго роднай мове. Шкада, што на вялікім форуме па ідэалогіі прагучала толькі адно выступленне па-беларуску. Зрабіў яго **рэдактар іванаўскай раённай газеты «Чырвоная звязда» Анатоль КРЭЙДЗІЧ**. Ён вельмі цікава распавёў пра творчыя набыткі свайго выдання. Пэўнага аптымізму дадала і адна інфармацыя, што прагучала з трыбуны форума. Па ініцыятыве галоўнага ўпраўлення ідэалогіі аб'яўлены абласны творчы конкурс пісьменніцкіх твораў на роднай мове, прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння слыннага земляка, вядомага паэта Міхася Рудкоўскага. Конкурс названы радком з верша паэта: «Суніцамі пахне Айчына».

Святлана ЯСКЕВІЧ.

П'ЯНАЯ ВЫКЛАДЧЫЦА З РАНІЦЫ «НА КОЛАХ»

У Мінску затрымалі жанчыну, якая ў стане алкагольнага ап'янення везла на машыне дзіця ў садок

32-гадовую парушальніцу, якая працуе выкладчыцай у школе, інспектары ДПС АДАІ Савецкага РУУС на пачатку дзявятай раніцы спынілі на вуліцы Бяды. Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Савецкага РУУС Марыя Дзьякава, «вызначылася» жанчына тым, што кіравала аўтамабілем у стане алкагольнага ап'янення: у яе крыві было знойдзена 1,85 праміле алкаголю (больш як паўбутэлькі гарэлкі). У аўтамабілі, акрамя кіроўцы, знаходзілася і маленькае дзіця, якое жанчына везла ў дзіцячы садок. Паводле слоў парушальніцы, «гарачыцельныя» напоі яна спажывала разам з гасцямі напярэдадні. Як адзначаюць у АДАІ, летась толькі на тэрыторыі Савецкага раёна Мінска было затрымана 40 кіроўцаў-жанчын, якія знаходзіліся за рулём аўтамабіляў «пад градусам».

Ігар ГРЫШЫН.

ДЗЯЦЕЙ ВЫРАТАВАЛА СУСЕДКА

Каб не суседка, трагедыяй мог бы скончыцца пажар у доме 39-гадовай жыхаркі вёскі Глінна Іванаўскага раёна 3 лютага. Гэта ж трэба было так скласціся абставінам, каб стаць чыста хрэстаматыйным прыкладам для тых, хто займаецца праблемнымі сем'ямі... Але аб усім па парадку. Гаспадыня дома пайшла да ўчастковага інспектара міліцыі, каб паскардзіцца на беспрабуднае п'янства сужыцеля і папрасіць парады. А на год маладзейшы сужыцель тым часам лёг адпачываць нападпітку і па звычцы закурыў. Гэта было а палове трэцяй дня. Калі чалавек задрамаў, а цыгарэта ўпала з рук, загарэлася пасцель, іншыя рэчы. Двое старэйшых дзяцей былі ў школе, малыя хлопчык і дзяўчынка заставаліся дома.

Дым заўважыла суседка Святлана Прус. Яна кінулася ў хату, найперш вывела дзяцей, а затым і гора-курца. Яна ж выклікала і пажарных. Калі прыехалі машыны, палала ўжо на даху. Як расказаў карэспандэнту «Звязды» памочнік начальніка Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей МАШНОЎ, пажар утаймавалі за 14 хвілін. Але жыллё шматдзетнай маці значна пацярпела. Выратавальнікі высветлілі і такі факт: у доме быў установлены пажарны апавяшчальнік з вывадам сігналу на фасад дома, але «гаспадар» яго адключыў.

Цяпер адзіная законная гаспадыня дома павінна давеку быць удзячнай пільнай і бясстрашнай суседцы, а пра мэтазгоднасць далейшага знаходжання побач сужыцеля ёсць сэнс падумаць.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ГАСТРАЛЁРЫ З ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

Як паведамілі ў аддзеле інфармацыі УУС Брэсцкага аблвыканкама, у вобласці затрымана група цыганоў з Гомельшчыны, якія гастралявалі па Брэстчыне і абіралі людзей.

Да жыхаркі в. Волавень Драгічынскага раёна зайшла цыганка, прапанавала купіць куртку і тут жа заявіла, што бачыць у хаце сурокі, а калі іх тут жа не зняць, то бяды не пазбегнуць.

Гаспадыня, маці дваіх дзяцей (мужа дома не было), зняла з сябе залатыя завушніцы з пярсцёнкамі і перадала цыганцы. Тая нешта пашаптала і з'ехала разам з памагатымі, што сядзелі ў «Жыгулях». Толькі вечарам жанчына спахапілася і заявіла ў міліцыю. Супрацоўнікі Драгічынскага РАУС праявілі аператыўнасць і неўзабаве выйшлі на адзін з дамоў у в. Заплессе, якая знаходзіцца на мяжы з Іванаўскім раёнам, — там гастралёры заначавалі. Вось тут і затрымалі 45-гадовую жыхарку Калінкавічаў, якая ўжо паспела надзець пярсцёнкі пацярпелай на свае пальцы.

Установлена, што гомельскія гастралёры «вандравалі» па Брэстчыне некалькі сутак і іх ужо затрымлівалі супрацоўнікі ДАІ за парушэнне правілаў руху на тэрыторыі Баранавіцкага і Ганцавіцкага раёнаў. Ёсць падазрэнне, што ад ашуканцаў пацярпелі і іншыя жыхары вобласці, таму пацярпелым неабходна звярнуцца ў бліжэйшы райаддзел міліцыі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Свая справа

ДОБРАЯ ЛАЗНЯ

У аграгарадку «Добрая» Горацкага раёна адчынілася прыватная лазня, якая, як чакаецца, будзе толькі адным з аб'ектаў сельскай зоны адпачынку.

Уладзімір ЗУБАРАЎ: «Мы хочам прыцягнуць людзей добрымі паслугамі і сельскай утульнасцю».

Сімпатычная і сучасная лазня ўжо прымае кліентаў: драўляная парылка, душ і басейн з падсветкай, які чысцяць водным пыласосам і накрываюць спецыяльнай плёнкай. Усё чыста і акуратна. Тут жа на сцяне — настойлівая просьба да наведвальнікаў не курыць і не піць алкагольныя напоі.

— Людзі задаволеныя нашай лазняй, яна ім падабаецца, — з такімі словамі вядуць гасцей на экскурсію ў цёплую парылку.

У суседнім памяшканні працуюць будаўнікі: там будзе пакой для адпачынку з канапамі, тэлевізарам і більярдам. На вуліцы ўвесну ўсталююць барбекю, а ў мансардзе з'явяцца пакоі для вандроўнікаў. Усё робіцца з дрэва, у народным стылі: гарадскі «хай-тэк», лічаць уладальнікі, не пасуе для расслабленага сельскага адпачынку.

Гаспадаром лазні з'яўляецца ТДА «Альфа-Зэт» з раённага цэнтра Горкі. «Альфа-Зэт» — гэта два прадпрымальныя мужчыны: Уладзімір Зубараў і Аляксей Анфімаў. Аляксей — спецыяліст у справе будаўніцтва, Уладзімір мае вопыт у камерцыі. Пазнаёміліся будучыя партнёры, дарэчы, недзе ў лазні, і цяпер іх сумесная фірма паспяхова займаецца будаўніцтвам. А працуе ў ёй прыкладна сотня чалавек.

Будынак на пагорку і за саветамі быў лазняй: вось толькі два дзясяткі гадоў прастаяў без вокнаў і дзвярэй. Дах урэшце праваліўся, сцены падмерзлі і пайшлі расколінамі, а таму дом аддалі прадпрымальнікам за сімвалічныя грошы (1 базавую велічыню) і дадатковае патрабаванне адкрыць за некалькі месяцаў лазню для народа.

Так і атрымалася. Праўда, сам будынак звонку пакуль не мае належнага выгляду: будаўнікі чакаюць цёплых дзён, каб аздабленне было не толькі прыгожым, але і даўгавечным.

У новай лазні створаны два сталыя працоўныя месцы: касіра-адміністратара і апальшчыка. Установа працуе два дні на тыдзень: у пятніцу — жаночы дзень, у суботу — мужчынскі. Білет каштуе 7 тысяч рублёў. Цана, гавораць прадпрымальнікі, у тры разы меншая, чым павінна быць паводле разлікаў.

На новую лазню прыватнікі ўжо выдаткавалі каля паўмільярда рублёў. Рэканструкцыю будынка фірма рабіла ўласнымі сіламі, але аднойчы давялося пачынаць усё нанова: падвялі старыя інжынерныя сеткі, і трэба было зрабіць новы водаправад.

Калі ўлічыць, што пакуль у лепшым выпадку лазню наведваюць два дзясяткі мясцовых жыхароў, то перспектыва хоць бы кампенсаваць выдаткі пакуль застаецца цьмянай. Аднак прадпрымальнікаў гэта зусім не засмучае: у іх вялікія планы!

У «Добрай» — надзвычай маляўнічыя мясціны, а ў нізіне паблізу лазні месціцца Сухараўскі вадаём. Гэта вялікае возера ТДА «Альфа-Зэт» ужо ўзяла ў арэнду і запусціла туды карпа, таўсталобіка і амура. Цяпер прадпрымальнікі дамагаюцца, каб ім выдзелілі 2,5 гектара зямлі навокал возера і каб у «Добрай» з'явілася свая зона адпачынку. Яны плануюць зрабіць добраўпарадкаваны пляж і ўсталяваць пірс, арганізаваць сучасныя забавы для цёплага сезона і пабудаваць некалькі дамкоў для турыстаў. Ад раённага цэнтра да «Добрай» — толькі 9 кіламетраў, месціцца аграгарадок побач з асноўнай аўтатрасай, таму ёсць усе перадумовы для таго, каб гэта месца стала папулярным.

— Мы хочам прыцягнуць людзей добрымі паслугамі і сельскай утульнасцю, — расказвае Уладзімір Зубараў. — Мяркуем рабіць цікавыя вечарыны і ладзіць святы. Ныраць у палонку на Вадохрышча і скакаць праз вогнішча на Купалле.

Вядома ж, наўрад ці сама лазня дасць узбагацець прыватнікам, якія прыйшлі ў Добрую, але зарабіць на развіцці зоны адпачынку — напэўна, так. Будаўнікі сёння вельмі запатрабаваныя, хапае працы і ў горацкай «Альфа-Зэт». Але ўсё ж прыватнікі вырашылі пашырыць сваю справу менавіта на вёску: не таму, што ў горадзе стала цесна, а таму, што захацелася мець нешта сваё, што было б патрэбна людзям і дзе маглі б адпачываць свае працаўнікі і іх сем'і.

— Мы ў свой час рызыкнулі пайсці на сяло, але не шкадуем, хоць праблем у нас дастаткова і на сённяшні дзень, — прызнае Уладзімір. — Адна з іх, не буду ўтойваць, гэта стаўленне да нас мясцовага насельніцтва. Не ўсяго, але групы людзей, якія незадаволены нашымі планамі.

Падазрэнні ў некаторых вяскоўцаў перш за ўсё ўзнікаюць у сувязі з арэндай возера. Маўляў, раней мы тут што хацелі — тое рабілі, а цяпер, відаць, давядзецца плаціць грошы.

— Вядома, нейкія паслугі будуць платнымі, але для мясцовых людзей пляж і адпачынак на возеры ёсць і будуць бясплатнымі, на астатняе — значныя скідкі, — абяцае прыватнік. — Акрамя гэтага, з'явяцца новыя працоўныя месцы: для абслугоўвання зоны адпачынку патрэбны працоўныя рукі, і аддаваць прыярытэт мы будзем мясцоваму насельніцтву.

Уладзімір Зубараў перакананы, што ў будучым горацкім прыватнікам удасца наладзіць нармальныя адносіны з сялянамі з «Добрай». Яны гатовы дапамагаць мясцовай школе — арганізаваць пляж для летняга школьнага лагера, не гаворачы ўжо пра тое, што ўсе паслугі для малых і дашкольнікаў бясплатныя.

— Мы ведаем, што з падобным сутыкнуліся і іншыя прыватнікі, якія пад развіццё сельскага аграэкатурызму ўзялі ў арэнду вадаёмы і спрабуюць наладзіць сваю справу ў вёсках, — гаворыць гаспадар сельскай лазні. — Але людзі ўрэшце зразумеюць, што гэта робіцца таксама для іх саміх і іх дзяцей.

Уладзімір Зубараў даў такую параду прадпрымальнікам, якія рушаць са сваімі праектамі на сяло: «Наперад і не адступаць!»

Ілона ІВАНОВА, фота аўтара.

Горацкі раён.

РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ВЫРАЗИ, ЧТО НАКОПИЛОСЬ!»

Сведения об организаторе:
ИП «Паблисис Диалог», далее «Организатор», 220000, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Короля, д. 51, этаж 7, помещ. 14*, УНП 191123386, свидетельство о регистрации № 191123386 от 07 сентября 2009, выдано Минским городским исполнительным комитетом.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 1832. Выдано Министерством торговли Республики Беларусь 16 декабря 2010 г.

Срок и территория проведения рекламной игры:
Рекламная игра проходит с 15.12.2010 г. по 07.02.2011 г. включительно на территории Республики Беларусь.

Количество участников рекламной игры: 68.

Результаты проведения розыгрыша призового фонда рекламной игры.
Обладателями жесткого диска HP Simple-Save External Harddrive 2 TB стали:
1. Латушко Денис Иванович
2. Станкевич Виталий Викторович
3. Ровнейко Валентина Трофимовна
4. Малиновский Андрей Геннадьевич
5. Счеснович Виктория Васильевна

Обладателями жесткого диска HP Simple-Save External Harddrive 1 TB стали:
6. Хацкова Анастасия Сергеевна
7. Корнеев Михаил Викторович
8. Навикевич Галина Николаевна
9. Авчинникова Тамара Васильевна
10. Чарковская Инна Александровна
11. Цалко Ирина Петровна
12. Бочук Александр Сергеевич
13. Тихонов Алексей Романович
14. Воеводская Марина Фёдоровна
15. Третяк Оксана Ивановна

Обладателями жесткого диска HP Simple-Save Portable Harddrive 500 GB стали:
16. Николаев Павел Олегович
17. Герасименко Михаил Иванович
18. Лукьянович Дмитрий Георгиевич
19. Башков Анатолий Геннадьевич
20. Логвин Николай Леонидович
21. Неелов Янка Владимирович
22. Белорусов Юрий Михайлович
23. Ванюшин Виталий Владимирович
24. Земляник Дмитрий Васильевич
25. Грибов Андрей Викторович
26. Рысевец Марина Степановна
27. Даниленко Максим Андреевич
28. Воловодова Ирина Владимировна
29. Змитрович Сергей Петрович
30. Тарулина Елена Григорьевна
31. Ильинчик Ирина Владимировна
32. Нашницкий Виктор Александрович
33. Савчук Татьяна Васильевна
34. Кухарчук Юлия Викторовна
35. Шумилин Алексей Вячеславович

Обладателями жесткого диска HP Simple-Save Portable Harddrive 320 GB стали:
36. Кременевский Дмитрий Николаевич
37. Таратайкин Алексей Геннадьевич
38. Мармыш Сергей Викторович
39. Демицкая Виктория Михайловна
40. Лапичкова Елена Александровна
41. Антонова Анастасия Игоревна
42. Соловей Максим Анатольевич
43. Нелепко Денис Александрович
44. Калачева Ольга Александровна
45. Пташук Виталий Александрович
46. Кофанова Ирина Сергеевна
47. Канин Руслан Владимирович
48. Гончарова Наталья Михайловна
49. Запольская Юлия Валерьевна
50. Митраков Олег Юрьевич

Призовой фонд разыгран полностью.

По вопросам проведения рекламной игры просим обращаться по телефону: (017) 289 10 09.

** Адрес на дату публикации результатов проведения рекламной игры – 220030, г. Минск, ул. Немига, д.5, 5 этаж, часть офисного помещения, № 2б.*

Чыгунка чакае прыбыцця швейцарскага «першынца»

ПЕРШЫ электрацягнік швейцарскай вытворчасці для новага фармату пасажырскіх перавозак Беларускай чыгункі ўжо знаходзіцца на шляху ў нашу краіну. Чакаецца, што 7 лютага ён будзе дастаўлены ў Брэст. Адтуль электрацягнік накіруецца да чыгуначных пуцей станцыі «Баранавічы-Цэнтральныя», дзе састаў «Гарадскіх ліній» паставяць з дапамогай кранаў на цялежкі.

Нагадаем, што ў Еўропе чыгуначная каляіна мае іншую шырыню, таму першы швейцарскі электрацягнік дабіраецца ў Беларусь на шасці велізарных грузавіках. Даўжыня кожнага з іх складае 34 метры, а вышыня — амаль 5 метраў. Чатыры аўтамабілі вязуць вагоны, яшчэ два — цялежкі.

У лакаматыўным дэпо Баранавічаў састаў пройдзе перадэксплуатацыйную перападрыхтоўку, пасля якой ён будзе адпраўлены ў сталіцу. Для швейцарскіх цягнікоў тут ужо рэканструяваны і аснашчаны сучасным абсталяваннем спецыяльны цэх на тэрыторыі маторавагоннага дэпо. Як паведамілі ў прэс-службе Беларускай чыгункі, некалькі нашых спецыялістаў ужо прайшлі двухмесячную стажыроўку на заводзе-вытворцы ў Швейцарыі. На наступным тыдні на навучанне ў Венгрыю паедуць машыністы і спецыялісты цэха рамонту маторавагоннага дэпо.

У сакавіку чакаецца прыбыццё ў Беларусь другога і трэцяга электрацягнікоў. Усяго заключаны кантракт на пастаўку дзесяці такіх саставаў. Кошт кожнага складае амаль 6 мільёнаў еўра.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Краіна здароўя
Выпуск № 6 (242)

Накатаўся!

г. Жодзіна

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

Здаровае харчаванне

ЕШЦЕ ЧОРНЫ ХЛЕБ, ПІЦЕ ПІЎНЫЯ ДРОЖДЖЫ

Без вітамінаў групы В можна нават не спадзявацца на добрае самаадчуванне і належнае функцыянаванне арганізма. Што ж гэта за вітаміны і чаму спецыялісты настойліва раяць не адмаўляцца ад Яго Вялікасці чорнага хлеба?

Наогул вітаміны, а іх на сёння вядома каля трыццаці, — гэта нізкамалекулярныя арганічныя злучэнні з высокай біялагічнай актыўнасцю. Некаторыя з іх у досыць малой колькасці сінтэзуюцца ў арганізме. А паколькі вітаміны надзвычай неабходныя для нармальнай жыццядзейнасці, то іх трэба ў арганізм дастаўляць з ежай — раслінай або жывёльнай. Праўда, трэба пры гэтым разумець, што ўтрыманне вітамінаў у харчовых прадуктах вельмі нязначнае — ад 10 да 100 мг на 100 г прадукту. Словам, сучасны чалавек павінен мець на ўвазе дзве важныя рэчы. Па-першае, харчаванне павінна быць як мага больш разнастайным. Як толькі мы выключаем ці абмяжоўваем у рацыёне нейкі прадукт, тут жа рызыкуем займець вітамінадэфіцытны стан. І па-другое, без сінтэтычных вітамінна-мінеральных комплексаў проста не абысціся.

Паводле слоў **дацэнта кафедры геранталогіі і герыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдата медыцынскіх навук Любові ВАРОНІНАЙ**, адсутнасць вітамінаў у штодзённым рацыёне можа прывесці да захворванняў і нават гібелі. Асабліва неспрыяльна, калі назіраецца недахоп некалькіх вітамінаў. Такі стан называецца полівітамінозам.

Атрымаць лішак вітамінаў з прадуктамі харчавання нерэальна. Больш за тое, вітаміны групы В адносяцца да водарастваральных, а таму лёгка разбураюцца і выводзяцца з арганізма. Значыць, і назапашвацца яны не здольныя (у адрозненне ад тлушчарастваральных). Акрамя таго, пры некаторых хваробах — перш-наперш страўнікава-кішачнага тракта — і асаблівасцях функцыянавання арганізма вітаміны могуць не засвойвацца. А яшчэ, як і любыя іншыя вітаміны, група В разбураецца падчас тэрмічнай апрацоўкі (аднак пры замарожванні вітаміны захоўваюцца). Таму «перабор» з вітамінамі сустракаецца надзвычай рэдка, а вось «недабор» — даволі часта.

B_1 бярэ ўдзел у вугляводным абмене, абмене рэчываў, нармалізуе работу нервовай сістэмы. Пры недахопе вітаміну B_1 у арганізме парушаецца абмен акіслення вугляводаў, назапашваюцца акісленыя прадукты, узнікае шэраг сімптомаў з боку нервовай сістэмы, у тым ліку галаўны боль і раздражняльнасць. Часам могуць быць нават полінеўрыты, парэзы і паралічы, а таксама парушэнні з боку сардэчна-сасудзістай сістэмы — напрыклад, тахікардыя, пашырэнне меж сэрца; з боку органаў стрававання — ванітаванне, вадкі стул або запор, тупы боль у жываце, хвароба бэры-бэры.

УЖЫВАЦЬ: розныя віды круп, хлеб грубага памолу, хлеб аржаны, вырабы з цвёрдых гатункаў пшаніцы (у тым ліку макарону), бабовыя — гарох, фасолю. Цікава, што ў дачыненні менавіта да гэтага вітаміну ёсць неспрыяльная ежа — напрыклад, рачны карп, які багаты на ферменты, здольныя лёгка разбураць B_1. Словам, нельга надзвычай захапляцца рачной рыбай і селядцом.

B_2 бярэ ўдзел у цэлым шэрагу акісляльна-аднаўленчых працэсаў, пабудове рэчываў так званага зрокавага пурпуру, абараняе сятчатку вока ад ультрафіялету. Пры недахопе запавольваецца рост арганізма, зніжаецца вастрыня зроку, з'яўляецца слёзацячэнне, парушаецца цэласнасць слізістых абалонак, развіваюцца стаматыты, сохне скура, у тым ліку вакол рота.

УЖЫВАЦЬ: малочныя прадукты.

B_3 бярэ ўдзел ва ўсіх працэсах абмену рэчываў, спрыяе добрай скуры.

УЖЫВАЦЬ: зерневыя прадукты, піўныя дрожджы. Можна ўжываць і піва (дастаткова адной шклянкі ў дзень), аднак трэба мець на ўвазе, што разам з карысцю мы атрымаем і адмоўны эфект, абумоўлены наяўнасцю ў напоі алкаголю. Нельга забываць, што піўныя дрожджы спрыяюць паляпшэнню апетыту, што можа адмоўна адбіцца на фігуры. Самі ж піўныя дрожджы набору вагі не спрыяюць.

B_6 бярэ ўдзел у абмене амінакіслот. Пры недахопе гэтага вітаміну можа парушацца абмен і засваяльнасць жалеза. Як вынік — развіццё анеміі, дыстрафічных змен з боку розных органаў, парушэнні ў рабоце цэнтральнай нервовай сістэмы, з'яўленне раздражняльнасці, санлівасці. Недахоп можа спрыяць стаматытам, кан'юнктывітам, полінеўрытам.

УЖЫВАЦЬ: рыбу, мяса, фасолю, грэчку, гародніну.

B_{12} бярэ ўдзел у працэсе крывятварэння, а значыць, яго недахоп праяўляецца анеміяй, характэрнай для цяжарных, вегетарыянцаў, пажылых і старых, паколькі ў апошніх парушаецца работа страўнікава-кішачнага тракта. Нястача таксама спрыяе полінеўрытам, з'яўленню «мурашак», неўрапатыі, полінеўрапатыі, радыкуліту.

УЖЫВАЦЬ: прадукты жывёльнага паходжання — мяса, яечны жаўток, курыцу, некаторыя віды рыбы.

B_{15} бярэ ўдзел у такіх справах, як прафілактыка інсультаў, абумоўленая сталым узростам дыстрафія сэрца. Дапамагае пераадоленню розных інтаксікацый, у тым ліку алкагольнай.

УЖЫВАЦЬ: семкі, арэхі.

Халін (таксама адносіцца да вітамінаў групы В) падтрымлівае на належным узроўні сістэму згусальнасці крыві. Недахоп адбіваецца на нармальнай рабоце печані і нырак.

УЖЫВАЦЬ: усе віды капусты, шпінат.

P.S. *Сёння ў аптэках можна знайсці вялікую колькасць прэпаратаў вітамінаў групы В — магнэ-B_6, магвіт, нэўрабэкс і г.д. Добра, калі вітаміны групы В будуць спалучацца з такімі мікраэлементамі, як калій і магній.*

Практычна пастаянна трэба піць вітаміны групы В тым, у каго ёсць парушэнні ў рабоце сардэчна-сасудзістай сістэмы, збоі сардэчнага рытму, тым, хто падвяргаецца пастаяннаму стрэсаваму ўздзеянню, а таксама дзецям, цяжарным, пажылым людзям.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Карысна ведаць

ВУЧЫМСЯ ЖЫЦЬ З ПСАРЫЯЗАМ

Незалежна ад таго, як даўно пастаўлены чалавеку такі дыягназ, жыць з ім усё роўна няпроста. З-за хваравітых ачагоў на скуры можа быць цяжка спаць і займацца паўсядзённай працай. Пры плямістым псарыязе, самым распаўсюджаным відзе гэтага захворвання, на скуры з'яўляюцца шматлікія чырвоныя плямкі. Захворванне цалкам невылечнае і захоўваецца на працягу ўсяго жыцця. Аднак ёсць спосабы аблегчыць яго цячэнне. Акрамя мазяў і лекаў, якія прапісаў доктар, можа дапамагчы наступнае.

1. Здаровы лад жыцця. Ён дапаможа пазбегнуць стомленасці і стрэсаў, умацуе імунітэт. Пры гэтым варта:

- Правільна харчавацца. (Хоць даследаванні не паказваюць прамой сувязі паміж дыетай і псарыязам, медыкі лічаць, што людзям з псарыязам варта прытрымлівацца збалансаванай дыеты з высокай доляй садавіны і агародніны.)
- Піць шмат вады.
- Добра высыпацца.

2. Веданне фактараў, якія правакуюць абвастрэнне псарыязу. Да іх адносяцца:

- Пэўныя віды інфекцый.
- Прыём некаторых лекаў. (Раскажыце свайму доктару пра ўсе лекі, якія вы прымаеце, і спытайце, ці могуць яны ўплываць на ваш псарыяз. У прыватнасці, цячэнне хваробы могуць пагоршыць прэпараты, якія ўтрымліваюць літый, некаторыя бэта-блакатары, а таксама лекі ад арытміі, артрыту.)
- Пашкоджанні скуры. (Для хворых на псарыяз асабліва важна пазбягаць драпін, расчухвання, удараў, парэзаў. Яны могуць выклікаць успышку псарыязу на месцы пашкоджання. Будзьце асабліва асцярожныя падчас галення. Яшчэ адна важная рэч: сачыце, каб адзенне і абутак нідзе не націралі скуру.)
- Нізкая вільготнасць паветра. (Клімат вельмі важны для хворых на псарыяз. У многіх людзей падчас халоднага і сухога надвор'я сімптомы псарыязу ўзмацняюцца. Наогул, гарачае надвор'е для людзей з псарыязам больш спрыяльнае, хоць пры недастатковай вільготнасці хвароба таксама можа абвастрыцца. Падтрымліваць нармальную вільготнасць вашай скуры вельмі важна, таму падчас сухіх сезонаў (ацяпляльны сезон таксама сюды адносіцца) выкарыстоўвайце ўвільгатняльнік паветра.)

3. Адмова ад курэння. Апошняе можа абвастрыць або пагоршыць цячэнне хваробы.

4. Абмежаванне алкагольных напояў. Прыём спіртнога таксама можа выклікаць абвастрэнне захворвання і знізіць эфектыўнасць лячэння (некаторыя прэпараты для лячэння псарыязу несумяшчальныя з ужываннем спіртнога).

5. Пазбяганне стрэсаў. Стрэс правакуе абвастрэнне псарыязу. Змагацца з ім дапамогуць:

- Рэгулярныя заняткі спортам. Перад пачаткам заняткаў парайцеся з доктарам.
- Тэхнікі рэлаксацыі.
- Кантакты з іншымі людзьмі, хворымі на псарыяз, і ўдзел у групах узаемадапамогі.
- Дапамога псіхолага.

6. Клопат аб сваёй скуры:

- Выкарыстоўвайце ўвільгатняльныя сродкі, якія прадухіляюць сухасць і ўтварэнне трэшчын на скуры.
- Калі ў вас псарыяз на валасістай частцы галавы, пераканайцеся, што ўсе сродкі мясцовага прымянення трапляюць на скуру галавы, а не толькі на валасы. Карыснае рэгулярнае мыццё са змякчальнымі сродкамі, такімі, як дзёгцевы шампунь.
- Не расчэсвайце скуру. Каб зняць сверб, варта:
  — прыкласці халодны кампрэс;
  — нанесці ментолавую мазь або стэроідны прэпарат мясцовага дзеяння;
  — прыняць цёплую ванну з аўсяным талакном;
  — насіць адзенне з бавоўны.

7. Забеспячэнне аховы скуры ў зімовы перыяд:

- Наносьце ўвільгатняльныя сродкі, як мінімум, 2 разы на дзень, асабліва пасля ванны.
- Выкарыстоўвайце ўвільгатняльнікі паветра ў памяшканні.
- Пракансультуйцеся з урачом адносна дадатковых мер прафілактыкі ў халоднае надвор'е.

8. Знаходжанне на сонцы. Паколькі ўльтрафіялетавыя прамяні запавольваюць рост клетак скуры, прыняцце ўмераных доз сонечнага святла для вас карысна. Працягласць прыёму сонечных ваннаў варта ўдакладніць у доктара. Аднак неабходна пазбягаць сонечных апёкаў, якія выклікаюць абвастрэнне псарыязу і развіццё раку скуры. Участкі скуры, не пашкоджаныя псарыязам, трэба апрацоўваць сонцаахоўным крэмам.

Калі вы знаходзіцеся на лячэнні, якое павышае адчувальнасць скуры да УФ-прамянёў (фотатэрапія), спытайце ў доктара, як вам трэба засцерагацца ад сонца.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Па чутках

І кампетэнтна

Салодкае падсілкоўвае запаленчы працэс?

«Роля імуннага запалення пры многіх захворваннях у апошнія гады перагледжана. Па сутнасці, гэта галоўная прычына смяротнасці ў наш час. Запаленне паражае ўнутраную абалонку сасудаў — эндатэлій, што павялічвае іх здольнасць да спазму і ўтварэння тромбаў. Акрамя таго, запаленне выконвае вельмі важную ролю пры атлусценні і цукровым дыябеце 2-га тыпу, пры неінфекцыйных паражэннях печані, хваробе Альцгеймера, Паркінсона і іншых дэгенератыўных захворваннях нервовай сістэмы. Нават многія віды раку звязаны з такім «тайным» запаленнем. І паўсюль яно пагаршае прагноз і павялічвае смяротнасць», — паведамляе адно з расійскіх выданняў.

Запаленне аслабляюць некаторыя прэпараты і прадукты, а таксама высокі ўзровень фізічнай актыўнасці. Празапаленчымі і антызапаленчымі прадукты робіць наяўнасць так званых эсэнцыяльных тлустых кіслот (амега-3 і амега-6); антыаксідантаў; вітамінаў, мікра- і макраэлементаў; спецыфічныя супрацьзапаленчыя рэчывы, напрыклад, куркумін, які ўтрымліваецца ў куркуме. Кампаненты з такім жа дзеяннем ёсць у імбіры, размарыне, перцы і іншых спецыях. За запаленне выступае ўсё мучное і салодкае, і чым лягчэй цукар з іх засвойваецца, тым мацней яны запаляюць наш арганізм.

Каментарый спецыяліста:

Дацэнт кафедры геранталогіі і герыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук Любоў ВАРОНІНА:

— У дачыненні да імунных запаленняў больш карэктна было б гаварыць не «асноўная прычына смяротнасці», а «адна з такіх прычын». Запаленчы працэс можа паражаць розныя тканкі і сасуды. Калі ў арганізме з'яўляецца ўчастак з запаленнем, то да яго, як магнітам, пачынаюць прыцягвацца, напрыклад, ліпапратэіды нізкай шчыльнасці, так званы «дрэнны» халестэрын, і такім чынам у гэтых месцах могуць утварацца тромбы. Праўда, для актывізацыі гэтых небяспечных працэсаў патрабуюцца яшчэ застойныя з'явы крыві — парушэнне яе згусальнасці, трамбалізісу.

Запаленне сапраўды можа адыгрываць істотную адмоўную ролю пры інфекцыйных, алергічных, рэўматалагічных захворваннях, а таксама такіх дэгенератыўных хваробах, як хвароба Альцгеймера і іншыя. Ставіць жа ў гэты рад дыябет 2 тыпу і рак не выпадае. Адносна развіцця раку існуе шэраг тэорый, не звязаных з запаленчымі працэсамі.

Карысную ролю тлустых кіслот амега-3 і амега-6 цяжка недаацаніць. Яны, як вядома, перашкаджаюць адкладанню халестэрыну на сценках сасудаў. Вітаміны, антыаксіданты, безумоўна, спрыяюць умацаванню імуннай сістэмы. Куркума, імбір, размарын, іншыя спецыі, расліны валодаюць супрацьзапаленчым, абарончым эфектам. ***Салодкае будзе шкодзіць і стварыць перадумовы для падтрымкі запаленчага працэсу ў першую чаргу для таго, хто ўжо мае пэўныя хранічныя захворванні або пакутуе ад лішняй вагі. Чалавеку здароваму, фізічна актыўнаму салодкае не проціпаказана.***

Святлана БАРЫСЕНКА.

ГУБІЦЬ САБАК НЕ ПІВА...

Нехта слушна заўважыў — шлюб бярэцца не толькі з каханым чалавекам, але і з яго раднёй. Адкуль — парада, прычым кожнаму хлопцу: хочаш даведацца, якая гаспадыня атрымаецца з дзеўкі, прыгледзься да яе матулі. І парада дзеўцы: хочаш ведаць, які будзе муж з хлапца, — прыгледзься да яго... сабакі. Так-так! Не верыце? Тады паслухайце гісторыю ад маёй прыяцелкі.

Жыве яна, значыць, у Мінску, а летам з дзецьмі пастаянна ездзіць на дачу да сваякоў. І вось неяк на невялічкай станцыі бачаць яны сабачку — што называецца, абняць і плакаць: худзенькі, маленькі, а ўжо гаротны... Не адну гадзіну прасядзеў, відаць, чакаючы гаспадара, не адну прапусціў электрычку, бо вочы сумныя-сумныя.

Пашкадавалі яны, але ж паехалі далей.

Праз тыдзень вяртаюцца назад і... зноўку бачаць таго няшчаснага — яшчэ больш схуднелага, бруднага.

Нехта мог бы праехаць міма (і праязджаў!), а мая прыяцелка не з такіх: яна ніводнай жывёліны ў бядзе не пакіне! Ката свайго, Рыжыка, з паламанымі лапкамі падабрала на сметніцы, прыгажуню Касю, яшчэ сляпую, знайшла ў каробцы з-пад абутку на лютым марозе. Адпойвалі потым з піпеткі...

Вось і гэтую істоту яна забрала.

Трэба сказаць, што новы жыхар (яўнай «дваровай» пароды) паводзіў сябе вельмі прыстойна: катоў не чапаў, спаў на дыванку ў калідоры, калі час быў ісці гуляць, сам прыносіў павадок...

Аднак не паспела гаспадыня парадавацца свайму «здабытку», як падчас чарговай прагулкі ён некуды рвануў і знік.

«Знайшла я прапажу, — расказвала потым прыяцелка, — на пустцы, у кампаніі выпівох, півам пахмяляліся, а ўжо рагаталі, што называецца, упокат! Было з чаго: наш Дружок, як той цыркач, сядзеў слупочкам на задніх лапках, пярэднімі ж перабіраў, прычым з неверагоднай хуткасцю — выпрошваў сабе пачастунак. Думаеце хлеба? Не! Піва! Мужыкі налівалі яго ў бляшанку, сабачка выпіваў, вылізваў усё да апошняй кропелькі, потым падаў на спіну і пачынаў «балдзець»...

Карціна, карацей, яшчэ тая! Мужыкі рагочуць, а ў жанчыны слёзы на вачах: зразумела, хто гэтага сабачку выхоўваў ...

Тут трэба, мусіць, сказаць, што калісьці за такім «выхавацелем» яна была замужам, ледзь выгнала потым...

Карацей, падхапіла яна Дружка, прынесла дамоў і кажа: яшчэ раз да выпівох гэтых падыдзеш, так і знай — выганю, адвязу, дзе ўзяла. І заплакала...

Божа, казала, як жа заенчыў Дружок, як заскавытаў, як кінуўся лізаць ёй рукі! Ну чыста чалавек! (Хоць якраз яму (і часта) бутэлька даражэй, чым дом ды сумленне).

Вось так — кароткім «выганю» — хоць і не з першага разу, але ад піва яго адвучыла. Ад «закусі» — яшчэ не. Таму, пакуль гаспадыня купляе ў краме прадукты, прывязаны ля дзвярэй хітрун прывычна садзіцца слупочкам і пачынае перабіраць лапкамі: падайце, маўляў, беднаму, няшчаснаму... Людзі падаюць.

«І няхай, — смяецца прыяцелка. — Няхай лепш думаюць, што гаспадары яго дрэнна кормяць, чым — спойваюць».

С. БАГЕР,

г. Барысаў.

ПЕРШЫ ЗАПЛЫЎ

Некалі я працаваў у досыць моцным калгасе. У 80-я гады таго стагоддзя ён, што называецца, дазваляў сабе многае, у тым ліку — і маштабнае будаўніцтва. Прычым не толькі нейкіх там майстэрняў ды ферм, але і шыкоўнага аздараўленчага комплексу — з саўнай, з басейнам.

...На той час у эксплуатацыю яго яшчэ не здалі — ішлі апошнія выпрабаванні, наладачныя работы. Але ж тэлебачанне пра гэта неяк даведалася, — прыехала ў калгас (аж з самога Мінска!). Трэба ж, маўляў, паказаць, як вёска жыве, якія патрэбныя гмахі ўзводзіць, колькі карысці ад іх, колькі радасці людзям.

Старшыня калгаса — сумленны чалавек, казалі, адбіваўся, папярэджваючы, што аб'ект яшчэ не гатовы, што рана нешта здымаць: «Прыязджайце праз месяц, калі ўсё запрацуе. Тады і «карцінка» прыгожая будзе, і з людзьмі пагаворыце. А так — няпраўда ж атрымаецца...».

Толькі хто яго слухаў? Убачылі аператары ваду ў басейне і на сваім стаяць: як гэта «аб'ект не гатовы»? Плаваць тут можна? Можна! Ну і што, што вада халодная? Арганізуйце людзей...

Што было рабіць? Выклікае старшыня брыгадзіра і дае загад: «З'ездзі ў майстэрню, набяры дабравольцаў, паабяцай «кампенсацыю». Няхай паплаваюць».

Смелых — з механізатараў, шафёраў, слесараў — набралася чалавек шэсць-сем. Думалі — такой бяды, што вада халодная, крыху паплёскацца можна, каб потым на сябе па тэлевізары паглядзець.

То прыйшлі яны (мой сусед там быў, ён і расказваў), распрануліся да трусоў і ў басейн па камандзе — боўць! Але ж...

Ім казалі, што вада халодная, але не папярэдзілі, што ледзяная (толькі што крыгі не плаваюць). Таму яны ў розныя бакі і даліся, як тыя апалонікі — каб хутчэй да берагоў і выскачыць.

А не тут тое было! Аператар зняць не паспеў, крычыць: «Хлопцы, назад!» І кучкай, кучкай, бліжэй адзін да аднаго (яму ж трэба масавасць)... І ўсміхайцеся, усміхайцеся!

Брыгадзір з берага таксама кіруе: пацярпіце, маўляў, «сагрэў» ужо куплены.

...Не скажу, ці налівалі «маржам». Але ж сусед казаў, што ні гарэлка, ні той рэпартаж па тэлебачанні не кампенсавалі ім... страчанага ў басейне здароўя.

В. Ус,

г. Магілёў.

«ПАРОДА Ў ІХ ТАКАЯ»

Мужчыны, калі яны хочуць выпіць, то знойдуць — і сам прадукт, і любую хованку. Нюх у іх на гэта — як у спецыяльна абучаных сабак, што наркотык на мытнях шукаюць!

Мар'я, кабета з нашай вёскі, пра гэта ведала, бо было ж — як ні схавае тую гарэліцу, мужык усё роўна знойдзе і выжлукціць. А як без яе, ды ў вёсцы? Ды яшчэ, калі гаспадар такі, а нейкую неадкладную работу зрабіць трэба ці нечаканага госця прыняць?

То ўсё, вырашыла Мар'я, заводзячы брагу, на гэты раз зраблю самагону і падзялю. Літраў колькі схаваю так, каб знайшоў, а астатнія — закапаю ў зямлю і зверху дзірван пасцялю. Ніколі не знойдзе!..

Ага, як кажа Задорнаў, «счас»! Адно слова — баба. І хованка ў яе бабская (спадзеўкі таксама). Мужчына б лепш схаваў, тым больш гарэлку і тым больш ад бабы.

Тут вось што дзіўна: ад сваіх сябрукоў (парода такая) ён нічога не хавае — апошняе аддасць.

А баба як вырашыла, так і зрабіла. Стала за мужыком назіраць. Аж бачыць: ён пад мухай і дзень і тыдзень... Гэта ж, думае, ён сваё, «паложанае» п'е, асалоду расцягвае.

Але калі праверыла «схрон», — так і ёсць — знайшоў схованку! Пад зямлёю! І выпіў — у бутлі літрыкі са два засталіся!

Ну, думае, паразіт, я ж цябе правучу: усё роўна прадукту прападаць, дык няхай не без толку! Налавіла яна мышэй (сама, бо кот такі ж, як гаспадар), панапіхала іх у бутлю і занесла да суседкі — «на адстой».

З тыдзень у цёмным месцы трымалі (мужык ачмурэў, шукаючы), потым рашылі, што хопіць, няхай п'е! А ўбачыць на донцы, ШТО там — навекі «завяжа».

Адно слова — бабы. І спадзеўкі ў іх чыста бабскія. Страхі таксама: раптам, думаюць, атрута атрымалася. Вып'е — і таго — памінай...

Грэх на душу браць не хацелася. Дык жонка рашыла са шкаліка пачаць, паднесла мужыку ўвечары: так і быць, маўляў, на, ад сэрца адрываю, калган, на лекі настойвала.

А сама ж глядзіць, назірае, што далей будзе.

Што-што? Ды нічога! Мужык такі шчаслівы зрабіўся, каб легчы паміраць — нават у думках не мае! І раніцай вясёлы прачнуўся, — адразу да яе: будзь, маўляў, чалавекам, налі яшчэ той настоечкі, а то, ты ж ведаеш, усё роўна знайду...

Баба, з адчаю, тую бутлю гоп на стол. Кажа — на, паглядзі, што ты піў, аспід ядавіты, каб ты лёг ды выпрастаўся!.. Ну і гэтак далей. (Некалі, трэба сказаць, нашы лучынскія бабы былі дужа клянушчыя: слоў адмысловых ведалі — ці не мільён! І прамаўляць іх маглі — нават з кляпам у роце. Але — ніводная не білася, нават са сваім мужыком: у нас — «не паложана»).

Дык вось і гэта, Мар'я што-кольвек ляпнула — языком, потым дзвярыма і сышла, каб вочы не бачылі.

Аднак, куды ж ты сыдзеш з хаты сваёй?! Праз нейкі час вяртаецца. Бачыць, сядзіць яе пута за сталом — жывое, вясёлае — адціскае праз марлю мышэй і пры гэтым філасофствуе: дурная ты, кажа, баба. Чым напужаць хацела... Кітайцы вунь гадзюк у гарэлцы настойваюць і гэта ў іх — найлепшы напой! А тут — мышкі. Боскае стварэнне! Кот ужывае! А ён жа не дурань: ён абы што ні есці, ні піць не будзе. Значыць, і чалавеку мышкі не шкодзяць. Вось толькі піць непрыемна — поўсць перашкаджае. Во зараз адфільтрую...

Так што мужчына, калі ён захоча выпіць, знойдзе не толькі прадукт, не толькі хованку, але і навуковае абгрунтаванне. Парода ў яго такая.

Соф'я КУСЯНКОВА,

вёска Лучын, Рагачоўскі раён.

НАПРАДВЕСНІ

Трымаць кароўку і сёння не лёгка, а ўжо некалі... Адно сена душу даставала. Не ведаю, як дзе, а ў нас такія парадкі былі: накасі яго, насушы, наскладай у стагі, а потым дзяльба пачнецца — семдзесят адсоткаў калгасу, трыццаць — калгасніку. Гэта значыць, сем стагоў на ферму завязі, тры — можаш дадому.

І палова бяды, калі гаспадар на падворку ёсць ды здаровы, дужы. А што старым рабіць, хто ім накосіць, хто ім насушыць? А кароўку ж таксама збываць не хочацца!

Вось адна бабуля і адважылася — напрадвесні сена таго на кароўніку ўзяла, на санках дахаты вязе.

Як на тое ліха, старшыня насустрач: злодзея, што называецца, на гарачым злавіў! І давай распякаць: начальства — вядома ж, па-руску... І з мацюкамі!

Адабраў у старэнькай сена, санкі , вяроўку.

— Еще раз поймаю, — пагражае, — обругаю последними словами!

У бабулі мароз па скуры: думала, што гэта «последние», — аказваецца, не!

— Воровка старая! — крычыць ёй старшыня.

Вось тут бабулю крыўда ўзяла: ужо бэсцію яе — няхай! Цярпела... А за што ж вяроўку? Якая ж яна старая, калі наадварот...

— Новая, — кажа, — вароўка (у нас так вяроўку завуць), але ж, старшынька, калі табе трэба, — забірай! Ліха з ёй, аддаю... А мне саначкі пакінь, га? Я іх у суседа пазычыла.

Так яны і разышліся — кожны ў свой бок.

І з нарыхтоўкай сена ў нас яшчэ доўга нічога не мянялася, бо злодзея злавіць яно куды прасцей, чым разабрацца, чаму чалавек пайшоў красці. А потым — дапамагчы.

Г. БАБАРЫКА,

в. Мачуль, Столінскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Погляд

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ЭКАНАМІЧНАЯ СТРАТЭГІЯ І ІНВЕСТАРЫ

АРТЫКУЛ хачу пачаць з такога пасылу: мудрасць кіраўніцтва нашай дзяржавы на цяперашні момант будзе ў тым, каб убачыць менавіта зараз, што нас чакае ў найбліжэйшыя 5—10 гадоў у адносінах з нашымі суседзямі як на Усходзе, так і на Захадзе.

Мы навучыліся працаваць у прамысловасці і ў сельскай гаспадарцы (праўда, і раней гэта рабілі нядрэнна). Захавалі і аздаравілі сетку прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі. І вось, калі практычна мы выходзім на перадавыя пазіцыі сярод многіх краін, уключаючы нашых суседзяў, пачынаем здаваць свае лепшыя прадпрыемствы замежным інвестарам. Тут неабходна адзначыць, што інвестар інвестару розніца.

Пры гэтым сцвярджаю, што Беларусь была, ёсць і будзе «прынаднай цукеркай», што для Еўрасаюза, так і для Расіі. І ад нас з вамі залежыць, каб мы не аказаліся ў ролі Калабка з вядомай казкі, дзе ролю Ліскі на сябе прымярае і Расія, і аб'яднаная Еўропа. Праўда, неабходна зрабіць удакладненне, што зрабіць гэта хочуць не самі вышэйназваныя краіны, а пэўныя алігархічныя кланы ўнутры гэтых дзяржаў, якім глыбока наплюваць на інтарэсы працаўнікоў і насельніцтва сваіх краін таксама, як і на інтарэсы грамадзян іншых краін, дзе яны выступаюць у ролі інвестараў. У іх адна задача — атрыманне звышпрыбытку для сябе і сваіх манаполій.

Сярод вялікага патоку інвестараў у нашу краіну неабходна вылучыць «інвестараў-мыльных бурбалак». Яны за кошт нашых прадпрыемстваў і інавацыйных рашэнняў зарабляюць не абы-якія капіталы, што знікаюць з-пад носа дырэктараў і начальнікаў маркетынгавых аддзелаў нашых фабрык і заводаў.

Штуршком да з'яўлення гэтага артыкула паслужыла сустрэча аўтара са сваім былым калегам па працы. Мой таварыш курыраваў лінію, дзе неабходна было дасканала ведаць італьянскую мову, акрамя гэтага, ён адзіны супрацоўнік нашага сектара, які валодаў венгерскай мовай. Спецыялістаў па ёй і ў нас, і ў Расіі можна па пальцах пералічыць. Менавіта з акцэнтам на венгерскую мову і прагучыць той аповед, які я хачу адрасаваць чытачу.

Гісторыя пачалася з таго, што яго, як перакладчыка з італьянскай мовы ў Маскве, нанялі дзве расійскія кампаніі для суправаджэння ў паездцы ў Беларусь двух італьянскіх бізнэсменаў. У паездцы ставілася задача наведвання дзвюх нашых швейных фабрык, а таксама фармацэўтычнай вытворчасці. Перамовы з гэтымі прадпрыемствамі вялі выканаўчыя дырэктары расійскіх кампаній, замежнікі толькі назіралі, але потым стала зразумела, што яны з'яўляюцца сапраўднымі ўладальнікамі вышэйназваных маскоўскіх фірмаў, менавіта яны накіроўвалі сваіх выканаўчых дырэктараў-расіян на тыя або іншыя крокі...

Сутнасць іх бізнэсу складаецца ў тым, што яны закупляюць нашы тавары і лекі, што само па сабе нядрэнна. Але вось нюансы... Па касцюмах і штанах: наша падкладка ў Італіі выдаляецца, і там яны ставяць ужо сваю, каб было відаць, што выраб пашыты ў Італіі. Гэта значыць, наш беларускі касцюм, набыты ў нас у раёне 100 долараў, ператвараецца з падкладкай і этыкеткай італьянскай фірмы ўжо ў выраб па цане 350—500 долараў. Наша прадукцыя спачатку ідзе ў Расію, потым адтуль у Італію. Так, транспартныя выдаткі, але гэта дробязь. Частка тавару ўжо з італьянскай маркай асядае ў Венгрыі, Чэхіі, Польшчы, Латвіі і той жа Маскве. Італьянскія бізнэсмены — выхадцы з Венгрыі, дзе ў іх ёсць і лекавы бізнэс. У паездцы яны размаўлялі паміж сабой па-венгерску, думаючы, што іх ніхто не разумее. Мой таварыш і выгляду не падаў, што ў курсе ўсяго, пра што яны гавораць... Хоць, па яго словах, чухаліся рукі — даць такім бізнэсменам па фізіяноміі, з-за іх абраз у адрас беларускага і рускага народаў. Як яны ганарыліся, што закупляюць нашы лекі. У Венгрыі нашу ўпакоўку мяняюць на венгерскую і прадаюць у краінах СНД і Усходняй Еўропе па цане, якая ў дзясяткі разоў перавышае тую, па якой закупілі лекі ў нас або ва Украіне. Іх «фішка» яшчэ ў тым, што абалонку нашым таблеткам яны робяць з вітаміннага пакрыцця, а асяродак таблеткі наш. Робяць свой бізнэс, нічым не рызыкуючы, бо нашы лекі прайшлі жорсткі дзяржкантроль якасці. Маючы ў Італіі і Венгрыі невялікія заводзікі, дзе за невялікую плату працуюць некалькі дзясяткаў украінцаў, румын, сербаў, яны мараць пад выглядам расійскіх кампаній стаць інвестарамі ў Беларусі і ва Украіне — з мэтай набыцця нашых прадпрыемстваў. Прычым намеры вельмі сур'ёзныя, бо, па іх словах, хто мае ў Еўропе доларавыя актывы, праз год—два стануць банкрутамі, калі своечасова не пазбавяцца ад доларавых знакаў. Таму трэба тэрмінова скінуць гэтыя паперкі рускім, беларусам і ўкраінцам, якія ганяюцца за долярамі. Яны здзекаваліся з нас і нашых суседзяў. Па іх словах, дырэктары прадпрыемстваў у Беларусі і ва Украіне за некалькі дзясяткаў тысяч баксаў гатовыя прадаць сваё прадпрыемства...

Гісторыю, расказаную мне маім таварышам, я магу працягнуць на іншым прыкладзе. У нашым горадзе, усім гэта вядома ў рэспубліцы, размешчаны другі па велічыні ў былым СССР лакафарбавы завод. Дзялкі з-за мяжы, па аналогіі з вышэйназванымі італьянцамі, закупляюць на лідскім заводзе цыстэрнамі фарбу. У Польшчы разліваюць фарбу ў свае прыгожа аформленыя бляшанкі — і выдаюць выраб за свой. Цана, праўда, ужо падскоквае ў два разы. Не саромеюцца на этыкетках паказваць і «завод», які ёсць у тым жа Беластоку. Хоць увесь гэты «завод» уяўляе сабой некалькі кантэйнераў-гаражоў, дзе ўручную разліваюць фарбу ў бляшанкі. Вось так, палец аб палец нават не ўдарыўшы, можна добра зарабіць! Хто прайграе? Вядома, наша дзяржава — з-за непаваротлівасці і недальнабачнасці нашых менеджараў...

Прывяду гістарычны прыклад. У 19 стагоддзі па ўсёй Еўропе славілася галандскае сметанковае масла ў прыгожай упакоўцы. Вось толькі гэтае масла паступала ў Галандыю з Волагды і Кастрамы. Галандскія купцы завозілі масла ў дубовых 200-літровых бочках, якія адыгрывалі ролю тары (прычым згаджаліся купляць масла замежнікі толькі ў дубовых бочках). Затым, як вы правільна зразумелі, масла пакавалі ў сваю абгортку, а бочкі прадавалі французскім вінаробам і каньячным майстрам па вялікай цане, бо па ўсёй Еўропе дубравы былі высечаныя яшчэ ў 18 стагоддзі. Бізнэс працвітаў, а дурнямі, на думку галандцаў, — хто быў? Правільна, гісторыя паўтараецца...

Дарэчы, мой таварыш спытаў мяне: «Чаму ні ў Маскве, ні ў Піцеры не стала вашага славутага Лідскага піва?» Калісьці завод грымеў на ўвесь Саюз па якасці піва, за ім ганяліся, і дастаць яго можна было па вялікім блаце. Цяпер яго можна дастаць толькі ў тых, хто вяртаецца з гасцей з Беларусі. Ён так і заявіў: «Вы страцілі свой нацыянальны здабытак і брэнд!». На пытанне «Навошта паспяховае прадпрыемства аддалі?» адказаць я не змог.

Цяпер станоўчы прыклад інвестара. Гэта г. Бабруйск, дзе і піва пайшло якаснае, ды і другая па велічыні хакейная арэна ў краіне за кошт тых жа інвестараў пабудавана... Завод быў закладзены з нуля. А ўсё чаму? Таму што тут мясцовыя чыноўнікі зрабілі па-дзяржаўнаму; і дзяржава, і людзі выйгралі, ды і інвестар не ў пройгрышы, плюс — павага людзей, а гэта даражэй за грошы будзе...

Дык давайце цаніць і паважаць свой нацыянальны здабытак, які ствараўся рукамі нашых дзядоў і бацькоў!

З павагай да чытачоў
Уладзімір КСЕНЗ,

г. Ліда.

РАСТАЦЬ АД КАХАННЯ

Вясной гэта можа здарыцца не толькі са Снягуркай

ТУМАН ахінуў зямлю. Людзі застылі ў неразуменні: літаральна ў іх на вачах знікала крохкая дзяўчына, растваралася ў тумане яе постаць, даляталі апошнія гукі яе развітання з каханым... Ніхто не мог дапамагчы, і пачуццё, якое цудадзейным чынам звязала пару, здавалася б, павінна было даць надзею, аднак зрабіла закаханых безабароннымі. Вось і каварства гэтага жаданага ўсімі пачуцця: упускаючы яго ў сваю душу, чалавек не думае, што цяпер яно можа распараджацца яго жыццём. Можа ашчаслівіць, а можа загубіць.

«Так ім і трэба, — разважала немаладая жанчына ў гардэробе опернага тэатра. Яна стаяла ля люстэрка побач з дзяўчынкай-падлеткам, магчыма, унучкай, і тлумачыла мараль той байкі, што вынікала з оперы Рымскага-Корсакава «Снягурка». — Ён жа кінуў нявесту, падлюка. А яна ж ведала гэта, чаму не збегла куды, як мага далей ад граху? Не ж, яна, наадварот, свайго шчасця шукаць пабегла, бессаромніца. Атрымалася, разбіла пару. Думаць жа трэба, перш чым...» Дзяўчынка ўсміхнулася ў люстэрка і з рашучай упэўненасцю запярэчыла: «Дык што, ёй трэба было так і заставацца адной? Вось цікава так жыць...» Спрэчку паспрабаваў прыпыніць мужчына, які падышоў да сваіх дам з вопраткай: «На кожную Снягурку знойдзецца свой Мізгір». — «От, ты навучыш...» — прасвідравала яго жонка поглядам, напоўненым пяшчотай шматгадовай вытрымкі.

Прыслухоўвалася да гэтай размовы і дзівілася, бо нават і думаць не магла, што гэтая опера-казка здольная выклікаць спрэчкі абсалютна жыццёвага характару ў сучасных людзей. Тым не менш, ці не самі аўтары пастараліся, каб выдуманая гісторыя дачкі Мароза і Вясны была вельмі падобная на чалавечую? У тым ліку, каб упэўніцца: словы «растаць ад кахання» — не толькі прыгожая метафара.

І не толькі дзеля яе ўзялася за пастаноўку оперы «Снягурка» ў Нацыянальным Вялікім тэатры Беларусі рэжысёр Сусана Цырук, якая была адзначана прэстыжнай расійскай прэміяй «Залатая маска» за працу ў оперным жанры. Пастаноўка опернага спектакля ў Беларусі гэтым рэжысёрам азначала б яе творчае вяртанне для публікі, якая ў тэатры (а зараз пасля-рамонтны сезон) чакае новых пастановак. Зрэшты, да гэтай прэм'еры Сусана Цырук ужо выпусціла спектакль у Дзяржаўным музычным тэатры Беларусі і нават стала там галоўным рэжысёрам. У оперным яна таксама зрабіла сваю справу: тэатр, які апошнім часам «выдаваў» прэм'еры італьянскіх опер, дзякуючы «Снягурцы» паспрабаваў збалансаваць сваю рэпертуарную палітыку.

Спектакль сапраўды атрымаўся іншым. Не толькі з-за таго, што ўсё-такі гэта руская класіка, «Снягурка» — адна з самых «народных» опер Мікалая Рымскага-Корсакава. Дарэчы, ён стварыў яе, пасяліўшыся ў далёкай вёсцы. Натхніўшыся казкай Аляксандра Астроўскага, кампазітар напрыканцы XIX стагоддзя напісаў твор, які быў напоўнены народнымі мелодыямі, старадаўнімі абрадамі, якія дазвалялі перадаць асаблівы дух славянскага паселішча. Яно існуе ў адпаведнасці з паганскімі ўяўленнямі пра свет.

Сілы прыроды ў гэтым свеце абсалютна самастойныя і такія ж жывыя, як людзі. Яны могуць дараваць жыццё (як Мароз з Вясною), могуць несці свята (як Масленіца), могуць надзяляць пачуццямі, а могуць і пазбавіць будучыні ці, наадварот, дараваць яе ўсяму народу, які прынёс нейкую ахвяру (як Сонца расквеціла наваколле, калі з паселішча назаўсёды знікае дзяўчына, што ўвасабляе холад). Перад намі сутыкаюцца два нібыта паралельныя сусветы: прыроды і людзей. Яны павінны суіснаваць у гармоніі. Таму што чалавек — такая ж частка прыроды. Вось хоць бы як Лель: просты пастушок існуе ў суладдзі і з самім сабой, і з асяроддзем, з іншымі людзьмі; спявае прыгожыя песні, калі сэрца перапоўнена радасцю, ці калі трэба супакоіць кагосьці іншага, каму зараз дрэнна. І такое бывае, таму што сваімі паводзінамі ці жыццём, якое не ўпісваецца ў заведзены цыкл, чалавек можа парушыць гармонію з сусветам, і тады будзе пакараны нябачнымі сіламі.

У царстве цара Берандзея ўсё пабудавана гарманічна, у адпаведнасці з тым, як абуджаецца прырода, квітнее наваколле, набірае моц сонца. І сапраўды, седзячы ў зале, ты адчуваеш вясну — у касцюмах і дэкарацыях, якія прадумалі расійскія мастакі Таццяна Каралёва і Кірыл Піскуноў. Ты ў міфічным свеце старадаўніх славян, дзе за царскімі харомамі тут жа пачынаецца лес, а ў лесе раптам можна разгледзець прыкметы сімвалічнага паганскага капішча, за ім напаткаць схаваную ад вачэй паляну, потым ізноў выйсці да вёскі. Сцэна пераўвасабляецца хутка і натуральна, сучасная тэхніка дапамагае змяняць афармленне, але не становіцца асобным дзеючым персанажам, не адцягвае ўвагу на сябе ад галоўных герояў. І гэта, здаецца, дасягаецца без надта складаных рэжысёрскіх рашэнняў, часам мінімальнымі сродкамі. Нібыта само сабою. Тое, што бачыць глядач, выдатна кладзецца на музыку, якую выконвае аркестр, спалучаецца з сюжэтам, які развіваецца вельмі драматычна.

Гармонія, якая панавала ў берандзеевым царстве, пахіснулася. Халодная прыгажосць і трапяткая пяшчота Снягуркі (гэтую ролю цудоўна выконвае Таццяна Гаўрылава) раптам паразілі Мізгіра (Уладзімір Громаў), і ён парушыў клятву. Пераканаўча пакутуе прыгожая Купава (гэта ўдалося спявачцы Анастасіі Масквіной). Усе героі ведаюць, што і дзеля чаго робяць на сцэне. Але ў выніку магутнай дзеючай сілай становіцца народ, які прадстаўляюць артысты хору. Народ просіць справядлівасці. І ёсць сцэны, дзе голас народа сапраўды вырашальны. Народ заступаецца за няшчасную дзяўчыну. Народ просіць пакараць Мізгіра. Народ закідвае камянямі таго, хто парушыў існуючыя законы...

Народ жа спявае гімн богу Ярыле: каханне, якое прынесена ў ахвяру, вызваліла людзей ад яго гневу — холад павінен пакідаць зямлю своечасова, халодным істотам не месца сярод людзей. З ласкі Сонца жыццё працягваецца. Хочацца думаць, што хутка вясна і што ў сённяшнім жыцці холад саступіць месца цеплыні, якая напоўніць чалавечыя сэрцы любоўю.

Славянская міфалогія з духоўнага нябачнага свету набыла абліччы і абрысы. Мы пра яе недзе чыталі. Цяпер праз рускую оперу можам пабачыць, пачуць і ўявіць той Сусвет, які складаў аснову светапогляду і нашых далёкіх беларускіх продкаў таксама. А ўвогуле — Сусвет жа адзіны, агульны для ўсіх, як агульныя неба, сонца і зоркі свецяць розным народам. Толькі кожны народ па-свойму іх узвялічвае, напаўняе сэнсам. У нейкі момант падумалася, што задыякальны цыкл, які праходзіць перад намі ў спектаклі некалькі разоў па волі рэжысёра, — з нейкага іншага спектакля, гэта чужыя нам міфы. А зямля — для ўсіх адна. Аднолькава людзі на ёй радуюцца, пакутуюць ад кахання і ўсё роўна шукаюць яго.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Беларусь і свет

ПАСЫЛКА З ПАРЫЖА

Як Беларусь «наблізілася» да Францыі

БЫЛОМУ карэспандэнту «Звязды» па Гродзенскай вобласці, а цяпер супрацоўніку турыстычнай фірмы «Нямнова-Тур», краязнаўцу Вітольду Іваноўскаму патэлефанавалі з аддзялення паштовай сувязі: «Прыходзьце, вам — пасылка». «Ад каго?» «З Парыжа».

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

— Сваякоў у Францыі не маю і таму па дарозе на пошту спрабую дагадацца, хто ж гэта зрабіў мне такі пераднавагодні сюрпрыз. Можа, нейкая памылка? А прыходжу дахаты, разгортваю ўпакоўку — і ўсё становіцца зразумела, — расказвае Вітольд Уладзіміравіч.

Перадгісторыя гэтай незвычайнай пасылкі такая. Гэтым летам у горадзе над Нёманам пабывалі госці з Парыжа — муж і жонка Вісані. Федэрыка цудоўна валодае рускай мовай, выкладае яе ў адным з каледжаў французскай сталіцы і, да таго ж, захапляецца падарожжамі па свеце. І, пэўна, невыпадкова менавіта ёй турфірмы прапанавалі падрыхтаваць даведнік пра Беларусь, паколькі практычна ніякай інфармацыі для турыстаў пра нашу краіну не было. Гэтую «нішу» і ўзялася запоўніць Федэрыка Вісані. Яны з мужам на ўласным аўтамабілі прыехалі ў Беларусь і пабывалі ва ўсіх абласцях, прысвяціўшы ў тым ліку два дні і знаёмству з Гродзеншчынай. Зразумела, за гэты час немагчыма ўбачыць усе помнікі гісторыка-культурнай спадчыны Прынямоння, але з найбольш знакамітымі Вітольд Іваноўскі гасцей азнаёміў. Гэта, вядома ж, і Каложская царква, і нашы замкі, і Жыровіцкі манастыр... У раздзелах, прысвечаных іншым рэгіёнам Беларусі, — свае славутасці.

Прычым толькі гістарычнымі помнікамі Федэрыка Вісані, аўтар даведніка, які і быў у пасылцы з Парыжа, не абмежавалася. Увазе турыстаў таксама прапануецца інфармацыя пра гасцініцы, кафэ, аўтазаправачныя станцыі, іншыя аб'екты інфраструктуры і нават... рэцэпты страў беларускай кухні — бабка, зразы, калдуны, боршч-халаднік і, вядома ж, дранікі.

Як і параіў Вітольд Іваноўскі, даведнік пачынаецца словамі на беларускай мове: «Сардэчна запрашаем у Беларусь!». Усё астатняе — па-французску. А неўзабаве, верагодна, Федэрыка Вісані, італьянка па нацыянальнасці, выдасць гэты даведнік і на італьянскай мове. Дзякуй, Федэрыка!

Дарэчы, фірма «Нямнова-Тур» у справе папулярызацыі нашага турыстычнага патэнцыялу можа ганарыцца не толькі супрацоўніцтвам з Францыяй. Нядаўна, у рамках праекта «Невядомая Еўропа» па развіцці турыстычнай інфраструктуры польска-беларускага памежжа ў раёне Аўгустоўскага канала і ракі Нёман убачылі свет даведнік і карта па Гродзеншчыне і Сувальшчыне. Упершыню — адразу на шасці мовах (беларускай, рускай, польскай, літоўскай, англійскай і нямецкай). Прычым турыстам прапануюцца вельмі цікавыя, падрабязныя звесткі не толькі аб гісторыка-культурных помніках, мясцінах, звязаных са знакамітымі людзьмі і падзеямі мінуўшчыны, аб этнаграфічных аб'ектах, музеях, выставачных залах, народных майстрах і калектывах, але і канкрэтныя турыстычныя маршруты — пешыя, водныя, веласіпедныя, конныя. У зоне Аўгустоўскага канала іх, дарэчы, ужо шаснаццаць, а ў перспектыве могуць з'явіцца і іншыя.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ЗАБАРОНЕНАЯ СТРАСЦЬ ІРЫНЫ ДАРАФЕЕВАЙ



МЮЗІКЛ Кіма Брэйтбурга і Карэна Кавалерана «Блакітная камея» прыцягнуў публіку ў Музычны тэатр. Яшчэ б — у ролі князёўны Тараканавай, адной з галоўных у спектаклі, занятая Ірына Дарафеева. Праўда, на прэм'еры спектакль паказалі з іншым акцёрскім складам.

Ролю князёўны выконваюць Ілона Казакевіч і Кацярына Муратава, галоўную мужчынскую ролю — Дзмітрый Якубовіч і Дзмітрый Максімовіч.

У аснове сюжэта мюзікла — забароненае каханне князёўны Лізаветы Тараканавай, прэтэндэнткі на рускую карону, і графа Аляксея Арлова, фаварыта імператрыцы Кацярыны II. Праўда, у адрозненне ад вядомай з гісторыі інтрыгі, забароненае каханне ў «Блакітнай камеі» скончыцца хэпі-эндам.

Кампазітар Кім Брэйтбург разам з жонкай Валерыяй, якая займалася з артыстамі вакалам, відаць, вырашылі зрабіць «Блакітную камею» выключным эпатажным мюзіклам: прыдворны бляск спалучыць з брэйк-дансам і R'n'B, класіку з рокам, прафесійных акцёраў з аматарамі, акадэмічны вакал з эстрадным. У акадэмічнай манеры, дарэчы, спявае толькі адзін персанаж мюзікла — імператрыца Кацярына II (яе ролю выконваюць Маргарыта Александровіч і Людміла Станевіч). Гэта патрэбна па статусе. Наогул, пастаноўка ідзе пад «мінусавую» фанаграму: ніякага жывога аркестра, але вакальныя партыі выконваюцца жыўцом.

— Мы не хацелі рабіць грувасткае шоу, — распавядае Кім Брэйтбург. — Спектакль ставіўся з найлепшымі пабуджэннямі для шырокай аўдыторыі ў імя добрага настрою. Таму ў ім гучыць поп-музыка ў шырокім сэнсе гэтага слова. Разлічваем, што спектакль будзе добра наведвацца і пратрымаецца ў рэпертуары тэатра шмат гадоў.

Па словах галоўнага мастацкага кіраўніка Музычнага тэатра Адама Мурзіча, «Блакітная камея» будзе ставіцца чатыры разы на месяц. А вясной плануецца паказаць спектакль у абласных гарадах Беларусі. Яшчэ невядома, як з іншымі міжнароднымі фестывалямі, але на «Славянскім базары ў Віцебску» мюзікл, відаць, пакажуць.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НЯМА АДЗІНСТВА Ў АДЗІНАЙ ЕЎРОПЕ

ШВЕДСКІ гісторык Гунар Ветэрберг адносна нядаўна выклікаў буру эмоцый у грамадстве. У дзень адкрыцця чарговага пасяджэння Паўночнага савета (арганізацыя, якая аб'ядноўвае парламентарыяў Даніі, Ісландыі, Нарвегіі, Швецыі і Фінляндыі) прапанаваў, каб пяць «нардычных», г. зн. паўночных, дзяржаў стварылі свой саюз.

Прычым, на ўзор Кальмарскай уніі, якая праіснавала з 1397 па 1523 год, была створана ў процівагу нямецкай эканамічнай і палітычнай экспансіі ў Скандынавіі ў XIV стагоддзі і знаходзілася пад вярхоўнай уладай дацкіх каралёў. У XVII стагоддзі кароль Швецыі Карл X Густаў марыў адрадзіць унію, але ў яго гэтага не атрымалася. І вось новы прыліў настальгіі, выкліканы публікацыяй Гунара Ветэрберга, які прапаноўвае на ўзор Кальмарскай уніі аб'яднацца ў супердзяржаву пяці скандынаўскім краінам пад скіпетрам дацкай каралевы Маргарыты II.

Аб'яднаныя паўночныя дзяржавы налічвалі б 25 млн грамадзян, а іх ВУП складаў бы каля аднаго трыльёна долараў. Адносна тэрыторыі (1258 тыс.кв.км), аб'яднаная Скандынавія належала б да галаўной еўрапейскай групы, а калі ўлічыць яшчэ і Грэнландыю, то ў яе не было б канкурэнтаў. Такім чынам, калі б дайшло да аб'яднання, яна стала б дзясятай эканамічна магутнай дзяржавай свету пасля Канады і Іспаніі, але наперадзе Расіі і Бразіліі, і пятай або шостай у Еўрапейскім саюзе. Прыхільнікі гэтай ідэі лічаць, што асабліва карысную аддачу, якая заключаецца ва ўзаемадапамозе, аб'яднанне магло б прынесці ў эпоху фінансавага крызісу. Сёння ж кожная краіна вымушана спраўляцца з ім у адзіночку. Напрыклад, пад пагрозай знаходзіцца аўтамабільная прамысловасць Швецыі. Эканоміка ж Фінляндыі пацярпела яшчэ раней, пасля распаду Савецкага Саюза.

Але гэта не ўсё. Ёсць і палітычныя спакусы. На думку асобных гісторыкаў, аб'яднаная пяцёрка мела б мацнейшую пазіцыю ў міжнародных перамовах, бо паасобку кожная краіна можа дамагчыся няшмат. Палітыкам з гэтых скандынаўскіх дзяржаў лягчэй таксама было б заваёўваць ключавыя пазіцыі ва ўстановах Еўрасаюза.

Новая унія вяла б агульную міжнародную і абарончую палітыку. Усе школьнікі, пачынаючы з першага класа, павінны былі б, акрамя роднай, вывучаць яшчэ адну мову паўночных краін. На думку таго ж Ветэрберга, унія магла б нават служыць прыкладам для ЕС. Ці спадабалася вылучаная гісторыкам ідэя жыхарам Даніі і астатніх чатырох дзяржаў Скандынавіі? Апярэджваючы скептыкаў, гісторык мяркуе, што скандынаўскія манархі маглі б кіраваць уніяй па прынцыпе ратацыі. Праўда, большасць каментатараў рэагуюць на ідэю шведскага гісторыка з усмешкай, хоць ёсць і прыхільнікі.

Міжнародныя аналітыкі адзначаюць, што тэндэнцыі да стварэння падобных уній маюць месца і ў іншых рэгіёнах Еўропы. Напрыклад, на поўдні. Як вынікае з аднаго апытання, стварэнне Іберыйскай уніі падтрымлівае 40 % партугальцаў і 30 % іспанцаў.

— Стварэнне федэрацыі з Іспаніяй было б для нас выхадам з ценю, адкрытасцю на Еўропу, на Міжземнае мора, на Францыю, — кажа Джао Герэйра, палітолаг Лісабонскага ўніверсітэта.

На Балканах ёсць людзі, якія сумуюць па ранейшай Югаславіі. Настальгуюць нават славенцы, якія першымі з яе былых рэспублік увайшлі ў ЕС і НАТО і перайшлі на еўра. Аднак, на думку экспертаў, гэта хутчэй настальгія па эканамічна залатых 70-х і 80-х гадах, чым па Югаславіі ў ранейшых межах. Падобныя сантыменты засталіся таксама ў Чэхіі і Славакіі. Большасць чэхаў і славакаў аддавалі перавагу федэрацыі, але палітыкі вырашылі інакш.

Але вернемся да Паўночнай уніі. Вось два меркаванні аўтарытэтных экспертаў:

Стэфан Олафсан, сацыёлаг універсітэта ў Рэйк'явіку.

— Калі б паўночныя дзяржавы больш цесна супрацоўнічалі паміж сабою, іх голас у свеце, напэўна, быў бы лепш чутным і мы ўяўлялі б сабою вялікую сілу. Бо нас аб'ядноўвае падобная культура, грамадства, а таксама мадэль дзяржавы. Магчыма, калі б паўстала Паўночная унія, нам удалося б захаваць паўночную валюту замест еўра. Была б таксама вялікая эканомія ў выдатках на ўтрыманне манархій у асобных краінах. Я за больш цеснае супрацоўніцтва нашых краін, але баюся, што адраджэнне Кальмарскай уніі — справа нерэальная. Усе паўночныя народы вельмі моцна прывязаныя да сваёй незалежнасці. Я, ведаючы ісландцаў, перакананы, што яны сказалі б «не». Таму што для іх найбольш важны суверэнітэт.

Ганс Маўрытц, палітолаг з дацкага інстытута міжнародных даследаванняў.

— Я не веру ў такую унію. Гэта цалкам нерэальная ідэя. Паўночныя краіны занадта шмат што сёння падзяляе, каб утварэнне федэрацыі пяці дзяржаў магло ажыццявіцца. Гэта таксама, як з балтыйскімі дзяржавамі. З далёкай перспектывы падаецца, што яны ўсе такія ж, і ўсё звальваюць у адзін мех. Але ніякі эстонец або літовец не скажа, што ён родам з балтыйскіх дзяржаў. Таксама і з намі. У выпадку паўночных дзяржаў не апраўдалася б ні агульная міжнародная палітыка, ні абаронная, таму што частка з іх належыць да ЕС, а частка — не. Некаторыя, як Данія, блізка звязаны з ЗША, іншыя — не. Я сумняваюся таксама, што Паўночная унія магла стаць эканамічна магутным згуртаваннем. Тут таксама існуе канфлікт інтарэсаў. Досыць зірнуць на рыбалоўства. Не для ўсіх дзяржаў яно з'яўляецца найважнейшай галіной эканомікі. А што з манархіяй? Што сказалі б, напрыклад, шведы, калі б імі стала кіраваць дацкая каралева? Я цалкам сабе гэтага не ўяўляю.

Падрыхтаваў Міхаіл БАЦЯН.

ГУСІ ПА ПРЫПЯЦІ ПАПЛЫВУЦЬ У ЛЮТЫМ?

ПАВОДКА, якую складана яшчэ назваць веснавой, прыйшла ў некаторыя вёскі Жыткавіцкага раёна. На асобных участках басейна ракі Прыпяць узровень вады дасягнуў небяспечна высокай адзнакі. Больш за тое, вада ўжо сёння перавышае максімальныя рубяжы сумна вядомага для Палесся 1999 года. Тады ўзровень вады дасягаў 513 см, зараз ён складае 520 см. Снег яшчэ захоўваецца на палях у дастатковай колькасці, а гэта адзначае, што вада будзе прыбываць, гаворыць прэс-сакратар Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Руслан Габрылёў:

— Тры вёскі: Запясочча, Верасніца і Пераройскі Млынок знаходзяцца ў асабліва небяспечнай сітуацыі. Вакол дамоў, якія пабудаваны непасрэдна ў пойме, падсыпалі пяску, часткова зрабілі дарогу і невялікую дамбу. Вадзе засталося сантыметраў 30, а то і менш, каб пераадолець гэтыя штучныя збудаванні. Вада ідзе з лёдам упарэмешку. Пакуль што яна не падышла да дамоў, а вось да многіх гаспадарчых пабудоў ужо можна дабрацца толькі на плаўсродках. Яшчэ паўметра — і фундаменты дамоў таксама апынуцца ў вадзе. Гэта можа здарыцца, калі вада пераадолее дамбу.

Ля Петрыкава Прыпяць перамыла пад'езды да паромаў, якія вядуць да дзвюх вёсак. Але пакуль паромы не працуюць, гэта не ўяўляе праблемы — да населеных пунктаў можна дабрацца з другога боку, яны ад вялікай зямлі не адрэзаны:

— Калі зрабіць лунку на пойме Прыпяці, фантан вады пачынае біць у вышыню сантыметраў на 15-20, — расказвае Руслан Габрылёў. — Пад лёдам моцны ціск вады, яна і надалей будзе падымаць лёд. Кожны дзень узровень павялічваецца на 2-4 см. У раёне асабліва пільна пачалі сачыць за сітуацыяй з сярэдзіны студзеня. Правялі пасяджэнні адпаведных камісій. Сітуацыю трымае на кантролі раённае звяно дзяржаўнай сістэмы папярэджвання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый на чале з намеснікам старшыні райвыканкама. Усе неабходныя службы гатовыя аказваць дапамогу, якая можа спатрэбіцца мясцовым жыхарам. І цяпер ужо праводзяцца пэўныя работы. Напрыклад, жанчыне, якая з дому не можа дабрацца да сваіх веснічак, падсыпалі некалькі машын пяску. Зараз ідзе кропкавая падсыпка зямлі, каб можна было некаторы час пратрымацца. Абследуюцца старыя дамбы, адсочваецца, ці не зрабілі ў іх свае хады бабры, бо праз іх трапляе вада і дамба хутка бурыцца.

Фота МНС.

Акрамя таго, у вёсках Жыткавіцкага раёна праведзена апытанне насельніцтва наконт таго, хто жадае выехаць за межы свайго населенага пункта на час паводкі. Звычайна ніхто не збіраецца выязджаць з роднай хаты: прывыклі за столькі гадоў. Тым не менш, жывёлу мясцовыя жыхары своечасова перагналі да сяброў і сваякоў, якія жывуць там, дзе звычайна не топіць. Улады тым часам сумеснымі намаганнямі падрыхтавалі дастаткова месцаў для часовага пражывання людзей. Ёсць куды эвакуявацца: клубы, бальніцы і атэлі гатовыя сустрэць магчымых бежанцаў ад вялікай вады. Зроблены неабходныя запасы прадуктаў і будаўнічых матэрыялаў.

— У нас у Тураве ёсць усюдыход «Радыян», — расказвае прэс-сакратар Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Руслан Габрылёў. — Падлічана, колькі плаўсродкаў знаходзіцца ў насельніцтва, на мясцовых прадпрыемствах, у выратавальнікаў. Так што пастаянны кантроль за сітуацыяй вядзецца, тым больш што сіноптыкі асабліва не суцяшаюць: і надалей нас чакаюць плюсавыя тэмпературы. Але ж у спецыялістаў службы МНС ёсць вопыт пераадольвання наступстваў паводкі і ў 1999 годзе на Прыпяці, і ў 2004 годзе — на Сожы ў Гомелі. Зараз ёсць уся неабходная тэхніка. Спыніць вялікую ваду мы не зможам, але мінімізаваць усе наступствы яе прыходу будзем імкнуцца.

Акрамя таго, страхавыя кампаніі атрымалі неабходныя рэкамендацыі, каб актывізаваць работу па дадатковых дагаворах добраахвотнага страхавання маёмасці.

Спецыялісты МНС гавораць, што выпрабаванні могуць чакаць і Петрыкаў. Тут можа скласціся даволі сур'ёзная сітуацыя, бо гарадок знаходзіцца ў своеасаблівай гарлавіне Прыпяці. Рака тут звужаецца з васьмі кіламетраў да двух. Пакуль сітуацыя не крытычная, але ж з улікам развіцця падзей людзям і ў гэтым паўднёвым населеным пункце краіны сёлета можа быць несалодка.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Вяртаючыся да надрукаванага

«АКАЗАННЕ МЕДЫЦЫНСКАЙ ДАПАМОГІ ПАЦЫЕНТАМ У АДДЗЯЛЕННІ ДЗЁННАГА ЗНАХОДЖАННЯ ВЯДЗЕЦЦА Ў АДПАВЕДНАСЦІ З ЗАКАНАДАЎСТВАМ»

У «Звяздзе» яшчэ за 15 снежня мінулага года мы надрукавалі — не столькі пытанне, колькі заклік — ад жыхара аграгарадка Гуды Лідскага раёна Іосіфа Браніслававіча Пілінко: «Для вяскоўца дзённы стацыянар — выйсце. Але давайце вернем для пацыентаў бясплатнае забеспячэнне ўсім неабходным». Ужо з загалоўка вынікае, пра што вялася гаворка. Так, пра карыстанне найперш вяскоўцамі стацыянарамі дзённага знаходжання. Канкрэтна наш заяўнік ім больш чым задаволены. «Таму што вясковец — не гараджанін, проста так у бальніцу ён легчы не можа. Бо і ўласная гаспадарка, жывёла некага «прывязвае» да дому, а састарэлыя папросту баяцца кідаць уласнае жытло на нейкі час без нагляду. Таму атрымліваць лячэнне зручна ў стацыянары: раніцай падправіўся па гаспадарцы, а потым паехаў сабе да медыкаў, атрымаў працэдуры — і дадому».

Безумоўна, разважаў далей Іосіф Браніслававіч, трэба плаціць за паслугі транспарту, а грошай лішніх не бывае. Аднак больш істотнай праблемай ён называў тое, што колькі часу таму пацыентаў у аддзяленнях дзённага знаходжання перасталі забяспечваць бясплатнымі лекамі, больш за тое, яны цяпер павінны самі клапаціцца і пра харчаванне, і пра пасцельную бялізну з ручніком. Чытач не задаваў ніякіх пытанняў, маўляў, зразумела, што так робіцца паўсюдна і ў рамках заканадаўства. Ён прапаноўваў унесці змяненні ў названае заканадаўства — вярнуць усё як было. Казаў, што хацеў данесці сваю думку да ўдзельнікаў Усебеларускага народнага сходу, аднак не змог дазваніцца. Таму і папрасіў, каб «Звязда» атрымала адказ: ці плануюцца якія змены для насельніцтва пры лячэнні ў аддзяленнях дзённага знаходжання? Што мы і паспрабавалі зрабіць, накіраваўшы запыт у Міністэрства аховы здароўя.

Упраўленне арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя разгледзела гэты апублікаваны ў «Звяздзе» зварот і нарэшце адказала лістом наступнага зместу.

«Згодна з пунктам 1.2 пастановы Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь №143 ад 19 верасня 2008 года «Аб арганізацыі дзейнасці аддзялення дзённага знаходжання дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя», аказанне медыцынскай дапамогі пацыентам у аддзяленні дзённага знаходжання (на ложках дзённага знаходжання), а таксама пакрыццё выдаткаў, звязаных з яе аказаннем, вядзецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

У адпаведнасці з часткамі 1 і 2 артыкула 38 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове здароўя» ад 15.07.2010 г. №166-З, лекавае забеспячэнне пацыентаў у амбулаторна-паліклінічных умовах адбываецца за кошт уласных сродкаў пацыентаў, сродкаў юрыдычных асоб і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Згодна з пунктам 70 пастановы Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 23 лютага 2010 года №19 «Аб зацвярджэнні метадычнага дапаможніка па складанні бюджэтнага каштарысу арганізацыі аховы здароўя, што фінансуецца за кошт сродкаў бюджэту», у аддзяленні дзённага знаходжання (на ложку дзённага знаходжання), у амбулаторна-паліклінічных арганізацыях аховы здароўя выкарыстанне вырабаў медыцынскага прызначэння (інфузіённыя растворы, сістэмы для ўнутрывеннай інфузіі, шпрыцы, іголкі і іншыя вырабы медыцынскага прызначэння) забяспечваюцца за кошт сродкаў, прадугледжаных ва ўстаноўленым парадку па бюджэтным каштарысе на ўтрыманне арганізацыі аховы здароўя, іншымі словамі, для пацыентаў — бясплатна.

Адначасова паведамляем, што забеспячэнне лекавымі сродкамі пацыентаў у аддзяленнях дзённага знаходжання, якія маюць права на сацыяльныя льготы па лекавым забеспячэнні, вядуцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь на льготнай і бясплатнай аснове па рэцэптах урачоў амбулаторна-паліклінічных арганізацый аховы здароўя па месцы жыхарства (месцы знаходжання) пацыентаў.

Так, у адпаведнасці з новай рэдакцыяй пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 лістапада 2007 г. №1650 «Аб некаторых пытаннях бясплатнага і льготнага забеспячэння лекавымі сродкамі і перавязачнымі матэрыяламі асобных катэгорый грамадзян» (у рэдакцыі пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 23 кастрычніка 2009 г. №1390), вядзецца бясплатнае забеспячэнне лекавымі сродкамі пацыентаў з устаноўленым дыягназам захворванняў, уключаных у пералік захворванняў, што даюць права грамадзянам на бясплатнае забеспячэнне лекавымі сродкамі, якія выдаюцца па рэцэптах урачоў у межах пераліку асноўных лекавых сродкаў пры амбулаторным лячэнні.

Акрамя таго, на амбулаторным этапе лячэння пацыенты, якім устаноўлены I і II групы інваліднасці, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, маюць права на 90-працэнтную зніжку з кошту лекавых сродкаў, што выдаюцца па рэцэптах урачоў у межах пераліку асноўных лекавых сродкаў, зацверджаным Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Грамадзяне, якія не маюць права на сацыяльныя льготы, набываюць лекавыя сродкі за кошт уласных сродкаў, сродкаў юрыдычных асоб і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Таксама паведамляем, што гэта катэгорыя пацыентаў можа звяртацца па адрасную сацыяльную дапамогу на набыццё лекавых сродкаў, у адпаведнасці з дзейным заканадаўствам, у тэрытарыяльны орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства».

P.S. *Ці застанецца задаволеным гэтым адказам наш чытач — меркаваць загадзя не бяромся. Афіцыйнае рэагаванне — змястоўнае, у тым ліку і наконт прадастаўлення пэўных ільгот асобным катэгорыям грамадзян, якія праходзяць лячэнне ў згаданых аддзяленнях дзённага знаходжання. Даюцца ў лісце з міністэрства і шматлікія спасылкі на заканадаўства. Толькі... Падаецца, галоўнае, пра што прасіў даведацца Іосіф Браніслававіч, — ці плануюцца ў яго ўносіць якія-небудзь змены...*

Сяргей РАСОЛЬКА.

Погляд на праблему

КАНКУРЭНЦЫЯ АЛЬБО АБСУРД?

Глебаапрацоўчыя пасяўныя агрэгаты сёння выпрабляюцца ва ўсіх абласцях краіны. Але ці трэба гэтаму радавацца?

Неўзабаве вясна зноў пакліча ў поле хлебаробаў, а значыць, самы час пацікавіцца справамі вытворцаў сельскагаспадарчай тэхнікі, асабліва для сяўбы. Якія заказы атрыманы ад аграрнікаў? Ці забяспечаны яны сыравінай і камплектуючымі? З гэтымі пытаннямі карэспандэнт «Звязды» накіраваўся ў ААТ «Лідаграпраммаш», дзе вырабляюць не толькі збожжаўборачныя камбайны, але і глебаапрацоўчыя пасяўныя агрэгаты. І вось што высветлілася.

У маі 2007 года была зацверджана разлічаная на два гады праграма падрыхтоўкі вытворчасці глебаапрацоўчых пасяўных агрэгатаў для забеспячэння аграпрамысловага комплексу рэспублікі. Прычым прадугледжвалася, што асноўнымі выканаўцамі гэтай праграмы будуць тры прадпрыемствы — «Лідаграпраммаш», Брэсцкі электрамеханічны завод і Смаргонскі завод аптычнага станкабудавання; кожны — па канкрэтных пазіцыях. Гэта грунтавалася, як кажуць, не на голым месцы. Лідскія і брэсцкія агрэгаты ўжо прайшлі прыёмачныя і сертыфікацыйныя выпрабаванні, на прадпрыемствах былі створаны адпаведныя вытворчыя магутнасці з перспектывай іх павелічэння. У прыватнасці, ААТ «Лідаграпраммаш» рэспубліканскай праграмай ставілася задача давесці магутнасці з 210 да 575 агрэгатаў у год.

Здавалася б, усё прадумана, у тым ліку і што датычыцца «рухавіка прагрэсу» ў эканоміцы — канкурэнцыі. Прычым не толькі паміж айчыннымі вытворцамі, але, разам з тым, і паміж тэхналогіямі, якія імі выкарыстоўваюцца, — у нашым выпадку фірмаў «Lemken» (Германія) і «Kverneland» (Нарвегія). І што ж канкрэтна зроблена?

Даведка. *У 2007—2010 гадах прадпрыемствам «Лідаграпраммаш» для стварэння вытворчых магутнасцяў па выпуску глебаапрацоўчых пасяўных агрэгатаў уведзена абсталяванне на суму 6,8 мільярда рублёў і выраблена спецыяльнай тэхналагічнай аснасткі, за кошт уласных сродкаў, на 1,15 мільярда рублёў. У параўнанні з замежнымі аналагамі фірмы «Lemken» цэны на гэту тэхніку зніжаны на 30—40 працэнтаў. За 2006—2010 гады выпуск агрэгатаў склаў адпаведна 29, 85, 133, 329 і 431.*

Аднак пазалетась празвінеў, так бы мовіць, званок, які прымусіў ААТ «Лідаграпраммаш» сур'ёзна задумацца аб мэтазгоднасці далейшага пашырэння магутнасцяў па вытворчасці гэтых агрэгатаў. Нягледзячы на тое, што лідчане не атрымлівалі ніводнай скаргі на зрыў паставак спажыўцам альбо дрэнную якасць гэтай тэхнікі і маюць усе магчымасці цалкам задаволіць патрэбнасці арганізацый аграпрамысловага комплексу краіны, за аднатыпную прадукцыю, акрамя вызначаных рэспубліканскай праграмай заводаў у Брэсце і Смаргоні, актыўна ўзяліся і ў іншых рэгіёнах Беларусі. Сяродоў іх — Віцебскі і Гомельскі маторарамонтныя заводы, Лошніцкі завод «Аграмаш», Мінойтаўскі рамонтны завод, Магілёўская райаграпрамтэхніка, ААТ «Бабруйскселькмаш», ЗАТ «Славянская тэхналогія», прадпрыемства «Кузлітмаш», ААТ «Казіміроўскі вопытна-эксперыментальны завод», Магілёўскі завод ліфтавога машынабудавання і іншыя.

Такім чынам, хто захацеў — той і вырабляе. І ў выніку на сёння глебаапрацоўчыя пасяўныя агрэгаты выпускаюць ва ўсіх абласцях краіны, нават на прадпрыемствах, дзе вытворчасць сельскагаспадарчых машын не з'яўляецца асноўным відам эканамічнай дзейнасці, і без уключэння ў пералік выканаўцаў спецыяльных урадавых праграм. Прычым, аб якіх-небудзь «ноу-хау» справа не ідзе, а ў цане тэхнікі ўсюды высокая доля імпарту — як правіла, праз вышэйзгаданую нямецкую фірму.

І вось тут узнікае пытанне: няўжо ледзь не ў кожным рэгіёне Германіі альбо Нарвегіі вырабляецца тэхніка, за якую з такім энтузіязмам узяліся літаральна ва ўсіх абласцях нашай краіны? Спецыялісты сцвярджаюць, што ў Заходняй Еўропе так не працуюць. Але чаму ж вырабляем мы? Наколькі гэта выгадна канкрэтным вытворцам і спажыўцам сельскагаспадарчай тэхнікі — дзяржаве ў цэлым? Няўжо гэта і ёсць рынак, канкурэнцыя? Ці, можа, адсутнічае цвярозы сэнс?

Такімі пытаннямі заклапочаны не толькі ў ААТ «Лідаграпраммаш». Гэтая сітуацыя ў лістападзе 2009 года прааналізавана ў дакладной запісцы кіраўніка ўрада. Назва дакумента — «Аб вытворчасці і рэалізацыі зернеачышчальна-сушыльных комплексаў», але ў ім яшчэ гаворыцца і пра глебаапрацоўчыя агрэгаты. Па абедзвюх пазіцыях — аналагічная, крытычная ацэнка выпуску аднатыпнай тэхнікі, прычым з высокай доляй імпартных камплектуючых у кошце сыравіны і матэрыялаў і дзяржзаказам практычна ўсім прадпрыемствам, што «не садзейнічае тэхнічнай надзейнасці вырабаў, іх канкурэнтаздольнасці».

Вось вытрымкі з гэтай дакладной запіскі:

«Практыка вытворчасці аднатыпных вырабаў на некалькіх прадпрыемствах амаль у кожнай вобласці з'яўляецца асновай пратэкцыянізму ўнутры краіны і выключае разумную канкурэнцыю.

Ва ўсіх абласцях арганізаваны выпуск агрэгатаў глебаапрацоўчых (на 17 прадпрыемствах) і глебаапрацоўчых пасяўных (на 8 прадпрыемствах). Акрамя Магілёўскай, усе вобласці самі вырабляюць плугі (на 10 прадпрыемствах). Па такім прынцыпе выпускаецца і іншая сельскагаспадарчая тэхніка.

Такі падыход культывуе ўтрыманства, распыленне сродкаў дзяржаўнай падтрымкі сельскагаспадарчай галіны. Вядома, што пры іншых роўных умовах з-за зніжэння ўмоўна пастаянных затрат на адзінку прадукцыі меншая цана тавару магчымая пры большых аб'ёмах вытворчасці. Паводле ацэнкі вучоных, рост аб'ёмаў вытворчасці на 10 працэнтаў забяспечвае магчымасць зніжэння цаны на 1-2 працэнты.

Такім чынам, размеркаванне дзяржзаказу па некалькіх прадпрыемствах не садзейнічае фарміраванню мінімальнай цаны на сельскагаспадарчую тэхніку. Падтрымліваючы адначасова ўсіх, нельга стварыць перадумовы для развіцця кожнага. Больш за тое, паколькі ўнутраны рынак у сваіх патрэбнасцях абмежаваны, то прадпрыемства павінна імкнуцца да выхаду на знешнія рынкі з канкурэнтаздольным і тэхналагічным вырабам, стварэнне якога пры невялікіх аб'ёмах вытворчасці праблематычна».

Дык хіба ж не лагічна распрацаваць у краіне канцэпцыю сістэмы сельскагаспадарчых машын, сканцэнтраваўшы выпуск тэхнікі пэўнага тыпу на двух-трох прадпрыемствах, а тыя заводы, дзе ёсць свабодныя магутнасці, падключыць да вырабу нейкіх дэталяў і вузлоў для гэтых агрэгатаў, каб скараціць залежнасць ад імпартных камплектуючых, траціць менш валюты? Хіба ж не ў гэтым не толькі дзяржаўны інтарэс, але і выгада для канкрэтных вытворцаў, адны з якіх эфектыўна выкарыстоўваюць створаныя магутнасці для выпуску канечнай прадукцыі, а іншыя працуюць з імі ў кааперацыі?

Дарэчы, у апошніх чыслах студзеня ў ААТ «Лідаграпраммаш», як і на іншых прадпрыемствах, не ведалі, колькі тых жа глебаапрацоўчых пасяўных агрэгатаў сёлета трэба вырабіць. Вынікі конкурсу па закупцы сельгастэхнікі ў 2011 годзе, які праводзіцца рэспубліканскім прадпрыемствам «Белаграсэрвіс», былі яшчэ не аб'яўлены (рэспубліканскі конкурс па мінулагодняй праграме закончыўся 3 сакавіка 2010 года). А сяўба ж, як кажуць, ужо не за гарамі. Але якім жа чынам, не маючы выніку конкурсу, дзяржзаказу, фарміраваць аб'ёмы вытворчасці, забяспечваць яе сыравінай і камплектуючымі? І як у такой сітуацыі не спазніцца да пачатку палявых работ, паколькі, згодна з існуючым заканадаўствам, на правядзенне прадпрыемствам конкурсаў па закупцы таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў патрабуецца да двух месяцаў?

Таму, лічаць у ААТ «Лідаграпраммаш», конкурс па закупцы сельгастэхнікі трэба пачынаць з кастрычніка і заканчваць у лістападзе папярэдняга года, каб прызнаныя пераможцамі прадпрыемствы маглі своечасова арганізаваць закупку матэрыялаў і камплектуючых вырабаў. Пры гэтым у рашэнні камісіі па правядзенні конкурсу павінна быць указана канкрэтная колькасць тэхнікі, а не, напрыклад, «да 200 штук», як робіцца цяпер. Як разумець гэтую лічбу? 10, 50, 100, 150 адзінак? Ды і як прадпрыемству кіравацца такім арыенцірам пры закупцы таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў? Нельга ж указаць «да» ў дагаварах.

Калі фінансавыя сродкі абласным структурам рэспубліканскага аб'яднання «Белаграсэрвіс» для закупак тэхнікі і абсталявання выдзяляюцца канкрэтна, то навошта гэтае «да» пры правядзенні конкурсу? Няўжо нельга дакладна разлічыць патрэбнасць?

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Выказаныя ў гэтым артыкуле меркаванні і прапановы датычацца не толькі ААТ «Лідаграпраммаш», але і іншых прадпрыемстваў краіны. Аўтар не прэтэндуе на ісціну ў апошняй інстанцыі і запрашае выказацца па ўзнятых праблемах усіх, каго яны цікавяць.

~~«ЗЯМЛЯ НЕ ПАВІННА ПУСТАВАЦЬ...»~~

«ЗЯМЛЯ ПАВІННА ДАВАЦЬ ПРЫБЫТАК!»

Некалі многія гаспадары на гарышчы сваёй хаты мелі пра запас скрынку солі ды мех чорных сухароў, якія былі настолькі цвёрдыя, што есці іх можна было, толькі размачыўшы. Тагачасны чалавек не быў упэўнены ў заўтрашнім дні.

У наш час ніхто сухароў не сушыць і соль не назапашвае, бо ў голад людзі не вераць. Аднойчы ў адным аграгарадку давялося зазірнуць на гарышча дома, у якім жыве маладая сям'я. На гарышчы тым «вецер гуляў», а іх дзяды туды цягнулі ўсё, што магло б спатрэбіцца на «ліхую гадзіну». Маладыя пра мінулае і ведаць не хочуць — яны ладзяць жыццё ў адпаведнасці з рэчаіснасцю.

На вёсцы адбыліся такія глыбінныя змяненні, што ўжо вяртання назад, у тую апетую і аплаканую вёску, няма — яна адышла, хоць невялікія астраўкі і засталіся. Стаўка на буйную гаспадарчую вытворчасць апраўдала сябе і нікому ў галаву сёння не прыходзіць (так думаю), што трэба сушыць сухары, бо можа не быць хлеба ў краме.

Буйныя гаспадаркі разам з аграгарадкамі не толькі змянілі вёску знешне, але і зрабілі ўплыў на светапогляд яе жыхароў. Калі сёння многія на вёсцы не трымаюць кароў, то гэта ўжо нікога не здзіўляе. А дваццаць гадоў таму на такога чалавека пазіралі б, як на самага апошняга. Сёння можна малако, смятану... купіць (калі ёсць за што) у краме. А хто раней ішоў у краму па малако? У крайнім выпадку ўзяць можна было ў суседа.

Вёска змянілася, але праблем там менш не стала, і надыходзіць момант, калі іх давядзецца вырашаць. Вось планавалі надаіць малака на 13% больш, а здолелі толькі на тры працэнты. Хацелі свіней выгадаваць на 10% больш, а... Усё гэта дасталася нам у спадчыну з «развітога сацыялізму».

Планаваць і прагназаваць можна, але карова на прагнозы і планы ўвагі не звяртае, для яе важна, што ляжыць у кармушцы.

Усе гэтыя лічбы і працэнты расплываюцца ці сціскаюцца ў залежнасці ад моманту.

— Прыпіскі паўсюдна, усплываюць абуральныя факты. Па 300—500 тон мяса прыпісваюць, — заявіў на пасяджэнні калегіі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Валерый ІВАНОЎ**.

Факты прыпісак назіраюцца і пры малацьбе. Замест таго, каб падымаць ураджайнасць збожжа, некаторыя гаспадаркі пашыраюць пасяўныя плошчы і тым самым павышаюць на некалькі цэнтнераў ураджай.

А для чаго гэта робіцца, вядома. Каб зрабіць справаздачу, паказаць, што ты не горшы за іншых, што працуеш і ёсць вынік... Толькі ці займаўся б прыпіскамі гаспадар на сваёй зямлі? Колькі сабраў збожжа — усё яго.

Дзіўна толькі, што прыпіскі гэтыя цягнуцца з савецкіх часоў, а здавалася б, на вёсцы адбыліся такія перамены. Людзі змяніліся, а вось сістэма эканамічных адносін у сельскай гаспадарцы засталася старой — калгасна-саўгаснай. А яна не была стваральнай.

Мы апынуліся ў зачараваным коле. Ва ўсіх цывілізаваных краінах сельская гаспадарка атрымлівае датацыі. Не пакрыўджаны і наш аграпрамысловы комплекс. У мінулым годзе спісалі даўгі за набытую па лізінгу тэхніку, на 10 гадоў адтэрмінавалі запазычанасць па абавязковых плацяжах у фонд сацыяльнай абароны. Але такі падход расхалоджвае кіраўнікоў. Асабліва крыўдна тым, хто спраўна выплачвае крэдыты, гаспадаркі не маюць запазычанасці.

Адзін старшыня не самага горшага сельгаскааператыва сказаў: «А я плаціць і не збіраюся — усё роўна спішуць». А другі пайшоў яшчэ далей.

— Каб рубель абваліўся, то я за год усе крэдыты выплаціў бы, — падзяліўся сваімі думкамі кіраўнік даволі моцнай гаспадаркі. Гаварыў гэта не грамадзянін, а мужычок, які, дарэчы, ведае справу. Магчыма, з датацыямі павінен быць выбіральны, сістэмны падыход.

Гэта як у сям'і. Дзіця, якое за жыццё трымаецца і стараецца, як у нас кажуць, выбіцца ў людзі, то падтрымка яму дапаможа, а гультай і п'яніца ўсё пусціць па ветры, колькі яму ні давай.

У сельскай гаспадарцы, дзе верагоднасць рызыкі высокая, неабходна ведаць, у што выльецца ўкараненне той ці іншай ідэі. Якая будзе цана перамогі? Ці як у той песні: «Перамога адна на ўсіх, а за цаной не пастаім». На вайне — так, але для эканомікі такі падыход непрымальны. Усё павінна быць падлічана. Колькі пайшло ў плюс, а колькі ў мінус і што атрымалі ў выніку.

У мінулым годзе ў сельгаскааператывы дзяржава ўклала 5 трлн рублёў, а даўгі за гэты перыяд павялічыліся на 6 трлн і складаюць на пачатак 2011 года 26 трыльёнаў.

Як бачым, датацыі абарочваюцца яшчэ большымі даўгамі.

Даводзіцца толькі здзіўляцца моцы нашай эканомікі, бо іншая пад цяжарам заняпалых гаспадарак і стратных прадпрыемстваў даўно рухнула б, а наша стаіць.

Мы ўпусцілі, лічу, самае каштоўнае — час. Калі захаванне, на першым этапе, калгасаў было апраўдана і адыграла станоўчую ролю, то затым з рэарганізацыяй сельскай гаспадаркі мы запазніліся. За гэты час можна было падрыхтаваць вялікую колькасць фермераў, бо аказалася, што фермерам можа быць далёка не кожны. З трох зарэгістраваных фермерскіх гаспадарак выжывае толькі адна. Ды і ў тых жа Нідэрландах чалавек не можа атрымаць у арэнду зямлю, калі ў яго няма спецыяльнай адукацыі. А ў нас фермерам можа стаць кожны, каму ў галаву такая думка прыйшла.

Гаспадар за гады калектывізацыі знік на генетычным узроўні, і адрадзіць яго няпроста. Тут справа нават не ў зямлі. Заняпалых гаспадарак хапае, і калі б тысячы фермераў, каб набыць гаспадарку, стаялі ў чарзе, то стратныя СВК хуценька расфарміраваліся б.

Пры сучасных інтэнсіўных тэхналогіях фермерам можа быць чалавек, які нейкім чынам звязаны з сельскай гаспадаркай: заатэхнік, аграном, механік ці кіраўнік — дзелавы чалавек. Ці многа такіх сярод нашых фермераў?

Калі мы ўзвялі аграгарадкі, то хацелася б, каб яны сталі цэнтрамі буйных гаспадарак. Напрыклад, такіх, як агракамбінат «Сноў» ці ААТ «Птушкафабрыка «Дружба». Дзяржава ўздыхнула б з палёгкай.

Уявім, што ўсе 11 аграгарадкоў Баранавіцкага раёна з'яўляюцца цэнтральнымі сядзібамі буйных гаспадарак, у якіх каровы даюць па 5-8 тысяч літраў малака, а ўраджай збожжа за 40 ц/га. Тады ў раёне была б зусім іншая сітуацыя, а калі з 18 гаспадарак толькі ў трох надаілі ад каровы больш пяці тысяч літраў, то даводзіцца датацыі раскідваць на ўсіх — сродкі распыляюцца. Хоць трэба прызнаць, што за апошнія гады ў раёне рэзка скарацілася колькасць сельгаскааператываў (было болей 30) за кошт далучэння слабых да больш моцных. І асноўны «ўдар» на сябе прынялі птушкафабрыкі і ААТ «Баранавічхлебпрадукт». Сітуацыя палепшылася, але яшчэ засталіся гаспадаркі, якія як бялъмо на воку. Іх за лепшае было б аддаць у прыватныя рукі, каб такія знайшліся. Але што казаць пра Баранавіцкі раён — ён на фоне іншых глядзіцца «малайцом».

У сельскай гаспадарцы, як і ў прамысловасці, стаіць пытанне: «Што рабіць са стратнымі гаспадаркамі? Грошы з бюджэту цягнуць, а аддачы ніякай». Гэтай глабальнай праблемай найперш павінны займацца тыя, хто адказвае за аграпрамысловы комплекс.

Я ж хачу звярнуць увагу на адзін факт. У нас даволі часта даводзіцца чуць: «Зямля не павінна пуставаць!» (голас продкаў?). І здавалася б, у гэтым ёсць здаровы сэнс. Але мы чамусьці забываем, што зямля павінна даваць прыбытак, калі не пустуе. У многіх раёнах ёсць зямля вельмі нізкай бальнасці. І неабходна падлічыць, колькі ў яе ўкладваецца сродкаў і часу і якая ад той зямлі аддача. Можа, за лепшае пусціць яе пад сенажаць, выган ці няхай на тых гектарах расце лес — будучым пакаленням карысць будзе.

Кожны, самы дробны гандляр заканчвае працоўны дзень з падліку — «падбівае бабкі». Вось так і ў сельскай гаспадарцы, як і ў эканоміцы ў цэлым: мы павінны навучыцца лічыць і толькі тады лягчэй стане вырашаць нашы праблемы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

Ранішняе малако

Малаказборшчыкі з вёскі Ніўнікі Міёрскага раёна.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Скарпіёнам варта звярнуць увагу на дзяцей, а Шалі могуць заняцца кар'ерай

ВАЕН. Не губляйцеся ў незвычайнай сітуацыі — знаходлівасць пацягне за сабой рамантычнае знаёмства. А вось калі жыццё задавальняе і вы не жадаеце яго змяняць, можна расслабіцца і не баяцца праслыць недарэкай. Вырашайце праблемы па меры іх узнікнення, не марнуючы лішніх сіл на крытыку і жаль да сябе. У нядзелю толькі актыўны адпачынак дазволіць аднавіць сілы, а ляжанне на канапе ператворыць вас у падабенства да кісялю.

ЦЯЛЕЦ. Пакіньце свае ідэі пры сабе: паведамляць аб іх навакольным (асабліва начальству) яшчэ не час, бо ў вас цяпер арыгінальныя погляды на сітуацыю, якая склалася, і іх абвяшчэнне прывядзе да канфлікту. Аўторак важны цікавымі знаёмствамі, якія дазволяць пашырыць магчымасці. Серада можа прынесці некаторую напружанасць у планы: вам могуць нагадаць аб абяцаннях, якія вы з лёгкасцю далі, не задумваючыся аб адказнасці. Выхадныя могуць закруціць у віхуры неадкладных хатніх спраў.

БЛІЗНЯТЫ. Прытрымлівайцеся вызначанага плана, калі ён у вас ёсць, і складзіце яго, калі гэта яшчэ не было зроблена. На гэтым тыдні добра набірацца ведаў і вопыту, а новыя цікавыя прапановы могуць пакуль пачакаць. Спадзявацца на дапамогу нават самых блізкіх людзей не варта, так што разлічвайце толькі на ўласныя сілы. У адносінах з сябрамі і сваякамі якасныя паказчыкі будуць дамінаваць над колькаснымі. У канцы тыдня вас могуць чакаць прыемныя навіны асабістага характару. Удалым днём будзе нядзеля — калі, вядома, вы не праведзяце яго з раніцы да вечара на працы.

РАК. Калі паспрабуеце надаць свайму абліччу крыху больш элегантнасці, то падсвядома прыцягнеце да сябе нават апанентаў. У пачатку тыдня будзьце больш асцярожнымі — сувымярайце свае сілы і магчымасці. У адваротным выпадку можа апынуцца пад пагрозай ваша бездакорная рэпутацыя. У сераду вы нарэшце зможаце вырашыць некалькі розных спраў адным махам. Толькі вось з ініцыятывай і напорам варта пачакаць. У пятніцу настойлівасць можа прынесці станоўчыя зрухі, і праблемы вырашацца на вашу карысць.

ЛЕЎ. Унутраная і вонкавая гармонія зберажэ ад эмацыйных усплёскаў. У панядзелак непажадана расслабляцца, бо можа раптам высветліцца, што частку спраў нельга адкладваць на потым. У чацвер, перш чым узяцца за буйную справу, правільна ацаніце свой патэнцыял: цяпер лепш недаацаніць, чым пераацаніць. У выхадныя дні паспрабуйце надаць досыць часу для рашэння праблем, якія паўсталі ў блізкіх: магчыма, ім патрэбна тэрміновая дапамога.

ДЗЕВА. Не давайце волі ўласнай недаверлівасці, інакш нічога прадуктыўнага зрабіць не атрымаецца. Складанасці застануцца ў мінулым, спраў стане менш, але сіл, напэўна, усё роўна не хопіць на тое, што запланавана. Калі вы схільныя да рызыкоўных дзеянняў, можаце загадзя падрыхтавацца да паразы. У сераду вас напэўна ўзбадзёрыць нейкая новая і вельмі цікавая інфармацыя. У гэты дзень усё задуманае ажыццявіцца дзякуючы дапамозе сяброў і блізкіх. Выхадныя могуць апынуцца цікавымі, але надзвычай стомнымі.

ШАЛІ. Ёсць магчымасць рэалізаваць шматлікія ідэі і праекты. Задумаўшы штосьці сур'ёзнае, не спяшаецеся дзяліцца інфармацыяй. Пачакайце, пакуль ваша задума, ідэя або план набудзе жыццяздольнасць — толькі тады поспех у рэкламе забяспечаны. Спрыяльны тыдзень для рашэння праблем, звязаных з кар'ерай. Вы можаце завязаць карысныя знаёмствы. Гэта надасць вам адчуванне ўпэўненасці і абароненасці. Хутчэй за ўсё, вы крыху пераацэніце свае магчымасці, таму лепш загадзя адмовіцца ад удзелу ў сур'ёзных мерапрыемствах. Паспрабуйце не капрызіць і не ўступайце ў сваркі з навакольнымі.

СКАРПІЁН. Разлічвайце толькі на свае сілы. Давядзецца з галавой акунуцца ў паўсядзённыя справы. Прыслухайцеся да парад сяброў. Ёсць верагоднасць удалага і выгаднага знаёмства. У вас можа з'явіцца магчымасць зарабіць: напэўна начальства зробіць вам вельмі слушныя прапановы. Паспрабуйце выкарыстаць сітуацыю, якая склалася сабе на карысць. Шмат увагі на гэтым тыдні давядзецца надаць дзецям, асабліва калі яны дасягнулі падлеткавага ўзросту.

СТРАЛЕЦ. Тыдзень найбольш спрыяльны для людзей, якія займаюцца навуковай і вучэбнай дзейнасцю. У пачатку тыдня ўзрастае верагоднасць выканання работ, якія выйдуць за рамкі вашых інтарэсаў і могуць прымусіць ад чагосьці адмовіцца. У аўторак наведванне любых афіцыйных інстанцый можа апынуцца не самай удалай ідэяй. У чацвер, калі вы не хочаце стаць удзельнікам значнага і вельмі гучнага скандалу, трымайцеся далей ад эмацыйна неўраўнаважаных прадстаўнікоў вашага асяроддзя. Другая палова тыдня насычана кантактамі і сустрэчамі з сябрамі і калегамі. Выхадныя дні будуць занятыя, у асноўным, асабістым жыццём. Дарэчы, гэта ўдалы час для пакупак і клопатаў аб уласнай знешнасці.

КАЗЯРОГ. Панядзелак і аўторак — выдатныя дні для выношвання новых планаў і задум і для пачатку іх рэалізацыі. У сераду будзьце больш асцярожнымі, бо можа паступіць ілжывая інфармацыя, якая саб'е вас з толку. Адкладзіце ў суботу ўсе сур'ёзныя справы і займайцеся толькі тымі, якія можна хутка завяршыць. У выхадныя дні больш уважліва пастаўцеся да свайго самаадчування.

ВАДАЛЕЙ. Тыдзень спрыяльны для працы і творчасці. У шматлікіх галінах жыцця наспяваюць важныя змены. Аўторак добры для закладкі падмурка новых вялікіх спраў. У гэты дзень з радасцю будзеце выконваць творчую працу, не праследуючы якія-небудзь карыслівыя мэты. У другой палове тыдня ваш аўтарытэт прыкметна ўзрасце, і ўжо не трэба будзе ўзгадняць кожны крок з кіраўніцтвам — выбар застанецца за вамі. Серада — выдатны дзень для сустрэчы з сябрамі, з якімі вы даўно не бачыліся з-за сваёй загружанасці. У чацвер будзьце ўважлівымі ва ўсім — інакш не пазбегнуць страт. Пятніца можа апынуцца днём падарожжаў і прыгод.

РЫБЫ. Пры некаторых намаганнях з вашага боку творчы ўздым і добры настрой не пакінуць вас увесь тыдзень. На працы магчымыя пазітыўныя змены, прычым не апошнюю ролю адыграе асабістае абаянне. Падзеі будуць ісці сваёй чаргой, не выбіваючыся з графіка. Самы час падзяліцца з калегамі новымі ідэямі — такім чынам вы ўдыхняце новую энергію ў калектыў і начальства гэта ацэніць. Праявіце сумленнасць, і тады ніякія плёткі не змогуць пашкодзіць вам. Не імкніцеся ахапіць усе хатнія праблемы, абмяжуйцеся рашэннем самых неабходных.

У цэнтры Мінска ўпершыню зімуе рэдкая качка-свіцьва

Гэтымі днямі ў парку Горкага сталіцы на ўчастку Свіслачы спецыялістамі была заўважана даволі незвычайная для Беларусі птушка — качка-свіцьва.

Самец свіцьвы сярод самак і самцоў качкі-крыжанкі.

Для нашай краіны яна вельмі рэдкая і на гнездаванні, і на зімоўцы. Часцей яе магчыма ўбачыць у час транзітных міграцый, асабліва ўвесну. Увогуле свіцьва лічыцца зусім не гарадской птушкай, бо біятоп яе — вялікія вадаёмы, якія зарастаюць, са шматлікімі акенцамі адкрытай вады. Асобныя выпадкі гнездавання качкі-свіцьвы фіксаваліся арнітолагамі больш 5 гадоў таму на азёрах паўночнай Віцебшчыны. Менавіта таму гэтая птушка была занесена ў другое выданне Чырвонай кнігі нашай краіны, адзначыў **спецыяліст па экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Руслан ШАЙКІН**.

Па памерах самец гэтай рэдкай птушкі значна драбнейшы, чым распаўсюджаная ў горадзе качка-крыжанка. Галава самца свіцьвы афарбавана ў рыжы колер, ад дзюбы да патыліцы мае шырокую светла-жоўтую паласу. Валлё і частка грудзей з ружовым адценнем, спіна шэрая. У палёце ў самца добра бачныя шырокія белыя палосы на крылах. Самка свіцьвы мае сціплы шэра-карычневы колер.

У суботу і нядзелю ў парку Горкага з 12.00 да 14.00 спецыялісты і валанцёры АПБ будуць паказваць свіцьву і расказваць аб гэтай рэдкай птушцы ўсім добрым людзям. Звычайна свіцьва трымаецца сярод крыжанак і падплывае да наведвальнікаў парка даволі блізка. Таму Руслан Шайкін раіць прыхапіць з сабою фотаапарат.

Сяргей КУРКАЧ.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Арэалам свіцьвы з'яўляецца паўночная частка Еўропы (а таксама Галандыя, Вялікабрытанія, Ірландыя і Ісландыя), паўночная частка Азіі.

ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

НЯДЗЕЛЯ, 6 ЛЮТАГА

Не рэкамендуецца пачынаць новыя справы. Імкніцеся не заставацца без занятку, бо гэта можа прывесці да раздражняльнасці і азлобленасці. Спрыяльны перыяд для занятку руціннымі справамі.

ПАНЯДЗЕЛАК, 7 ЛЮТАГА

Сёння нельга прымаць рэзкіх і незваротных рашэнняў, звязаных з асабістымі адносінамі. Таксама гэта не самы спрыяльны час для таго, каб завязваць новыя рамантычныя сувязі. Новыя думкі, ідэі і планы будуць вельмі каштоўнымі.

АЎТОРАК, 8 ЛЮТАГА

Можаце дзейнічаць адкрыта, праяўляць напорыстасць. Сёння добра будуць атрымлівацца справы персанальнага характару, якія запатрабуюць энергічнасці і актыўнасці. Гэта выдатны час для праявы асабістай ініцыятывы, пачатку індывідуальных спраў і праектаў.

СЕРАДА, 9 ЛЮТАГА

На працягу дня ўзмоцняцца фантазія і ўяўленне, а таму любыя справы, у якіх гэтыя якасці могуць быць карыснымі, будуць паспяховымі. Другая палова дня спрыяльная для здзяйснення пакупак, зносін з людзьмі, для новых знаёмстваў, у тым ліку рамантычнага характару.

ЧАЦВЕР, 10 ЛЮТАГА

Дзень запатрабуе акуратнасці і ўвагі, хоць цярпенне, вытрымка і ўменне лішні раз падумаць перад тым, як зрабіць, сёння будуць у відавочным дэфіцыце. Тым не менш, бытавыя практычныя задачы будуць якраз пад сілу.

ПЯТНІЦА, 11 ЛЮТАГА

Вельмі добры час для навядзення парадку ў самым шырокім сэнсе гэтага слова і лакальнага змагання з хаосам. А вось разлічваць на паспяховае вырашэнне пытанняў, якія патрабуюць уяўлення, хуткасці рэакцыі або ўмення знайсці падыход да чалавека, не варта.

СУБОТА, 12 ЛЮТАГА

Дзень абяцае свежы погляд на старыя праблемы і творчы падыход да іх вырашэння, ды і наогул, добрыя ўмовы для працы галавой. Разам з тым , ён можа падкінуць свежую цікавую ідэю і дапамагчы з пошукам прыгод, якія могуць абрасці канфліктамі або грашовымі стратамі.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ВАРТА ПРЫСЛУХАЦЦА

Зімовыя праблемы

Зіма — гэта не толькі навагоднія святы і канікулы, але і цяжкі час для тых, хто пакутуе ад розных хранічных захворванняў. Пагаршэнне стану многіх «хронікаў» у гэты перыяд медыкі звязваюць з недахопам вітамінаў, халадамі, аслабленнем імунітэту і малярухомым ладам жыцця.

Як сцвярджаюць спецыялісты, зімой рызыка развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў, як і верагоднасць іх абвастрэння, павялічваецца ў два разы. У людзей, якія маюць сардэчныя немачы, менавіта ў халодную пару года павышаецца рызыка інсультаў і інфарктаў. Галоўная прычына — павышэнне артэрыяльнага ціску, якое назіраецца зімой. Абставінамі, якія абцяжарваюць становішча, з'яўляецца яшчэ і тое, што зімой людзі пачынаюць ужываць у ежу вялікую колькасць тлустага і салёнага, а гэта недабратворна адбіваецца на стане крывяноснай сістэмы.

Агульнае пагаршэнне самаадчування ў зімовы перыяд абумоўлена не толькі халодным надвор'ем, але і скарачэннем светлавога дня. Недахоп сонечнага святла парушае механізм выпрацоўкі мелатаніну, а гэта, у сваю чаргу, прыводзіць да паніжэння імунітэту.

ДЛЯ ВАШАЙ КАРЫСЦІ

Панацэя з сокавыціскалкі

Калі вы падхапілі прастуду, абавязкова піце сокі, і пажадана з мякаццю. У такіх соках шмат пекцінаў, якія адсарбіруюць таксічныя рэчывы і садзейнічаюць іх вывядзенню з арганізма.

Ідэальны сок — натуральны! Калі ў вас ёсць сокавыціскалка, то карысныя напоі вы зможаце прыгатаваць без праблем. Якасць напітку залежыць ад стану сыравіны. Агародніна і садавіна павінны быць спелымі. Рэзаць іх неабходна непасрэдна перад прыгатаваннем соку, інакш губляецца значная частка пажыўных рэчываў.

Піце толькі свежыя сокі, якія не апрацоўваюцца тэрмічна, бо пры награванні іх лекавая каштоўнасць рэзка падае. Сырыя сокі дрэнна захоўваюцца, таму іх трэба ўжываць як мага хутчэй — не пазней чым праз 10—15 хвілін пасля прыгатавання. Асаблівая каштоўнасць сокаў у тым, што яны імгненна засвойваюцца — у межах гадзіны працэс ператраўлівання заканчваецца.

Свежыя сокі нельга захоўваць у халадзільніку: яны і там пад уздзеяннем кіслароду хутка раскладаюцца, бо змяшчаюць ферменты і бактэрыі. Сокі трэба піць маленькімі глыткамі, за 30 хвілін да яды. Пры парушэнні гэтага правіла (напрыклад, сок выпіты непасрэдна перад ядой ці пасля яе) узнікае браджэнне ў кішэчніку, і ў выніку абвастраюцца хваравітыя станы. Для атрымання добрых вынікаў неабходна выпіваць да трох шклянак соку на дзень.

ДАПАМОГУЦЬ ВІТАМІНЫ

Каб мабілізаваць свой арганізм, правядзіце яго поўную вітамінізацыю.

Для прафілактыкі ад грыпу і прастуды дастаткова прымаць аскарбінавую кіслату (вітамін С), карацін (правітамін А) і фоліевую кіслату (вітамін B_9) у выглядзе вітамінных дражэ, а таксама тры разы на дзень ужываць стравы з садавіны і агародніны, якія асабліва багатыя на гэтыя карысныя рэчывы.

Цынк — важны мікраэлемент, які таксама актыўна змагаецца з ВРВІ, перашкаджае распаўсюджванню прыкладна 200 відаў прастудных вірусаў. Яго асноўная крыніца — мяса. Неабходна, каб у халодны час года ваша ежа была дастаткова каларыйнай — толькі яна забяспечыць вас энергіяй і сілай для падтрымання цяпла і доўгага самаадчування.

КУХОННЫЯ ДРОБЯЗІ

Даглядаем посуд

Галоўнае — ведаць, з якога матэрыялу выраблены посуд. А як яго даглядаць, падкажуць наступныя парады.

Дарэчы: *на этыкетцы амаль усіх сродкаў для мыцця посуду пазначаны паказчык ПАР (паверхнева-актыўныя рэчывы). Масавая доля ПАР, якая рэкамендуецца, не павінна быць ніжэй, чым 5-7 працэнтаў. Калі на ўпакоўцы ўказана лічба намнога ніжэйшая, то давядзецца расходаваць намнога больш сродку, і пра эканомію прыйдзецца забыць.*

АЛЮМІНІЕВЫ

Яго нельга выкарыстоўваць для прыгатавання капусты, баршчу, кісялю, кіслых кампотаў. Не рэкамендуецца трымаць у такім посудзе і кісламалочныя прадукты. Варыць кашы і кіпяціць малако ў алюмініевых каструлях можна, але для дзіцячага харчавання лепш выкарыстоўваць каструлі з нержавейкі. Не трэба варыць у алюмініевым посудзе неабабраную бульбу: ад гэтага посуд цямнее. Цямнее ён таксама і ад соды. Алюмініевая каструля заблішчыць зноў, калі пракіпяціць ў ёй ваду з яблычнымі скуркамі.

ЭМАЛІРАВАНЫ

Каб новая каструля служыла даўжэй, пракіпяціце ў ёй падсоленую ваду (5 ч. лыжак на 1 л вады). Эмаль баіцца рэзкіх перападаў тэмпературы, таму нельга ў гарачую каструлю наліваць адразу халодную ваду і наадварот. Не спяшайцеся адразу мыць эмаліраваны посуд пасля прыгатавання ежы. Дайце яму астыць. Кашы ў такім посудзе часта прыгараюць. У гэтым выпадку заліце падгарэлы слой салёнай вадой (1:3) і пакіньце на некалькі гадзін, а калі ён размякчыцца, здыміце мяккай анучкай.

ЧЫГУННЫ

Посуд з чыгуну лёгка ржавее, у выніку — псуецца колер і смак ежы, таму захоўваць яго трэба ў сухім месцы. Ежу пакідаць надоўга не варта, а калі і пакінулі, дык толькі пад накрыўкай. Перад тым як выкарыстоўваць чыгунную патэльню, добра памыйце яе, пракаліце з соллю на працягу 1—1,5 гадзіны, затым прамажце алеем. Пасля такой няхітрай працэдуры яна будзе служыць вам практычна вечна. Чысціць чыгунны посуд можна попелам, буйной соллю, затым старанна праціраць мяккай паперай.

З НЕРЖАВЕЙКІ

Гэты посуд лягчэй за ўсё трымаць у чысціні, яго паверхня доўга застаецца гладкай і бліскучай. Чысціцца ён содай ці любым парашком. Устойлівыя плямы адціраюцца лімоннай кіслатой.

КЕРАМІЧНЫ І ШКЛЯНЫ

Апошнім часам керамічны і шкляны посуд карыстаецца вялікай папулярнасцю. Яго можна выкарыстоўваць у звычайнай духоўцы, мікрахвалевай печы, пры жаданні захоўваць ежу ў халадзільніку. Цяпер кераміка і гарачатрывалае шкло з'яўляюцца самымі экалагічнымі матэрыяламі, з якіх вырабляюць посуд. Прыгатаванне ежы ў ім гарантуе адсутнасць пабочны пахаў і смакаў, якія могуць з'явіцца, калі гатаваць у каструлях з металу. Да плюсоў такога посуду можна аднесці і іх прыгожы знешні выгляд, таму стравы падаваць на стол можна прама ў каструльках. Керамічныя і шкляныя каструлі ідэальна прыдатныя для тушэння і запякання мяса, рыбы, агародніны, у іх можна гатаваць і супы.

Да недахопаў каструль як з керамікі, так і са шкла можна аднесці крохкасць матэрыялу і немагчымасць выкарыстоўваць іх на адкрытым агні і электрычных канфорках. Некаторыя гаспадыні паспяхова выкарыстоўваюць такія каструлі на плітах са шклокерамічнай паверхняй, аднак спецыялісты рэкамендуюць гэтага не рабіць.

Што датычыць рэкамендацый па доглядзе, то іх усяго дзве: па-першае, ніколі не мыйце неастылы посуд — ён можа лопнуць; па-другое, старайцеся абыходзіцца з такімі каструлямі вельмі беражліва, пазбягайце ўдараў і выкарыстання абразіўных рэчываў. Пры выкананні гэтых парад, керамічныя і шкляныя каструлі будуць служыць вам вельмі доўга.

ЗНАЧЭННЕ РАДЗІМАК НА ТВАРЫ І НА ЦЕЛЕ

У наш час папулярнасць радзімак не такая вялікая, як у сярэднявеччы. Нават наадварот: з-за верагоднасці пераражэння радзімак у грознае захворванне — меланому — урачы рэкамендуюць выдаляць некаторыя з іх, а за астатнімі ўважліва назіраць. Але ўсё роўна, многія людзі вераць у старадаўняе павер'е, што, чым больш у чалавека радзімак — тым ён шчаслівейшы. Яны спрабуюць прадказаць свой лёс або разгадаць характар людзей, зыходзячы з таго, дзе размешчаны радзімкі.

Значэнне мае і форма, і насычанасць колеру той або іншай радзімкі. Нярэдкія выпадкі, калі некалькі радзімак утвараюць якую-небудзь фігуру. Самай нешчаслівай лічыцца форма крыжа. Таксама не прынясуць дабра радзімкі ў форме квадрата і зоркі. Радзімкі ў форме трохвугольніка, наадварот, прынясуць чалавеку шмат шчасця.

Не заўсёды радзімкі — гэта небяспечна. Яны могуць быць і «разыначкай» асобы, па іх нават можна адгадваць характар чалавека.

1. Кропка знакамітага «трэцяга вока», вока Шывы. Той, у каго яно ёсць, валодае інтуіцыяй, мае вялікі розум і прагу ведаў з ухілам у містыцызм.
2. Гарачы, раўнівы, лёгкараздражняльны чалавек.
3. Паэтычная натура, схільнасць да інтэлектуальных прафесій.
4. Гэтая радзімка — сведчанне глыбокага кахання і шлюбнай вернасці, а таксама пачуццёвасці і шчодрасці.
5. Зменлівы, заблытаны тэмперамент і кароткачасовыя раманы.
6. Ахвота да вандраванняў, фантазія і творчасць.
7. Неабгрунтаваная рэўнасць, перавага эгацэнтрычнасці ў характары.
8. Бязмежная пачуццёвасць. Шлюбнае жыццё багатае перажываннямі.
9. У тым, што датычыцца кахання, схільнасць да неабгрунтаванага пачуцця віны і сварак.
10. Выдатная памяць, дыпламатычнасць, прагматычнасць.
11. Цяга да ўскладнення любоўных адносін і да ўсяго забароненага.
12. Заблытаныя сентыментальныя сувязі, чалавек без астатку аддаецца запалу.
13. Частыя сваркі і хуткія прымірэнні. Цялеснае каханне пераважае над платанічным.
14. Узнёслы і містычны склад розуму, пачуццё ўсеабдымнай любові і абсалютна незвычайны лёс.
15. Незалежнасць, любоў да заданвальненняў і вандраванняў.
16. Жаданне мацярынства (бацькоўства), шчодрасць, пэўнасць.

17. Выдатны спакуснік, схільнасць да шакавальных паводзін і скандальных дзеянняў. Любоў да разнастайнасці, але да шлюбу ставіцца сур'ёзна.
18. Перамога пачуццёвасці над усімі астатнімі якасцямі. Фантазія і арыгінальнасць.
19. Схільнасць да рэўнасці, жаданне адзінага і вялікага кахання.
20. Цяжкі характар, схільнасць да дэпрэсій.
21. Жаданне пераменнасці як у інтэлектуальнай, так і ў любоўнай сферы. І вядома ж, заблытаныя сувязі.
22. Падкрэслены эратызм, сэксуальнасць і нявернасць.
23. Ясны розум, упарадкаванасць. Імкненне да росту як духоўнага, так і матэрыяльнага.
24. Далікатная псіхіка і здароўе, неабароненасць.
25. Жаданне абзавесціся традыцыйнай, трывалай сям'ёй. У зносінах мілы і ўраўнаважаны чалавек. Імкненне да спакойнага жыцця і схільнасць да кансерватыўных поглядаў.

Значэнне радзімак на целе ў жанчын

На грудзях: калі радзімка з правага боку — вы часта кідаецеся з адной крайнасці ў іншую. Ваша жыццё складаецца з узлётаў і падзенняў. Значэнне радзімкі з левага боку паказвае на вялікадушны і трохі легкадумны характар.

На таліі: радзімка надарыць вас мноствам дзяцей. Чым буйней пляма, тым больш іх будзе.

На плячах: вам спадарожнічае поспех. Значэнне радзімкі на левым плячы — фінансавыя цяжкасці.

На кісці: значэнне цёмных радзімак — займальная кар'ера, шчасце, багацце.

На руцэ: у вас ёсць дар, які прынясе поспех і шчасце.

На шчыкалатцы: незалежнасць, працавітасць, энергічнасць.

Значэнне радзімак на целе ў мужчын

На ілбе: радзімка з правага боку — слава і шчасце.

На вушах: у вас не бывае клопатаў.

На шыі: калі радзімка размешчаная ўзбоч — вас чакае нялёгкае жыццё. Шыя адзначана спераду — можаце спадзявацца на галавакружную кар'еру.

На падбародку: вы карыстаецеся павагай у навакольных.

На сківіцы: прыкмета дрэннага стану здароўя або бязладнага жыцця, асабліва калі пляма з левага боку.

На плячах: ваша жыццё поўнае цяжкасцяў, але вы працуеце, як вол.

На рэбрах: радзімкі з правага боку — нерашучасць. Вы часта паводзіце сябе нетактоўна. Значэнне радзімак з левага боку — якасці гэтыя кампенсуюцца пачуццём гумару.

На спіне: вы адкрыты і сумленны чалавек, схільны пабурчаць.

На нагах: нерашучасць.

На ягадзіцах: схільнасць да гультайства і падатлівасці.

На ступнях: калі радзімкі на абедзвюх ступнях, вы любіце падарожнічаць. Калі толькі на правай — вашым марам пабачыць свет не наканавана спраўдзіцца. Калі радзімка на левай ступні, вы дасціпныя і летуценныя.

БЕЛАРУСКІМ ФУТБАЛІСТАМ НЕ РЭКАМЕНДУЮЦЬ БРАЦЬ МАЙКІ З НУМАРАМІ 14, 18, 28, 88

На пасяджэнні выканкама Беларускай федэрацыі футбола прынята неадназначнае рашэнне, якое пакуль не знайшло разумення нават у трэнерскім асяроддзі. Футбалістам не рэкамендавана выкарыстоўваць на майках нумары 14, 18, 28, 88, бо яны быццам бы звязаны з экстрэмісцкай і нацысцкай сімволікай.

Чым выклікана такое рашэнне, здагадацца нескладана. Летась на матчах чэмпіянату Беларусі балельшчыкі неаднаразова вызначаліся нацысцкімі выхадкамі. За банер у падтрымку нацыста Рудольфа Геса было аштрафавана мінскае «Дынама». А на матчы другога круга ў Барысаве супраць БАТЭ фанацкі сектар «Дынама» скандзіраваў ці то «Просім-просім-адзін-чатыры», ці то «Восем-восем-адзін-чатыры». Няма сумненняў, учынкі непрыгожыя. Аднак навошта забараняць гэтыя лічбы ў нумарах на майках футбалістаў, ад гэтага больш зразумелым не становіцца.

— Не думаю, што гульцы абіраюць нумар з нейкімі экстрэмісцкімі разважаннямі. Тыя футбалісты, якія мелі такія нумары ў мінулым сезоне, увогуле пра гэта не задумваліся. Не бачу вялікага сэнсу іх забараняць, — пракаментаваў сітуацыю галоўны трэнер БАТЭ Віктар Ганчарэнка. У барысаўскім клубе пад 14-м нумарам летась выступаў абаронца Арцём Радзькоў.

— Ці забароніце вы Антону Пуцілу выступаць у зборнай пад 14-м нумарам? — спыталі ўчора ў Бернда Штанге.

— Я пра гэта нічога не ведаю. А што гэта за нумары? Мы гуляем у футбол, гэта зусім іншы раздзел. Наколькі я ведаю, лічба 88 забаронена ФІФА. Але ў нас ёсць нумары ад 1 да 50, мы з імі гуляем. Першы раз пра гэта чую. Падобнае рашэнне ў свой час было ў Аргенціне, шмат гадоў існавала забарона на лічбу 10, ніхто не хацеў браць гэты нумар... Я зараз даведаўся пра нешта новае. Калі ёсць такое рашэнне, трэба перапісаць сабе нумары, каб не нарабіць памылак...

Вось так праінфармавалі і крыху шакіравалі мы Бернда Штанге. Акрамя Антона Пуцілы пад 14-м нумарам, у зборнай пад яшчэ адным забароненым, 18-м, выступае Дзмітрый Верхаўцоў. А Сяргей Карніленка ў «Рубіне» меў 88-ы нумар. Яшчэ не даючы пра забарону, у інтэрв'ю парталу Gazetaby.com нападаючы выказаў жаданне атрымаць такі нумар і ў «Блэкпуле»...

НА КУБКУ ФЕДЭРАЦЫІ НАШЫ ТЭНІСІСТКІ АБЫГРАЛІ АЎСТРЫЕК І ХАРВАТАК

Наша жаночая зборная па тэнісе ў чарговы раз імкнецца выбрацца з 1-й групы Еўра-Афрыканскай зоны, каб трапіць у плэй-оф другой Сусветнай групы. Адбываецца гэта на Кубку федэрацый, які з 2 па 5 лютага праходзіць у Эйлаце (Ізраіль). І пакуль усё для Вікторыі Азаранкі (9-я ракетка свету), Вольгі Гаварцовай (73-я), Дар'і Куставай (161-я) і Таццяны Пучак (414-я) складваецца надзвычай удала. Пазаўчора наша каманда з лікам 3:0 выйграла першы матч у зборнай Аўстрыі. Спачатку Вольга Гаварцова перайграла Патрыцыю Майр-Ахляйтнер (98) — 6:2, 6:1. Потым Вікторыя Азаранка ўзяла верх над Зюбіле Бамер (79) — 6:4, 6:1. Парная сустрэча не стала вялікай перашкодай для Таццяны Пучак і Дар'і Куставай — яны перамаглі Сандру Клеменшыц (108) і Патрыцыю Майр-Ахляйтнер (564).

Учора нашы тэнісісткі выйгралі матч і супраць зборнай Харватыі. І зноў 3:0. Вольга Гаварцова перамагла Ані Міячыку (383) — 6:2, 6:2, а затым Вікторыя Азаранка справілася з Аленай Панджыч (265) — 6:3, 6:1. Наш парны дуэт таксама перамог Сільвію Ныірыч (587) і Айлу Тамлянавіч (770) — 6:2, 6:4. Сёння нашы тэнісісткі сустрэнуцца з камандай Грэцыі. Менавіта пераможца групы і будзе змагацца за выхад у плэй-оф 2-й Сусветнай групы. Будзем спадзявацца, што ў дзяўчат атрымаецца. Тым больш што кіруе імі вядомы беларускі спецыяліст, віцэ-старшыня НАК Сяргей Цяцерын, які ў свой час з камандай Максіма Мірнага і Уладзіміра Валчкова перамагаў саміх расіян і аргенцінцаў.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

А лепшаму аўтару — 1000 долараў!

У Беларусі фінішуе міжнародная прэмія ў галіне вэб-журналістыкі «Yousmi Media Awards-2010»

12 лютага заканчваецца падача журналісцкіх прац на атрыманне прэміі «Yousmi Media Awards-2010». Першая прэмія ў галіне вэб-журналістыкі, заснаваная кампаніяй «Сучасныя Медыя Сістэмы» сумесна з Інстытутам журналістыкі БДУ, праводзіцца ўжо другі раз, сёлета яна падсумуе вынікі за 2010 год.

На сёння на сайце прэміі (www.yma.by) ужо зарэгістравана больш за 600 работ ад 200 аўтараў з Беларусі і краін СНД.

Вынікі будуць падведзены ў 11 намінацыях, пераможцы атрымаюць адмысловыя статуэткі прэміі і каштоўныя прызы. Сярод намінацый: «Лепшы журналіст», «Лепшы фатограф», «Лепшае відэа», «Блогер года», «Персона года», «Лепшы інтэрнэт-сайт СМІ і інтэрнэт-выданняў» і інш.

Галоўны прыз — 1000 долараў ЗША — дастанецца лепшаму аўтару, якога назаве прафесійнае журы. Пераможца будзе выбраны з ліку ўсіх удзельнікаў, якія прадставілі на прэмію хоць бы адну работу. Адна з галоўных умоў — усе працы павінны быць датаваны 2010-м годам.

БЛОГЕРЫ, ФАТОГРАФЫ, ЖУРНАЛІСТЫ

— На сёння мы атрымалі ўжо больш за 600 прац — тэксты, фотаздымкі, відэафайлы, — гаворыць **ідэйны натхняльнік і стваральнік прэміі, дырэктар кампаніі «Сучасныя Медыя Сістэмы» Дзяніс МІСЮЛЯ**. — У гэтым годзе ўсяго дзве прафесійныя намінацыі: «Лепшы журналіст-прафесіянал» і «Лепшы фатограф-прафесіянал». Астатнія намінацыі для аматараў. Удзельнічаць у прэміі могуць усе ахвотныя. Летась у прэміі прыняло ўдзел больш за 400 аўтараў. Але тых, хто сапраўды займаўся журналістыкай, было каля 130. Астатнія, у асноўным, дасылалі апавяданні. У гэтым годзе мы адмянілі такую намінацыю, і наша прэмія стала больш адаптаваная да журналістыкі.

Упершыню вылучана такая намінацыя, як «Лепшае відэа». У межах гэтай намінацыі пройдзе яшчэ адна — «Лепшы беларускі блогер». Упершыню мы назавём чалавека, які насамрэч цікавы шырокаму колу чытачоў у інтэрнэце.

Сярод журы — медыйныя асобы і прадстаўнікі вядучых СМІ Беларусі і замежжа, у тым ліку РІА «Навіны», агенцтваў «Associated Press», «France Press» і «Reuters». Старшыня журы — радыёвядучы «Рускай службы «Бі-бі-сі» Усевалад Леванштэйн (Сева Наўгародцаў).

Ілья ЛАПАТО.

ПРЫЧЭП або КЮВЕТ?

На 165-м кіламетры аўтатрасы Полацк—Глыбокае—мяжа з Літвой фура «склалася ў нажніцы». Ёсць пацярпелы.

ДТЗ адбылося раніцай каля 10 гадзін у раёне вёскі Канстанцінава. З боку Полацка рухаўся грузавы аўтамабіль «Вольва» з прычэпам. Ім кіраваў 39-гадовы вадзіцель. Прычэп стала насіць з боку ў бок. І ў выніку — выкінула на сустрэчную паласу. У гэты час па ёй з боку Літвы ехаў легкавы аўтамабіль «Сітраэн», у якім знаходзіліся вадзіцель (жыхар горада Паставы, 1972 года нараджэння) і пасажыр. Адбылося сутыкненне. У выніку пацярпеў пасажыр легкавога аўто: асколкі разбітага шкла трапілі яму ў вочы.

Аляксандр СЯНЮЦЬ.

Сёння, паважаныя мае гаспадыні, будзем гатаваць вінегрэт. Вінегрэт з тых рэцэптаў, якія былі мною старанна адабраныя і прадэгуставаныя для выняцення на ваш строгі суд, але не змясціліся ў мінулых выпусках.

ЗАПЯКАНКА БУЛЬБЯНАЯ З КАЛЬМАРАМІ

Нам спатрэбіцца: *400—500 г кальмараў, 6—8 бульбін, 2—3 цыбуліны, 3—4 сталовыя лыжкі алею, соль, перац — на смак, 2—3 сталовыя лыжкі паніровачных сухароў, 2—3 чайныя лыжкі сметанковага масла.*

Замарожанае мяса кальмара ачысціць ад плёнкі (для гэтага абдаць кіпенем літаральна на некалькі секунд). Варыце кальмара ў падсоленай вадзе (на 1 кілаграм кальмараў бяруць 2 літры вады і 15 грамаў солі) пры слабым кіпенні 40 секунд. Варыць кальмары астудзіце, пасля нарэжце на кавалкі, прапусціце праз мясарубку і абсмажце на масле разам з дробна нарэзанай рэпчатай цыбуляй, пасля чаго дадайце соль, перац на смак і ўсё перамяшайце. Бульбу адварыце і ў гарачым выглядзе старанна разамніце, дадайце масла і перамяшайце. Атрыманае пюрэ падзяліце на дзве часткі. Адну частку палажыце ў змазаную маслам і пасыпаную сухарамі патэльню. Разраўняйце пюрэ і палажыце на яго падрыхтаваны фарш з кальмараў, а зверху частку пюрэ, якая засталася. Пасыпце ўсё сухарамі, спырсніце маслам і запякайце ў духавой шафе да ўтварэння румянай скарыначкі. Пры падачы на стол запяканку можна паліць растопленым сметанковым маслам.

ГАРБУЗ, ЗАПЕЧАНЫ З ЯЙКАМ

Вазьміце: *600—700 г гарбуза, 4 яйкі, 50 г сметанковага масла, соль — на смак.*

Гарбуз ачысціць, нарэзаць дробнымі кубікамі і падсмажыць, пасыпаўшы соллю. Заліць яйкамі і запячы ў духоўцы.

СЁМГА З ГАРЧЫЦАЙ І МЁДАМ

Вам спатрэбіцца: *4 кавалкі сёмгі (па адным на порцыю); для марынаду: гарчыца зярністая — 2 часткі, мёд — 1 частка; цэдра і сок лімона — на смак.*

Для марынаду змяшаць мёд з гарчыцай, дадаць сок лімона і цэдру. Перамяшаць, каб атрымалася аднародная маса. Кожны кавалачак сёмгі з дапамогай пэндзліка намазаць атрыманай мядова-гарчычнай сумессю і пакінуць марынавацца не менш чым на 30 хвілін, накрыўшы талеркай. Лісты фольгі (лепш двайныя) змазаць раслінным алеем, пакласці на іх сёмгу і пасыпаць соллю, завярнуць краі фольгі як канверт. Нагрэць духоўку да 190° С, пакласці канверты з сёмгай на рашотку і запякаць да гатоўнасці (прыкладна 20 хвілін). Гатовую рыбу перакласці на ліст салаты і падаць гарачай з долькай лімона.

Ядомы анекдот

— Мужчыны — як кацяняты.

— Такія ж дурныя і бездапаможныя?

— Не, ядуць больш, чым важаць.

* * *

Маркетынгавая мудрасць.

Чыпсы — гэта ўменне прадаць адну бульбіну па цане кілаграма.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

«ЗАЛАТАЯ ШАШКА»

Турнір пад такой назвай упершыню быў праведзены 30 гадоў таму па ініцыятыве савецкай піянерскай арганізацыі. Сёлета традыцыю падтрымалі эстонцы, і турнір ладзіўся ў іх сталіцы Таліне. На старт выйшлі 19 дзіцяча-юнацкіх каманд. Перамогу святкавала шашачная дружына Вільнюса. Мінская СДЮШАР-11 заняла пятае месца.

ЭКЗАМЕНУЮЦЬ КАРЫФЕІ

Гросмайстар СССР Леанід Вітошкін (Гомель) працягвае свой аўтарскі конкурс-13 заданнямі 11 і 12 па шашках-64, а міжнародны майстар Віктар Шульга (Мінск) — чатырнаццаты заданнямі 5 і 6 па 100-клетках:



№ 13/11. **Белыя**: a1, b6, c7, d6, e5, f6, g1 (7). **Чорныя**: a5, b2, c3, d8, e3, f8, h4(7).

№ 13/12. **Белыя**: a7, b2, e3, e7, g5, h4, h6 (7). **Чорныя**: b4, c5, c7, d6, d8, e5, f8, h2 (8).



№ 14/5. **Белыя**: 9, 10, 14, 20, 29, 38 (6). **Чорныя**: 16, 18, 25, 26, 27, 30, 39 (7). Сааўтар Іван Івацка (Вінніца).

№ 14/6. **Белыя**: 11, 13, 17, 30, 40, 43 (6). **Чорныя**: 2, 8, 14, 29, 31, 32, 38 (7).

Ва ўсіх іх ход і перавага на баку белых.

Пераможцы стануць першакласнымі рашальнікамі, іх чакаюць сюрпрызы ад аўтараў, а развязаўшыя ўсе заданні выканаюць альбо пацвердзяць норму другога спартыўнага разраду па шашках.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

Аўтарскія: 11/14 (У. Матус) — 18, 7, 42, 7, 41, 1, 14, 41, 24, 14x і **12/24** (П. Шклудаў) — g7 (ab2A) d4, a1x. A(b6) a1 (bc5) a5 (d4) d8 (b2) c3x.

Бліцы:58/3-1 (У. Бандарык — А. Пярхальскі) — 1. ... fg5 2.h:f4 ed6 3. b:e5 a:g7x, **58/3-2** (А. Пярхальскі — М. Гофман) — 1. hg7 f:h8 2. ef4x і **59/1** (М. Крышталь) — 22, 13, 14, 2, 47, 33x.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



АДКАЗЫ НА СКАНВОРД

Па гарызанталі: Планёр. Гарасон. Яхідна. Лявал. Васса. Аід. Сноп. Ліс. Рыза. Рахунак. Уцу. Арган. Кавк. Знак. Ані. Адрэса. Кліп. Дах. Дар. Гонар. Выкуп. Дан. Шпік. Страла. Бярн. Опус. Лато. Вусень. Ан. самбль. **Па вертыкалі:** Дзікабраз. Кубамётр. Вахта. Чарадзей. Кантон. Аўт. Дзюк. Кліп. Лэска. Карольк. Кліка. Ага. Вожык. Мінута. Пенда. Ясон. Шатун. Гус. Ядро. Друк. Апладна. Азія. Гарэт. Крах. Надфіль.

Усміхнемся!

Ад пацалунка да скандалу — адзін крок, ад скандалу да пацалунка — цэлы тыдзень, а то і новыя туфлі...))

☺

Жонка і муж.

— Сёма, я вось прачытала кніжку па псіхалогіі і думаю, што ў цябе прымітыўныя інстынктыўныя жаданні плюс эмоцыі і ўспаміны, якія паграбаюць свядомасці, былі часткова прыглушаны ці выцеснены ў вобласць несвядомага.

— Лепш бы ты, Люся, паесці чаго-небудзь прыгатавала...

☺

Усё сказанае пасля пятага куфля — гэта ўцечка інфармацыі.

☺

— Вой, да чаго сумна рабіць рамонт...

— Але яшчэ больш сумна, калі яго робяць суседзі...

5 лютага

Дзве даты

1325 год — пачата будаўніцтва Лідскага замка (некаторыя гісторыкі звязваюць з гэтым і заснаванне горада Ліды). У летапісных крыніцах Ліда фігуруе ў «Спісе рускіх гарадоў ...», складзеным паміж 1387 і 1406 гадамі. Яна была галоўным горадам Лідскага княства, якім валодаў князь Альгерд, а затым яго сын Ягайла. У 1387 годзе Ягайла, стаўшы польскім каралём, выдаў указ, які забараняў ў ВКЛ паганства і абавязваў усіх яго жыхароў прыняць каталіцтва. У 1590 годзе горад атрымаў герб: поле шчыта падзелена на дзве часткі; правая — чырвонага колеру з залатым ільвом, павернутым направа, левая — блакітная з двума залатымі скрыжаванымі ключамі.

1752 год — расійская імператрыца Лізавета Пятроўна зацвердзіла правабаковы рух на дарогах. Ужо ў старажытныя часы людзі заключалі паміж сабой пагадненне: па якім баку дарогі ездзіць іх транспарту — фурманкам, вазам, каляскам. Такія пагадненні дапамагалі вырашыць праблему затораў і сутыкненняў на дарозе. Хоць гісторыкі і не могуць з упэўненасцю сказаць, па якім менавіта баку дарогі ездзілі, напрыклад, у Старажытнай Грэцыі ці Асірыі. Затое ёсць доказы, што жыхары Рыма прытрымліваліся левабаковага руху. На некаторых рымскіх дэнарыях (срэбных манетах), якія адносяцца да перыяду 50 года да нашай эры — 50-га нашай, адлюстраваліся двух коннікаў, што раз'язджаюцца менавіта па левым баку.

Цытата дня:

«Каб жыццё не здавалася невыносным, трэба прывучыць сябе да двух рэчаў: да ран, якія наносіць час, і да несправядлівасцяў, якія чыняць людзі».

Себасцьян дэ Шамфор (1741—1794), французскі пісьменнік.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.50	16.58	9.08
Віцебск —	7.44	16.43	8.59
Магілёў —	7.40	16.48	9.08
Гомель —	7.32	16.49	9.17
Гродна —	8.04	17.14	9.10
Брэст —	8.00	17.20	9.20

Месяц

Маладзік 3 лютага.
Месяц у сузор'і Рыбаў.

Імяніны

Пр. *Еўдакіі, Кацярыны, Генадзя.*

К. *Агаты, Адэлаіды, Ізыдара.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



ДВАРАВЫЯ ПАБУДОВЫ. ВАРОТЫ

Вароты — частка агароджы падворка, праз якую выязджалі з двара і вярталіся назад. Сімволіка варотаў у традыцыйнай культуры ўсходніх славян вельмі блізкая да ўяўленняў аб ролі дзвярэй у хаце і іншых гаспадарчых пабудовах. Яны сімвалізавалі сакральную мяжу паміж «сваім» і «чужым» светам. Вароты сталі тым рытуальным каналам сувязі, праз які наладжваліся паўсядзённа-побытавыя і спецыфічна-абрадавыя сувязі са знешнім светам. Яны служылі надзейным абярэгам ад знешняга негатыўнага ўздзеяння на дамачадцаў і гаспадарку.

● У паўсядзённым жыцці вароты трымалі зачыненымі. І толькі ў выключных выпадках іх, наадварот, на пэўны час адчынялі: калі ў хату прыходзіла бяда, звязаная са смерцю чалавека.

● Вароты сталі своеасаблівым рытуальным месцам як для гаспадароў падворка, так і для аднавяскоўцаў. На варотах мацавалі абразы, свечкі. Калі праходзілі міма, то абавязкова хрысціліся. Напрыклад, у дзень першага выгану хатняй жывёлы на пашу (а гэта, як правіла, адбывалася на Юр'я) да варот мацавалі ікону святога Георгія Перамаганосца, якая знаходзілася там на працягу ўсяго святочнага дня — да таго часу, пакуль жывёла не вернецца дадому вечарам.

● На варотах, гэтаксама як і на дзвярах, на Вадохрышча малявалі крыжы, на Купалле да іх мацавалі вянкі, у якасці абярэгаў уторквалі нож, серп або іншыя вострыя прадметы.

● Асаблівую ўвагу варотам надавалі на Тройцу. Да слупоў мацавалі галінкі бярозы, а самі вароты ўпрыгожвалі кветкамі і рознакаляровымі стужкамі.

● Упрыгожвалі вароты і ў час вяселля. На каньку мацавалі «вясельнае дрэўца» або некалькі невялічкіх елачак, кветкі, стужкі, вянкі і гірлянды з кветак і галінак хваёвых дрэў.

● Знакам грамадскага асуджэння і пакарання дзяўчыны, якая саграшыла (мела пазашлюбныя адносіны), было вымазванне варот дзёгцем.

● Падчас некаторых рытуальных дзеянняў трэба было пагрукаць у вароты, нарабіць шуму-грому. Лічылася, чым больш будзе шуму, тым хутчэй збудзецца задуманае. Так, на Каляды моцна грукалі ў вароты, запрашаючы Мароз пакаштаваць куцю — галоўную рытуальную страву. У засушлівыя дні аб вароты разбівалі гліняныя гаршкі.

● Пры зачыненых варотах адбываўся вясельны гандаль паміж дружынай жаніха і нявесты — «выкуп нявесты».

● Вароты адчынялі падчас цяжкіх родаў, а таксама калі цяжка паміраў хто-небудзь з дамачадцаў. Аналагічныя дзеянні выконваліся і ў царкве. Каб дапамагчы душы (у выпадку смерці) прадстаць перад Творцам, у храме адчынялі «царскія вароты».

● У варотах распальвалі «ачышчальнае» вогнішча ў Чысты чацвер, на Вялікдзень, у Юр'еў дзень. Распальвалі агонь і ў дзень вяселля, каб вясельны поезд пераехаў праз полымя і спаліў усё нядобрае, што магло прыстаць да яго па дарозе.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ:
тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by.

Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33 380. Індэкс 63850.
Зак. № 585. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12